ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА
ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ
12 МАЯ 1995 г. № 19 (3791) Кошт 400 руб.

СОН ПЕРАД РЭФЕРЭНДУМАМ

**Вось і ўсё.
Засталося
Апошнюю кропку паставіць.
І Айчыны грудок
Замяце назаўсёды зіма.
Вось і ўсё.
Мой народ
На апошняй сваёй пераправе:
Памірае народ,
Калі мовы ў народа няма...**

**Як даўно не чуваць
На Радзіме пяшчотнага слова,
Як даўно мой народ
Анямелы
Зацята маўчыць...
Вось і ўсё.
Больш няма
Ні народа,
Ні роднага слова...
І злятаюцца ўжо
Нашы вочы кляваць
Крумкачы...**

**Вось і ўсё.
Апускаюцца рукі
У роспачнай скрусе,
І нікога вакол.
Ды і я на зямлі не прарок...
Вось і ўсё.
І няма больш маёй,
І няма Беларусі...
Замятае зіма
Назаўсёды
Айчыны грудок...**

Міхась БАШЛАКОЎ

РОЗДУМ У МУЗЕІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Божа, няўжо гэта мы ўстаём з няволі,
З руінаў, якіх не бачыў спакутваны свет.
Ці гэта на нашым, а не суседскім полі
Зара свабоды ціха пазначыла след?
Ці зможам узняцца насустрач
госці жаданай?
Занадта цяжкія нашых душаў і цел ланцугі.
У сэрцах нашых, няволяю, страхам,
маной катаваных,
Ці адзавуцца прызыўныя,
зычныя волі званы?
Трэба ўстаць, бо інакш — няволі прадонне,
Мусім устаць, бо інакш — навякі немата.
Хай жа горда ўзаўецца над намі знак годнасці
й волі — "Пагоня",
Бо ці ж дарма прарочыў паэт, што яе
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць?!**

А. ЛЕСАЎЧУК



Штат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім змёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!

Францішак БАГУШЭВІЧ

ЛІМ КОЛА ДЗЁН

Паслязаўтра — рэферэндум. Народ будзе вырашаць лёс таго, што яму належыць, незалежна ад таго, хоча ён гэта ці не хоча, прымае ці не прымае. Лёс таго, што як маці, як Радзіма, даецца нам ад нараджэння: лёс мовы і гістарычных сімвалаў. І, зноў жа, незалежна ад таго, як прагаласуе паслязаўтра гэты манкуртызаваны, пазбаўлены гістарычнай памяці, нацыянальнай самасвядомасці і нават свайго "я" народ, мова і сімвалы застануцца такімі ж ягонымі, як і былі. Нікуды беларусам не падзецца ад сваёй мовы, бо яна ў іх адна. Як маці ў дзіцяці. І якой бы добрай ні здавалася мачыха, яна ўсё ж мачыха, а не маці, і гэтым усё сказана. Тым больш у нашым выпадку: родная маці ад сваіх дзетак не адмаўляецца ніколі, якімі б няўдзячнымі яны ні былі, наадварот, увесь час у яе хочуць адабраць дзетак то заходняя мачыха, то ўсходняя... І гэтая, чарговая спроба, урэшце, закончыцца нічым. Але шкада часу, шкада страчаных тэмпаў беларусізацыі, якія давядзецца аднаўляць. І сорамна, сорамна перад нашчадкамі, перад усім цывілізаваным светам, сорамна за тое, што адбываецца зараз на Беларусі.

АДЧАЙ ТЫДНЯ

"Не ведаем, шаноўны прэзідэнт, на якой мове спявалі вам самому калыханкі, якія калыханкі слухалі вашыя дзеці! Нашыя, на жаль, ці ўсё ж на шчасце, з маленства чуюць пераважна мову беларускую, натуральна сугучную нашай прыродзе... Мы хочам, каб нашыя дзеці выраслі культурнымі людзьмі... Мы перакананыя, што культура гаспадарання зыходзіць ад культуры мыслення. А культура мыслення немагчымая без культуры маўлення... Мы нідзе ніколі не чулі, каб нехта ў нас абразіў чалавека, які гаворыць ці спрабуе гаварыць па-руску. А вось за беларускую гаворку "трасянкамоўныя" кіраўнікі абражалі нашых дзядоў і бацькоў, абражаюць нас. Мы не хочам, каб абражалі яшчэ і нашых дзяцей... Мы не заклікаем нікога да непадпарадкавання, не пагражаем грамадзянскаю вайною і страйкамі, але мы адстойвалі і будзем адстойваць нашае права на родную мову, культуру, гісторыю, сімвалы... Праводзьце свой рэферэндум, пан прэзідэнт, аднак ведайце, што ёсць на Беларусі беларусы, якія хочуць выхоўваць дзяцей на беларускай мове. Паколькі мы ёсць і гэтая зямля пакуль яшчэ нашая, вы павінны лічыцца з намі!.. Мы не гультаі, мы хочам жыць, працаваць, гадаваць дзяцей пад гербам "Пагоня" і бел-чырвона-белым сцягам, бо гэтыя гістарычныя сімвалы — знак нашае незалежнасці, пад імі нарадзіліся, пачалі хадзіць, гаварыць, вучыцца нашыя дзеці... Мы хочам, каб нашыя дзеці маглі выхоўвацца ў беларускім садку, вучыцца ў беларускай школе і беларускім універсітэце, каб мы маглі чытаць беларускія газеты, слухаць беларускае радыё, хадзіць у беларускі магазін і, калі будзе трэба, беларускую паліклініку..."

(Са звароту маладых сем'яў да прэзідэнта Беларусі).

СЕНСАЦЫЯ ТЫДНЯ

Тэлебачанне і газеты паведамілі, што на стале ў прэзідэнта краіны ляжыць указ аб вызваленні В. Ціхіні ад займаемай пасады старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь за тое, што ён быццам бы займаецца палітычнай дзейнасцю. Мы ніколі не з'яўляліся прыхільнікамі В. Ціхіні і ніколі не верылі ў ягоную аб'ектыўнасць, але — закон ёсць закон. А тое, што мяркуе (калі верыць СМІ) зрабіць прэзідэнт, — ёсць прамое парушэнне (каторы раз!) Канстытуцыі краіны. Апошнім часам чуткі пра магчымыя адстаўкі, што выходзілі з прэзідэнцкай адміністрацыі, не спраўджваліся: працуюць на сваіх месцах і Багданкевіч, і Шаладонаў, і Чыгір. Падабенства метадаў наводзіць на думку: мэта за ўсім гэтым адна: прыструніць, прыпалохаць, зрабіць паслухмяным... І толькі.

АДКРЫЦЦЁ ТЫДНЯ

Былы Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, а цяпер пасол Беларусі ў Польшчы Георгій Таразевіч даў інтэрв'ю карэспандэнту "Народнай газеты" наконт блізкага рэферэндуму. Выказаўся Георгій Станіслававіч досыць радыкальна — аргументавана і абгрунтавана за дзяржаўнасць толькі беларускай мовы, за захаванне гістарычнай сімволікі, падкрэсліў абсурднасць пытання аб інтэграцыі з Расіяй і спробу ўзурпацыі ўлады адной з яе галінаў у апошнім пункце рэферэндуму. Дагэтуль мы неяк шкадавалі, што на Беларусі, у адрозненне ад іншых рэспублік былога СССР, у свой час не прыйшлі да ўлады нацыянал-камуністы (Бразаўскас, Шэварднадзе, Краўчук, Назарбаеў і інш.) і лічылі, што ў нас іх проста не было. Аказваецца, былі і ёсць (і не толькі Таразевіч), але іх неабальшавікі і неакамуністы своечасова "сплавілі"...

ПРЫЗНАННЕ ТЫДНЯ

"Я і Аляксандр Лукашэнка ніколі не былі палітычнымі антыподамі", — заявіў карэспандэнту "Інтэрфакса" былы прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч. І яшчэ: "Я заўсёды быў і буду гатовы дапамагаць маладому беларускаму прэзідэнту, адкінуўшы ўсякія ўласныя амбіцыі". "Шутки в сторону, господа присяжные заседатели, командовать парадом буду я", — казаў некалі вялікі камбінатар. Што ж, разыграны спектакль падыходзіць, пэўна, да свайго лагічнага завяршэння. Пачакаем...

ШАБАШ ТЫДНЯ

Дзеля "правільнага і аб'ектыўнага", а таксама "паспяховага" выканання праграмы асвятлення перадвыбарчай кампаніі і дыскусій напярэдадні рэферэндуму на Беларускім тэлебачанні паводле каманды "зверху" ўтворана "пастаянная каманда выступаючых". У склад яе ўвайшлі: У. Гасцюхін, В. Акулаў, І. Гукоўскі, А. Кузьміч, Г. Марчук, В. Тураў, Ю. Дудзінаў, М. Сяргееў... Нават павярхоўнае знаёмства са спісам пакідае ўражанне, што ён складаўся толькі адным рухам — СС "Белая Русь". З першымі вынікамі працы "каманды" мы ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца: суцэльная хлусня, падтасоўка фактаў і езуіцкі цынізм. Адным з пачынальнікаў гэтага шабашу на БТ стаў паэт Генадзь Пашкоў.

ПРАГНОЗ ТЫДНЯ

"Хутчэй за ўсё выбары не адбудуцца", — гэтакі прагноз далі на прэс-канферэнцыі кіраўнікі БНФ. Ён зроблены па выніках сустрэч з выбаршчыкамі. У прэсе, лічаць лідэры БНФ, выбарчая кампанія асвятляецца надта слаба і многія грамадзяне не ведаюць, за каго, за што і як галасаваць. Акрамя таго, многія заяўляюць, што галасаваць не пойдуць, бо не давяраюць ніякім галінам улады. Зрыў выбараў, лічыць З. Пазняк, пойдзе на руку рэакцыйным сілам і можа прывесці да абвастрэння палітычнай сітуацыі ў Беларусі. А таму: усе на выбары!

ДА ГРАМАДЗЯН НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ

Дарагія сябры беларусы!

Рэферэндум, навязаны вашаму народу ворагамі беларускай дзяржаўнасці, — падзея, якая можа ператварыць вас і ваш народ у новых рабоў новай імперыі, што прыкрываецца пакуль што назваю СНД.

Калі вы прагаласуеце супраць сваёй дзяржаўнай сімволікі, то вы здрадзіце ўласнай гісторыі, якая нацыянальныя беларускія сімвалы не адзін раз дэманстравала свету ў часы свайго найвысокага духоўнага ўздыму.

Калі вы прагаласуеце за інтэграцыю з Расіяй, то здрадзіце Каліноўскаму ды іншым змагарам за дзяржаўную незалежнасць Беларусі. Вы перастанеце быць слаўнаю грамадою беларусаў, якая выйшла на гістарычную арэну ў XX стагоддзі, каб назвацца, як пісаў Янка Купала, людзьмі!

Калі вы прагаласуеце за дзяржаўнасць расійскай мовы на сваёй зямлі, то гэтым самым асудзіце на смерць пявучую мову Скарыны і Коласа, Багдановіча і Купалы, Быкава і Барадуліна. Ніколі ўжо ворагі беларускай мовы, якіх добра бачыў вялікі патрыёт Янка, не дадуць ёй падняцца. Двухмоўе — гэта гадзючая двухязыкасць, якое прапагандуецца толькі з адной мэтай — забіць беларускую душу, беларускую мову і культуру, знішчыць падмурак беларускай дзяржаўнасці.

Расійскія шавіністы намагаюцца давесці, што беларусы, расіяне і ўкраінцы падобныя, але яны ніколі не кажуць, што мы роўныя, бо не прызнаюць права беларусаў і ўкраінцаў на такую ж дзяржаву, якую маюць яны. Усе народы падобныя адзін на аднаго, але найважнейшая іх прыкмета ў тым, што яны раўнапраўныя!

Калі нацыянальная ідэя беларусаў на рэферэндуме будзе раздушана, то гэта будзе ўдар у самае сэрца Украіны, бо імперская Масква, праглынуўшы Беларусь, пажадае новай, яшчэ большай спажывы.

Дарагія браты і сёстры! Хай вам і нам прыкладам будзе нешматлікі, але магутны чачэнскі народ, які сёння памірае на крыжы за вашу і нашу свабоду. Не здрадзьце ж яму! Не здрадзьце і нам, вашым найблізкім пабрацімам, украінцам, а галоўнае — не адступайце ад сваіх заваёў, ад свайго ўласнага дзяржаўнага духу, якім сілкуецца Еўропа і ўвесь свет.

Ніводны народ на Зямлі не зазнаў такой крыві і такога прыніжэння, як беларусы. Мы верым, што настаў час адраджэння Беларусі, і ніхто не зможа запыніць вясны, якая нарадзілася ў Белавежскай пушчы на вашай зямлі.

Слава незалежнай Беларусі!

Слава беларуска-ўкраінскаму братэрству!

А. ГАНЧАР, М. ГАРЫНЬ, П. ДАРАЖЫНСЬКІ, І. ДРАЧ, М. КАРОБКА, Р. ЛУБКІЎСКІ, Ю. АРАБЕЦЬ, Д. ПАЎЛЫЧКА, В. ЧАРНАВІЛ

4.05.1995 г.

Выбары

КАГО ВЫБІРАЕМ, СПАДАРСТВА?

Калі б месяцы два назад у мяне спыталі, які занятак, на маю думку, сёння ў нас самы непрэстыжны, я б не задумваючыся адказаў, што дэпутацкая дзейнасць у парламенце. Гэтая думка была б вынікам не толькі ўласных назіранняў у час парламенцкіх сесій, а і шматлікіх сацыялагічных апытанняў грамадскай думкі, якія штораз пацвярджалі надзвычай нізкі рэйтынг народных абраннікаў.

Менавіта па гэтай прычыне, калі быў нарэшце прызначаны дзень выбараў новага складу Вярхоўнага Савета, у галаве варухнулася думка: пэўна, гэтым разам наогул не знойдзецца жадаючых балаціравацца ў вярхоўны орган заканадаўчай улады краіны, нягледзячы нават на дэпутацкія прывілеі, пастанову аб якіх прынялі народныя абраннікі напрыканцы сваёй дзейнасці.

Божа літасцівы, як жа я памыляўся! І стала гэта відавочна ледзь не ў першы дзень рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты выбарчымі камісіямі. Сёння, за дзень да выбараў, можам паведаміць канчатковую лічбу зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты, якую назвалі мне ў Цэнтравыбіркаме. Вось яна: 2348. На 260 парламенцкіх месц. Па 9 прэтэндэнтаў (у сярэднім) на кожнае. Не ведаю, ці дамагаліся такіх конкурсаў нашы самыя прэстыжныя ВНУ.

Тут, у Цэнтральнай выбарчай камісіі, я прагледзеў спісы кандыдатаў у дэпутаты. Стракатая, скажу вам, карціна. Мабыць, няма на Беларусі такой прафесіі, якая б не была тут прадстаўлена. Інжынеры і старшыні калгасаў, настаўнікі і ўрачы, леснікі і пажарныя, літаратары, мастакі і артысты. Ёсць нават хатнія гаспадыні і беспрацоўныя. Адзін з супрацоўнікаў камісіі паведаміў, што, па ягоных звестках, сярод кандыдатаў у дэпутаты ёсць чалавек, які знаходзіцца зараз у следчым ізалятары (як небезвядомы прэзідэнт МММ Маўродзі, які з "Матроскай цішыні" трапіў у Расійскую дзяржаўную думу); што адзін з тых, за каго 14 мая пойдзе галасаваць народ, нядаўна выпісаўся з наркалагічнага аддзялення псіхіятрычнай бальніцы, дзе лячыўся ад алкагалізму. Дзіўна? А чаго здзіўляцца! Закон аб выбарах не прадугледжвае медыцынскага агляду на прадмет вызначэння псіхічнага здароўя народных абраннікаў.

Што тычыць правядзення сёлетняй выбарчай кампаніі, дык я б яе ахарактарызаваў словамі персанажа аднаго вядомага рэкламнага роліка: "Это что-то!" "Это что-то" тычыцца, бадай, усіх аспектаў падрыхтоўкі да выбараў. Хоць бы і знаёмства з кандыдатамі ў дэпутаты. Запомніць толькі іх прозвішчы — гэтак жа цяжка, як запомніць твары людзей у вокнах пасажырскага цягніка, што імчыць міма цябе.

А што да іх выбарчых праграм, дык з трох хвілін эфірнага часу, адведзеных кожнаму кандыдату, такое-сякое ўяўленне пра іх можна было скласці. Ну і яшчэ з выбарчых улётак, якія я, напрыклад, ці не кожны дзень вымаў са сваёй паштовай скрынкі.

Што асабліва адклалася ў памяці з тых праслуханых і прачытаных праграм? Гэта, па-першае, лозунгі агульнапалітычнага плана. Вельмі многія з іх зместам і пафасам нагадвалі да болю знаёмыя лозунгі нашага слаўнага гістарычнага мінулага, тыпу: "Мір хацінам, вайна палацам!", "Уся ўлада Саветам!", "Фабрыкі — рабочым, зямлю — сялянам!", "Смерць эксплуататарам!", "Усе на барацьбу з Антантай!" (вінаваты, — з заходнім капіталам, які мае на мэце ператварыць нашу краіну ў сыравінны прыдатак капіталістычных дзяржаў).

На другім месцы — абяцанкі зрабіць наша жыццё райскім. Ды ў самыя кароткія тэрміны. Як толькі кандыдат у дэпутаты зойме парламенцкае крэсла, тут жа кожны грамадзянін рэспублікі атрымае тое, пра што зараз можа толькі марыць. Ну, скажам, 250-доларавую штомесячную зарплату, пераадоленне злачыннасці, наладжванне адмысловага медыцынскага абслугоўвання, паляпшэнне жыцця пенсіянераў і жанчын... Дарэчы, адна з прэтэндэнтак на дэпутацкае крэсла выказалася ў тым сэнсе, што кожная жанчына заслугоўвае таго, каб мець добрага мужа.

Мне асабіста больш за іншыя спадабалася выбарчая праграма аднаго з кандыдатаў у дэпутаты (дарэчы, па маёй выбарчай акрузе), які заяўляе: "Главная цель моей общественной деятельности — отстаивать интересы жителей микрорайона: рабочих, служащих, пенсионеров, инвалидов и ветеранов войны и труда, военнослужащих, молодежи, женщин и детей". А каб выбаршчыкі не падумалі, што гэтыя яго словы — пустыя абяцанкі, урачыста клянецца, што калі яго выберуць у Вярхоўны Савет, ён "реконструирует крыши в домах NN 3, 5, 77, 26, 36, 34 по улицам Калиновского и Седых".

Жарты жартамі, а — сумленная ў чалавека пазіцыя. Каб не цешылі сябе надзеяй нейкія там жыхары Гомеля ці Пінска, што ён і ў іх пачне рамантаваць дамы. Наш слаўны прэтэндэнт не бачыць асаблівай розніцы паміж ЖЭСам і парламентам. І правільна робіць. І адзін і другі павінен служыць людзям...

Усё гэта было б смешна, калі б не было так сумна. Хоць, заўважым, яшчэ больш сумна адчувала сябе адна мінская студэнтка, якая адчыніла дзверы тром незнаёмым хлопцам, што адрэкамендаваліся агітатарамі з выбарчага ўчастка. І ці то яны не былі ўпэўнены ў вартасцях кандыдата ў дэпутаты, якога прадстаўлялі, ці то па іншай прычыне, але, звязаўшы дзяўчыну, абрабавалі кватэру, выгукнуўшы на развітанне знаёмыя ім з дзяцінства словы: "Усе на выбары!"

Усе на выбары? Ну, а тым сам, спытае каторы чытач, таксама — як усе? Не, я, відаць, зраблю так, як мой мудры прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, які ў час сваёй прэс-канферэнцыі на аналагічнае пытанне адказаў: "Не пайду! Я ім не веру, бо ўсё роўна падмануць!"

Вось так. А шараговаму грамадзяніну, як і прэзідэнту, таксама — якая радасць быць падманутым?

М. ЗАМСКІ

З нагоды

АБСУРД У КАНЦЫ СТАГОДДЗЯ

Як можна супрацьстаяць злачыннасці, вар'яцтву, бескультур'ю? Не падтрымліваць злачыннасць, самому найперш не станавіцца вар'ятам і не губляць маральных прынцыпаў. Як толькі грамадства па розных прычынах страчвае інстынкт маральнага самазахавання, то верхаводзіць ім вельмі хутка пачынаюць маргіналы. Гісторыя XX стагоддзя ад пачатку да канца насычана такімі прыкладамі. І навошта далёка па іх хадзіць? У так званай "ціхай і мірнай" Беларусі маем зараз мо найвышэйшы паказчык такога апалітычнага, антысацыяльнага і амаральнага становішча. Нездарма ж ёсць прымаўка, што ў ціхім балоце нячысцікі водзяцца.

Аднак няма безвыходных сітуацый. Ну, падвялі нявопытнасць, празмерная даверлівасць, дэзарыентаванасць — што белае, а што чорнае. Але можна ўрэшце адчуць, што нешта тут не так. І знайсці прычыны, што робяць наша жыццё такім безнадзейным. І не паддавацца на ўгаворы таго, хто мякка сцеле (зноў скарыстаем словы з арсенала калектыўнага народнага вопыту, які не можа падвесці).

Мала што каму прыйдзе ў галаву — чужым коштам збудаваць сабе суперкалгас па нарыхтоўцы гарматнага мяса для чужых войнаў і выхавання бязмоўнага племені, над якім можна праводзіць самыя нялюдскія эксперыменты. Каб гэта зрабіць, трэба знішчыць апошнія маральныя масты, што лучаць з нацыянальнай годнасцю, гісторыяй, культурай. А потым усё, згодна з задумай, пойдзе як па масле!..

Гэта — злачынна. Патрабуецца юрыдычная і міжнародная адзнака такім пачынанням, што ўзведзены ў ранг "барацьбы за лепшае жыццё для народа". Але каму там у ААН галава баліць з-за небяспекі, што навісла над адным з яго сяброў-заснавальнікаў, які так моцна пацярпеў у апошняй сусветнай бойні? А тут — толькі згодніцтва ды патуранне і ніякага пратэсту з боку ўлад, заканадаўства, кантролю!

Канешне, можна падкупіць, задобрыць абяцаннямі, прывілеямі, падачкамі тых, ад каго ў дадзены мо-

Пошта

БОГ НЕ ВЫДАСЦЬ...

На сваім апошнім пасяджэнні Вярхоўны Савет Беларусі ўхваліў прапанову прэзідэнта і прыняў адпаведную пастанову аб правядзенні рэферэндуму па наданні рускай мове статуса дзяржаўнай ды замене нацыянальнай сімволікі на бээсэсэраўскую. Па сутнасці, жыхарам Беларусі прапаноўваецца самім, згодна з уласнай воляй, адмовіцца ад роднай мовы і гістарычнай памяці і тым самым вырашыць лёс беларусаў як асобнага народа, здзейсніць, як гэта трапна адзначыў Ніл Гілевіч, самазабойства, І такое мусіць адбыцца, калі мы будзем слухаць тых "дабрадзеяў", каторыя кажуць, што ў нас сваёй мовы няма і нам непатрэбна яна, што мы павінны стаць расійцамі або палякамі. Іншыя кажуць гэта знарок, а другія па неўразуменні ці глупстве, але, улічваючы такія разважанні, прэзідэнт і яго каманда ўпэўнены, што жыхары Беларусі іх не падвядуць. І напэўна, як гэта сведчыць гістарычны вопыт, прэзідэнт мае рацыю. На Беларусі ідэя правядзення рэферэндуму — не навіна. Яшчэ ў 1812 годзе Напалеон меў намер правесці рэферэндум па аднаўленні Вялікага княства Літоўскага пад пратэктаратам Францыі і быў упэўнены, што жыхары княства яго не падвядуць. Потым бальшавікі заклікалі да правядзення рэферэндуму аб далучэнні Беларусі да Савецкай Расіі і таксама былі ўпэўнены, што жыхары Беларусі іх падтрымаюць. Вось што з нагоды такой упэўненасці пісаў у той час вядомы беларускі асветнік і дзяржаўны дзеяч Язэп Лёсік: "Нашы сяляне на з'ездах выслаўляліся ў тым сэнсе, што ім не патрэбна аўтаномія, але ж рабілі яны гэта па недавумстве і цямноце сваёй, а найбольш падашуканстве, бо разам з гэтым яны казалі, што і мова іх ім не патрэбна. Ніхто на свеце не адракаецца ад сваёй мовы, а нашы сяляне адракаюцца. Значыць, робяць яны гэта па недавумстве і цямноце. Ведаючы, што наша сялянства забітае і цёмнае, ворагі Беларусі карыстаюцца з гэтага і кажуць: нашто будаваць беларускія школы, калі народ іх не хоча? Народ... Як жа народ запатрабуе сваіх беларускіх школ, калі ён іх дагэтуль не бачыў і нічагутка ў гэтай справе не цяміць? Дзіўная гэта звычка ў людзей — спасылацца на народ там, дзе яно зусім недарэчы. Ува ўсіх іншых пытаннях мы звяртаемся да знаўцаў і спецыялістаў, а вот пры дзяржаўным адбудаванні задавальняемся думкамі такіх майстроў, як цёмны, неадукаваны народ... Народ — добрая рэч, але яму трэба расказаць, растлумачыць, яго трэба спачатку асвеціць, навучыць, а ўжо потым клікаць да сябе на параду". Добра сказана. Але ворагі беларушчыны не прыслухоўваліся да слоў патрыётаў Беларусі. Яны рабілі так, як імпа было зручна. І пры вырашэнні любога складанага пытання папапулісцку заяўлялі: "Запытайце ў народа", бо ведалі, што запалоханы і ачмураны народ не стане супярэчыць начальнікам. Так, у 1919 годзе Пілсудскі выказаў намер правесці рэферэндум аб далучэнні да Польшчы тых беларускіх земляў, што былі заняты польскім войскам, і 25 лістапада 1919 года Варшаўскі сейм прыняў адпаведную пастанову. І Пілсудскі і дэпутаты сейма таксама былі ўпэўнены, што ўсё адбудзецца так, як ім хочацца, і таксама мелі рацыю. Пасол Камянецкі, робячы справаздачу аб сваім побыце на ўсходніх землях, казаў: "...беларусы, а прынамсі паважная іх частка, гатовы прызнаць сябе законапаслухмянымі падданымі польскага гаспадарства". Генеральны камісар усходніх земляў пан Асмалоўскі запэўніваў, што "беларускія мужыкі скрозь дамагаюцца польскіх школ і зусім пэўна, што ў выпадку плебісцыту амаль уся люднасць выкажацца за Польшчу". Зараз тое ж сцвярджае і спадар Лукашэнка, але, у адрозненне ад Напалеона і Пілсудскага, лічыць, што беларусы імкнуцца не да Францыі ці Польшчы, а да Расіі, як некалі лічылі бальшавікі. І прэзідэнт не памыляецца. За семдзесят гадоў бальшавіцкага панавання беларусы не паразумнелі. Пасля ўсяго перажытага народу стала ўсё роўна, бо ён ужо стагоддзі як не гаспадар у сваёй уласнай хаце і зняверыўся ў сабе. Нядоля наша ў тым, што мы, страціўшы сваю незалежнасць, у цяжкіх варунках гісторыі не здолелі адстаяць сваю нацыянальную самабытнасць і сталіся папасам для суседзяў, спажыўнаю ніваю для чужынцаў. Дзесяткі пакаленняў беларусаў не жылі ўжо ў сваёй дзяржаве, сваім уласным беларускім жыццём. Мы ўжо не можам у адначассе ўсвядоміць, што калі мы любім свой край, калі жадаем сабе лепшай долі і не пазбавіліся чалавечай вартасці — дык павінны стаць на ўласныя ногі, дзеля чаго маем трывалы падмурак. Сотні гадоў нас апалячвалі, дзвесце гадоў нас русіфікоўвалі, але ні паланізм, ні русіцызм не крануўся народа нашага. Народ у істоце сваёй застаўся непарушным, і ў гэтым наша сіла, наша збавенне і зарука светлай будучыні. Бог не выдасць — свіння не з'есць, — кажа наша прымаўка. І рэферэндум, які прэзідэнт і яго каманда наважыліся правесці на беларускіх абшарах, не будзе мець ніякага значэння для будучыні беларускага народа, але гэта ганьба, ад якой пацерпяць не толькі беларусы, а найперш тыя нашы "дабрадзеі", якія сёння вельмі пра нас клапоцяцца.

Рыгор КЛІМОВІЧ

г. Гомель

мант нешта залежыць. Хай іх будзе і трыста, і нат больш за тысячу. Такія заўсёды знаходзяцца. Але апошняе слова належыць мільёнам. Якімі яшчэ абяцаннямі іх можна ў каторы раз абдурыць, калі яны толькі і думаюць: "А што нам за гэта будзе?". У гэтым пытанні ёсць нешта ад рацыяналізму, што сведчыць пра еўрапейскасць народа, хоць за 200 гадоў рабства яго мысленне сышло, скацілася да крайніх, прымітыўных форм прагматызму. Такія паняцці вышэйшага духоўнага рангу, як нацыянальная годнасць, патрыятызм, незалежнасць, зведзены амаль да нуля. У гэтым слабае месца і небяспека. Таму і навязваецца забойчая для народа задача **добраахвотнага самаадмаўлення**, хоць узамен нічога матэрыяльна-карыснага не прапануецца. Проста заклікаюць нас узяць ношу адказнасці за навязаную зверху злачынную і антызаконную мэту. Мяркуючы па тым, што такая прапанова не выклікала асаблівых дыскусій, нават традыцыйных пытанняў: "А што нам за гэта дадуць?", многія не супраць узяць на сябе і такую адказнасць. Каго яшчэ можна задарма пакласці на плаху галавой і атрымаць распіску, што ён дае згоду на ўсё, што з ім потым адбудзецца?

Але за памылкі, ды такога небывалага маштабу, прыйдзецца плаціць усім і самым вялікім коштам. На вачах у далёкага і блізкага замежжа творыцца абсурд, што, здаецца, не ўпісваецца ні ў якія рамкі. Але XX стагоддзе, як ужо падкрэслівалася, багатае на прыклады, якія павінны вучыць. На тое толькі і надзея.

Яўген ШУНЕЙКА

Адгалоскі

АДГРЫМЕЛІ МАЙСКІЯ САЛЮТЫ...

Перад святам на вуліцах Мінска мы бачылі многа старых людзей. Яны былі, як кажуць, пры парадзе, неслі кветкі, іх твары свяціліся. Што трэба для радасці? Добрае слова, увага, а як на сённяшні дзень, дык і прадукты з грашамі не пашкодзяць.

Свята Перамогі — гэта найперш іхняе свята. Апошнія 20 год яно адзначалася досыць урачыста, з прыкметнымі ўсплескамі, што прыпадаюць на круглыя даты. Усё, што можна было сказаць пра кошт перамогі і яе значэнне, ужо сказана. І хоць не лішне тое-сёе і паўтарыць (каб дзеці ведалі), але непазбежна паўстаюць пытанні ідэйнага, скажам так, плана.

Пытанне першае і асноўнае. Які змест укладаецца ў тыя ці іншыя святочныя мерапрыемствы? З якіх пазіцый яны асвятляюцца? Якая мэта за імі стаіць і ці не павінна яна з цягам часу дыялектычна трансфармавацца?

Раней было проста: змест і мэта супадалі, усё зводзілася да непамернага кваціста самаўзвелічэння — савецкага народа, які перамог, ладу, пры якім перамаглі, правадыра, які вёў да перамогі, ці пэўнай арганізацыі, якая перамогу забяспечыла (г. зн. кампартыі). Цяпер пытанне ўскладнілася, адбыўся ідэйны раскол грамадства, які, на жаль, праходзіць і па ўзроставай мяжы. Статус Беларусі як незалежнай дзяржавы патрабуе іншага падыходу, іншай канцэпцыі. Перамога, напрыклад, гэта свята самога жыцця, свята духоўнай моцы, свята пераадолення цяжкасцей. Альбо Перамога — зарука будучых поспехаў на цяпер ужо самастойным шляху, дзе столькі тупікоў і пастак. Альбо яшчэ штосьці падобнае, над чым раней ламалі галаву байцы ідэалагічнага фронту і што зараз засталося як бы "нічыйным". Тут многае залежыць ад тэле- і радыёсупрацоўнікаў, а таксама ад тых, хто стаў аб'ектам іх увагі.

Згадаем рэпартаж са святочнай дэманстрацыі. Адзін ветэран нацыскае на інтэрнацыянальны момант і пры гэтым яўна траціць адчуванне рэальнасці: "Мы все были россиянами". Сказаў бы ўжо — савецкімі людзьмі... Далей ідзе панегірык адзінай дзяржаве — СССР. Другі ўдзельнік вайны, начальнік штаба партызанскай брыгады, аказваецца на вышыні і прамаўляе рэчы, якія таксама не ўсім спадабаюцца.

Тым не менш, уся "пераможная кампанія" вытрымана ў духу настальгіі па нядаўнім мінулым. Ці так было запланавана, ці так атрымалася само па сабе, але мусім канстатаваць, што 50-годдзе Перамогі стала ў Беларусі святам пракамуністычных і антынезалежніцкіх сіл. Выразнае пацвярджэнне гэтага — урачысты сход у сталічным Палацы спорту 7 мая.

Сцісла пералічыўшы асноўныя даты і лічбы другой сусветнай, прэзідэнт значную частку свайго гадзіннага даклада прысвяціў палеміцы з апазіцыянерамі ўсіх масцей і накірункаў. Ён не толькі абараняў "от извращений" партызанскі рух Беларусі, але і добранька прайшоўся па ўсіх аспектах міжнароднага і ўнутранага жыцця краіны. Так, мы даведаліся, што адставанне з рэформамі — гэта не "пракол" уладных структур, а адзнака свайго ўласнага шляху, або беларускай мадэлі. Што палітычная рэформа ўжо амаль завершана (!), а калі дзе і паставілі не таго ў прэзідэнцкай вертыкалі, то гэтую справу можна паправіць. Што ўлада нам патрэбна перш за ўсё моцная (а не разумная, як магло б падацца чалавеку наіўнаму).

З вопытнасцю мануальшчыка нацыскаў прэзідэнт на адчувальныя кропкі ветэранскага корпуса, запрошанага на пасяджэнне. Ён выказаў шкадаванне, што гэта вялікае свята мы сустракаем "не в единой семье народов", не забыўся назваць нашых галоўных камуністаў — Панамарэнку і Машэрава, таксама зрабіў нацыск на інтэрнацыяналізме, згадаў пра выбары і рэферэндум. Зала самааддана біла ў ладкі амаль пасля кожнага абзаца. Ну як на партыйным з'ездзе!

У дакладзе была прадумана і ўзважана кожная драбніца. Па сутнасці, было ахоплена ўсё, і генерал-маёр у адстаўцы А. Чацвяроў, які выступаў ад ветэранскай арганізацыі, мусіў паўтарацца. Адзінае, чым ён вылучыўся, дык гэта ўпамінаннем імені Сталіна. Папляскалі і Сталіну. Выхаванец доблеснай савецкай арміі ад імя ветэранаў выказаў падтрымку мерапрыемствам "товарища Лукашенко" і ўсім пунктам рэферэндуму. Праўда, нацыянальная сімволіка і ў гэтай зале, і наогул на свяце была адменена і без усялякага рэферэндуму.

Ззялі медныя трубы аркестра і ўзнагароды на пінжаках, стракацелі вялікія стужкі ордэнскіх планак, што ўпрыгожвалі сцэну. Хто не апладзіраваў, той мірна драмаў. Гэтых людзей было па-чалавечы шкада. Яны з цяжкасцю ўзнімаліся на верхатуру сектараў.

Адгрымелі салюты, шоу, феерверкі. Апошнія запомніліся найбольш. Яны пацешылі і дарослых, і малых. "Гітлер капут!" — крычалі студэнты-замежнікі. Яшчэ адно майскае свята адышло, і мы зноў засталіся сам-насам са сваімі нявырашанымі праблемамі...

НАШ КАР.

СВЯТА Ў СТЫЛІ "РЭТРА"

9 мая называлі адзінай святочнай датай савецкага календара. І сапраўды, мала хто сур'ёзна ставіўся да так званых прафесійных святаў — дзён танкіста, хіміка, гандлёвага работніка... Досыць іранічна ўспрымаўся і Дзень Канстытуцыі СССР. 7 лістапада і 1 мая былі найперш падставай сабрацца хаўрусам і ўзяць чарку, не надта задумваючыся аб ідэалагічным змесце святаў. 23 лютага і 8 сакавіка былі адпаведна "мужчынскім" і "жаночым" днямі календара — чымсьці накшталт калектыўнага дня нараджэння.

І толькі 9 мая мела амаль рэлігійны сэнс. У гэты дзень раз'яднанае савецкае грамадства станавілася на кароткі час адзіным народам. У гэты дзень сэрцы напаўняліся смуткам і гордасцю, і ваенная кінахроніка на экране тэлевізара ўспрымалася як злабадзённыя навіны.

Так яно, збольшага, ёсць і зараз, праз пяцьдзесят гадоў пасля сканчэння другой сусветнай вайны ў Еўропе, праз чатыры гады пасля скону СССР. Толькі цяпер наш позірк у мінулае стаў больш пільным; цяпер менш эмоцый — і таму больш пытанняў... Хай не пакрыўдзяцца ветэраны, але тыя, хто нарадзіўся пасля вайны, ведаюць пра другую сусветную — Вялікую Айчынную тое, што непасрэдныя ўдзельнікі і сведкі ведаць не маглі (а калі і ведалі, дык не маглі тады асэнсаваць). А мы сёння ведаем пра сакрэтныя пратаколы "пакта Молатаў—Рыбентроп"; пра велізарныя нашы ахвяры, якія ставяць пад сумненне і прафесіяналізм савецкіх генералаў, і мудрасць палітычнага кіраўніцтва краіны; пра тое, што часам "народных мсціўцаў" насельніцтва таксама баялася, бо візіты іх нярэдка прыносілі гора і слёзы; пра маштабы пасляваенных рэпрэсій супраць воінаў-пераможцаў з мэтай вярнуць у даваенны стан рабскага падпарадкавання краіну і людзей, якія сваёй крывёю заваявалі права на павагу...

Перамога, як і ўсё ў краіне, што называлася Савецкім Саюзам, была прыватызавана "руководящей и направляющей силой". Гэта быў палітычны капітал, з якога вярхушка КПСС не адно дзесяцігоддзе "стрыгла купоны". І таму сёння сцвярджэнні аб тым, што перамога была немагчымай без кіруючай ролі КПСС, што яна — сведчанне перавагі камуністычнай ідэалогіі, гэта чыстае рэтра...

У стылі рэтра праходзіла на Беларусі і святкаванне 50-й гадавіны Перамогі. Пад чырвонымі сцягамі і камуністычна-настальгічнымі лозунгамі. У часе трансляцыі з плошчы Незалежнасці тэлекамера стаяла так, каб, крый Божа, у кадр не трапіў бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня", што вянчаюць Дом урада.

Пад чырвонымі сцягамі ішло Беларускае войска. На расійскай мове прамаўляў прэзідэнт і міністр абароны. Адзіным адступленнем ад савецкай традыцыі было тое, што сп. Лукашэнка выступіў з прамовай на ваенным парадзе, а было прынята, каб перад войскам прамаўляў толькі міністр абароны. Вельмі непрафесійнай была работа тэлекаментатараў на плошчы Незалежнасці. Пераказваць тэхнічныя характарыстыкі танкаў і самалётаў можна было б у другі час і ў другім месцы. А на першым парадзе нацыянальнага войска Беларусі мне асабіста хацелася б пачуць пра структурныя пераўтварэнні ў нашай арміі, пра ваенную дактрыну Беларусі.

Апошнім часам звыклым стала словаспалучэнне "государственная граница СНГ". Хацелася і тут даведацца: наша дзяржаўная мяжа — яшчэ наша?

Ветэраны па праспекце Скарыны ішлі са сцягамі СССР і БССР, з партрэтамі Сталіна і адпаведнымі лозунгамі. Крыўдна было за старых людзей. У 1941 годзе іх, маладых, узброеных трохлінейкамі, бяздарныя крамлёўскія стратэгі падставілі пад нямецкія танкі; а сёння, скарыстоўваючы настальгію па маладосці, іх падстаўляюць зноў. У якасці пешкі ў бруднай палітычнай гульні. Ёсць тыя, хто хацеў бы на іхніх плячах узняцца на прастол "адноўленага Саюза".

Свята прайшло ў стылі "рэтра". У такім жа стылі было і фінансаванне свята. Мяркуючы па афіцыйных сродках масавай інфармацыі, грошы на ўшанаванне ветэранаў прэзідэнт дастаў ці не з уласнай кішэні. Між тым, сродкі з'явіліся за кошт дадатковых падаткаў на працуючыя прадпрыемствы і камерцыйныя структуры. Інакш кажучы, узялі ў кішэні ўнука і далі дзеду. Цікава, а на што будзе жыць дзед, калі ўнука ўвогуле "раскулачыць", як прапануе сёння адзін усім вядомы радыкал з бальшавіцкімі схільнасцямі?

Свята рабілася з прыцэлам на рэферэндум і выбары. З якімі пачуццямі прыйдуць 14 мая людзі на выбарчыя ўчасткі: з настальгіяй па мінулым альбо з пачуццём адказнасці за будучыню?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

ЛІМ
ЧАСАПІС

ГІСТОРЫЯ: ПАЗБАЎЛЕННЕ СТЭРЭАТЫПАЎ

Нядаўна ў выдавецтве "Беларусь" пабачыла свет другая частка "Нарысаў гісторыі Беларусі". Як і папярэдняя, яна вызначаецца новым поглядам на падзеі мінуўшчыны, імкненнем аўтарскага калектыву як мага больш поўна і аб'ектыўна даследаваць падзеі, што адбываліся на складаным гістарычным прамежку, у тым ліку і ў трыццатыя гады. Да напісання "Нарысаў..." былі прыцягнуты найбольш вядомыя і аўтарытэтныя гісторыкі. Безумоўна, ім даводзілася няпроста. Справа ў тым, што доўгі час на нацыянальную гісторыю прынята было глядзець з-за ідэалагічных і партыйных указанняў аднабакова, з прарасійскіх пазіцый.

І вось гісторыя Беларусі, пазбаўленая стэрэатыпаў. Несумненна, першая ў шэрагу выданняў, якія павінны (а ў гэта хочацца верыць!) з'явіцца ў далейшым. А пакуль яна рэкамендавана і ў якасці дапаможніка студэнтам вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, і як свайго роду настольная кніга для кожнага, хто ганарыцца тым, што ён беларус.

Пэўным падагульненнем зробленай работы, вызначэннем далейшых перспектыў стала прэзентацыя другой часткі "Нарысаў..." у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Перад прысутнымі выступілі дырэктар Інстытута М. Касцюк, дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта М. Шупляк, галоўны рэдактар выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі Б. Сачанка, прадстаўнік Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь Н. Ганошчанка і іншыя. Адзначалася важкасць набыткаў аўтарскага калектыву, падкрэслівалася неабходнасць не спыняцца на дасягнутым, выказвалася ўпэўненасць, што неўзабаве павінны з'явіцца і іншыя аналагічныя дапаможнікі. Прынамсі, пра свой падручнік рупяцца на гістарычным факультэце універсітэта.

Не абышлося ў час прэзентацыі і без палемікі. Герой Савецкага Саюза А. Філімонаў мяркуе, што выхад "Нарысаў..." нельга лічыць своечасовым і патрэбным.

НЕВЯДОМЫЯ КНІГІ З БЕЛАРУСІ

21—25 красавіка ў Будапешце прайшоў 2-і Міжнародны кніжны фестываль, які пачаў праводзіцца ў сталіцы Вугоршчыны з мінулага года і, падобна на тое, становіцца адным з буйнейшых традыцыйных фестываляў у Еўропе. На гэты раз у ім брала ўдзел блізу 200 кнігавыдаўцоў з многіх краін Еўропы (апроч Бенілюкса і Скандынавіі), а таксама ЗША, Расіі і Японіі. Удзел прадстаўнікоў Беларусі забяспечыў Беларускі Фонд Сораса.

У беларускім павільёне былі выстаўлены мінулагоднія выданні большасці дзяржаўных і некаторых незалежных выдавецтваў нашай краіны. Каардынатар культурных і выдавецкіх праграм БФС А. Анціпенка ўзяў удзел у сустрэчы выдаўцоў з Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, на якой распавёў пра стан і перспектывы выдавецкай справы на Беларусі, ахарактарызаваў прывезеныя ў Будапешт выданні. Сярод іх найбольшай цікаўнасцю — і попытам — наведвальнікаў і менеджэраў карысталіся выданні менскай Незалежнай выдавецкай кампаніі "Тэхналогія" (В. Багдановіч): "Беларусь. Новая краіна ва Усходняй Еўропе" (у англійскай, нямецкай і французскай мовах) У. Новіка, а таксама кніга К. Пікарды "Менск. Гістарычны шляхаводнік" (па-ангельску). Адзначаліся альбом "Іканапіс Беларусі XV—XVIII стагоддзяў" выдавецтва "Беларусь" і толькі што выдадзеная выдавецтвам "Навука і тэхніка" кніга гісторыка Г. Сагановіча "Невядомая вайна: 1654—1667" — пра вайну Маскоўскай дзяржавы супраць Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай і тагачасныя падзеі на тэрыторыі Беларусі.

На фестывалі не прысуджалася дыпломаў і ўзнагарод: працавалі "круглыя сталы" рознай тэматыкі, ладзіўся абмен інфармацыяй. У апошні дзень працы кнігі з Беларусі былі спрэзентаваны універсітэту імя Ларанда Этваша, у якім ёсць кафедра ўсходнеславянскай і балтыйскай філалогіі і пэўная колькасць студэнтаў спецыялізуецца ў беларускай мове, літаратуры і гісторыі.

НА ПРЭМІЮ МЕЛЕЖА

Пасяджэнне секцыі прозы Саюза беларускіх пісьменнікаў на гэты раз пачалося з вылучэння прэтэндэнтаў на атрыманне прэміі СП імя І. П. Мележа. Аднагалосна кандыдатам на лаўрэацтва названы пісьменнік Андрэй Федарэнка за кнігу прозы "Смута". Затым была абмеркавана творчасць сяброў літаб'яднання, што дзейнічае пры Іванаўскай раённай газеце Брэсцкай вобласці — Аляксея Каўкі, Анатоля Дзенісейкі і Васіля Жушмы. У выніку Васіль Жушма рэкамендаваны секцыяй да ўступлення ў сябры СП.

Анонс

"БОГ СЯРОД НАС"

Такая назва пазначана на заўтрашняй афішы Вялікай залы філармоніі. "Бог сярод нас" — гэта не проста прэм'ера новай праграмы вядомай беларускай вакальнай групы "Камерата", якой кіруе яе заснавальнік і лідэр Алег Шыкуноў. Гэта — прэзентацыя новай культурнай з'явы, самабытнага і наватарскага мастацтва, аналагаў якому, на думку спецыялістаў, няма ў свеце. "Бог сярод нас" — гэта васьмічасткавы твор, заснаваны на тэкстах Старога запавета, узятых з артадаксальнай Бібліі. Кампазітар — Алег Шыкуноў... Здавалася б, пра якое наватарства можа быць гаворка, калі ці не кожны мастак, музыкант, нават без пільнай на тое духоўнай патрэбы, звяртаецца да біблейскіх тэкстаў, сюжэтаў? Дайце веры, тое, што мае адбыцца заўтра, 13 мая, у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, — і сапраўды не мае аналагаў сярод вядомых нам узораў музычнага (і музычна-відовішчнага) мастацтва. Ідзіце — і пераканайцеся! А калі вам патрэбны аргументы — чытайце далей.

Далей варта паведаміць, што "Бог сярод нас" — твор сімфанічны, але партытура яго будзе ўзноўлена шасцю галасамі вакалістаў "Камераты". Сп. Шыкуноў распрацоўвае тэорыю тэмбравага голасу, трактуе вакальны ансамбль як аркестравы склад, у якім шэсць пеўчых галасоў ператвараюцца ў настолькі гнуткія "музычныя інструменты", што могуць узнаўляць гучанне, скажам так, дзівоснага аркестра з трыццаці тэмбраў! Варта паведаміць таксама, што "Бог сярод нас" паўстане як маляўнічая містэрыя: будуць своеасаблівыя пластычныя ілюстрацыі ў выкананні ансамбля пантамімы "Рух" пад кіраўніцтвам У. Колесава, атмасферу народнага дзейства дапамогуць стварыць дзіцячыя харавыя калектывы пад кіраўніцтвам У. Глушакова (Белтэлерадыёкампанія) ды А. Мазуравай (ліцэй пры Акадэміі музыкі), трупа навучэнцаў Беларускага харэаграфічнага вучылішча. Імправізацыйная стыхія будзе працінаць і незвычайную гукавую атмасферу: да ўдзелу ў выкананні запрошаны добрыя творчыя партнёры "Камераты" — знакаміты арганіст Алег Янчанка ды вядомая сваім новым джазавым стылем расійская група "Архангельск".

У канцэртнай практыцы нашай краіны гэта унікальны выпадак спонсарскай падтрымкі сур'ёзнага, некамерцыйнага, непапулярнага мастацтва. Мінская фірма "Мэджык" (генеральны дырэктар Ю. Будзька) выдзеліла сродкі на запіс праграмы і зрабіла рэкламна-выдавецкую прадукцыю для канцэрта. Спонсарамі з'яўляюцца таксама фірмы "Петрашоп", "ЮрыЛайт", "Фітамак", якія прадастаўляюць гукавую апаратуру, светлавое абсталяванне, забяспечваюць афармленне сцэны. Білеты для жадаючых трапіць на прадстаўленне "Бог сярод нас" абыдуцца разоў у 10 даражэй за звычайныя філарманічныя. Аднак артысты не будуць мець з гэтага ніякага заробку: грошы, атрыманыя ад продажу білетаў, спатрэбяцца хоць на частковае пакрыццё выдаткаў па прыёме расійскіх удзельнікаў праграмы.

С. Б.

На здымку: ансамбль "Камерата". Фота Ж. МАЁРАВАЙ

Памяркуем

І НЕ ТОЕ ПЕРАЖЫВАЛІ...

Выпрабаваць, паводле "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы", гэта "праверыць чые-небудзь якасці, здольнасці". Далей ідуць красамоўныя прыклады: *Выпрабаваць цярпенне, выпрабаваць сваю сілу.*

Выпрабаванні, напэўна, бываюць у кожнага, толькі не ўсе іх усведамляюць, не ўсе пераносяць з годнасцю і не ўсе робяць адпаведныя высновы.

Адзінае, з чым можна пераблытаць выпрабаванне, — гэта кара божая, аднак гэтую тэму мы з пэўных прычын развіваць не будзем.

Выпрабаванні выпадаюць на лёс цэлых народаў. Яны абрыньваюцца ў выглядзе эпідэмій, землятрусаў, засух, войнаў, рабства і таму падобных катаклізмаў, якія нясуць смерць, голад, патрасенні, маральную і фізічную дэградацыю. Мы ведаем, якія цяжкія выпрабаванні выпадалі на долю армян, яўрэяў, японцаў, балгар, немцаў. Народы і цывілізацыі, што зніклі з твару Зямлі, мабыць, не вытрымалі пасланых звыш пакут. Тое, што адбываецца ў краінах сучаснай Афрыкі, — таксама з'ява надзвычайная, а значыць — невыпадковая.

Праверкай на трываласць можа быць нават сацыяльны лад. Менавіта ў такой ролі выступіў, здаецца, сацыялізм. Бальшавікі з курапатамі і гулагамі ды "чырвоныя кхмеры" з матыкамі для прабівання чарапоў — вось яго сапраўдны, да пары прыхаваны ад свету воблік.

Скажаце, містыка? Тут мімаволі паверыш у нейкае "звыш". Хіба не выпрабаваннем была, напрыклад, для беларусаў фашысцкая акупацыя? Нідзе столькі не палілі людзей жывымі, як у нас. Прычым людзей нявінных, цывільных, старых і малых. Даводзілася чуць, што калі чалавек згарае жывым, душа не паспявае аддзяліцца ад цела і таксама гіне беззваротна. Бессмяротная нібыта чалавечая душа...

А хіба не прымусіў нас пра многае задумацца Чарнобыль? Усё часцей людзі задаюць сабе пытанне "За што?" і бачаць за гэтым насланнём якуюсь патаемную задуму.

Наша суседка Русь звычайна выпрабоўвалася ўладай. Там былі вечныя непаразуменні з уладарамі — царамі ды генсекамі. То дэспат, то садыст, то адукаваны дэспат, у аднаго манія велічы, у другога — манія праследавання ці яшчэ якая-небудзь трасца. Катастрафічна не шанцавала. А завядзецца хто мяккасардэчны (у параўнанні з папярэднікамі), дык яго ці ў расход пусцяць, ці проста ссадзяць з трона і адціснуць у кут. Каб памятаў, дзе выпала жыць і ўладарыць.

Цяпер падобнае ж выпрабаванне напаткала і нас... І мы — вось жа парадокс! — не меўшы сваіх уласных сатрапаў, пры дапамозе звычайнага бюлетэня ўзялі і выбралі чалавека, які чым далей, тым больш нас здзіўляе.

Бясслаўны фінал працы гэтага Вярхоўнага Савета — выключна яго заслуга. Апазіцыю з залы пасяджэнняў літаральна выкінулі, прыдумаўшы (ці падстроіўшы) нейкія тэлефонныя пагрозы. Каторы тыдзень нам абяцаюць паказаць плёнку, хаця "народ і так ведае праўду". У гэтым святле па-інакшаму ўспрымаюцца заявы прэзідэнта наконт адказнасці. Маўляў, **з мяне спытаюць, я за ўсё адказны.** Значыць, і за тое, як абышліся з апазіцыяй, — таксама? І за тое, што выбарчая кампанія — як мокрае гарыць? І за многае іншае, з-за чаго цяпер падаюць духам нават вялікія аптымісты?

Нельга не звярнуцца да сустрэчы прэзідэнта з прадстаўнікамі прэсы. "Надо честными быть!" — як заўсёды пранікнёна і напорыста заклікаў прэзідэнт. Што ён пад чэснасцю мае на ўвазе — зразумець цяжка. Быць чэснымі — гэта, напэўна, думаць, як ён, падзяляць яго перакананні. Баюся, што большасці з журналістаў гэты ганаровы эпітэт не пагражае, пакуль прэзідэнт думае так, як думае, і робіць так, як робіць.

Народы, пазбаўленыя свабоды, жывуць інстынктамі, пісаў рускі пісьменнік М.Кураеў. Прэзідэнт як тыповы прадстаўнік пэўнай часткі народа, таксама, думаецца, дзейнічае інстынктыўна. Што яму і ўсім нам дасць яго задума — рэферэндум, як той казаў, "будем посмотреть". З філасофскага пункту гледжання тут можна знайсці нават плюсы. У народа з'явіцца магчымасць самапазнання, а значыць, і самаацэнкі. Вялікая рэч, асабліва калі інстынкты распераваліся...

Так што не ўпадайце ў дэпрэсію, спадары-беларусы! І не тое перажывалі!

Г. К.

ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ,

або АДКУЛЬ У НАС УЛАДЫКА МАКСІМ

Заўважана (і не толькі мною), што дзеячы праваслаўя не любяць слова "хрысціянства" і ўсяляк яго пазбягаюць. Увогуле, яны шмат чаго не любяць: канкурэнтаў-каталікоў, усходнія рэлігіі, якія змешваюць у кучу, лекараў, экстрасенсаў, гадалак, НЛА... Праўда, адна газетная публікацыя ледзьве не пераканала мяне ў існаванні дасюль неапазнаных аб'ектаў. Толькі НЛА мог высадзіць на нашу зямлю ў ваколіцах Магілёва бацюшку Максіма. Яго схапілі прама перад храмам Васіля Блажэннага прыкладна ў сярэдзіне 19-га стагоддзя. Інакш чаму ён так слаба арыентуецца ў часе і прасторы? Ён прызнае існаванне толькі слаўнай расійскай гісторыі, называе імёны Неўскага, Суворава, Кутузава (а палкаводцы пры чым? Ужо б Серафіма Сароўскага згадаў). Ён аперыруе даўно спісанымі ў архіў лозунгамі, напрыклад, "За веру, царя и отечество!", глыбакадумна разважае пра "неразделенную" Расійскую імперыю, якая і ёсць, аказваецца, "наша страна".

Акрамя таго, уладыка Максім вельмі стрымана ўспрымае ідэю магчымага пераходу ў богаслужэнні на беларускую мову. Евангелле перакладаць таксама, на яго думку, няма патрэбы. На мову алеутаў (у газеце чамусьці яны названы "алиутами"), праўда, пераклалі і досыць арыгінальна: "Рыбу давай нам, госпадзі, на кожны дзень..." Чаму ж нам уладыка Максім адмаўляе ў праве па-свойму размаўляць з Богам? Ці мы не дараслі да "алиутов"?

Можа, хто і не дарос. Прыхаджане Магілёўскай Епархіі дык пэўна, раз б'юць чалом Алексію II і просяць павысіць уладыку "ў званні": прысвоіць яму сан мітрапаліта. Хіба ж не прыкмецілі, што іх пастар, мякка кажучы, перавучаны у семінарыі і ад яго перакананняў патыхае цвіллю? (Калі адкінуць версію падарожжа ў часе з дапамогай НЛА.) Ягоныя "разлагольствования" не зразумелі б і ў сучаснай Расіі, дзе апошнім часам імперскага душку паболела.

Напрыканцы паведамляем, што гутарку з архіепіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім надрукаваў у гонар Вялікадня штотыднёвік "7 дней", дакладней, яго бясплатны дадатак "7 ночей", а з уладыкам Максімам меў гонар гутарыць сам Ігар Гукоўскі. Той, што стаў неўзабаве галоўным рэдактарам газеты "Знамя юности". Няйначай, сілы нябесныя паспрыялі...

ЛІМАВЕЦ

Да пашлі ж ты, Божа, Праўду сваю тую
З неба на зямельку, слязмі залітую!
Пасылаў Ты Сына, Яго не пазналі,
Мучылі за праўду, сілай паканалі;
Пашлі ж цяпер Духа...

Ф.БАГУШЭВІЧ

Алесь ЖАМОЙЦІН

"ДА БУДЗЕ ВОЛЯ ТВАЯ!.."

ФІЛАСОФСКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНАЕ ЭСЭ

...Піфагор вучыў, што мы творым свой лёс, выкарыстоўваючы ў дзеянні сваю волю. І прынцып: мая хата з краю, а ўсе астатнія — хай хоць пагаловяцца — накіраваны супраць закона касмічнай эвалюцыі. Гэты прынцып увагналі нам у свядомасць уладары на зямлі. Справа ў тым, што, праяўляючы сваю долю і працуючы на карысць людзей, нацыі, дзяржавы, чалавецтва, мы працуем на карысць эвалюцыі; працуючы толькі для сваёй карысці, — сілкуем толькі свой эгаізм і творым інвалюцыю.

У кожным чалавеку на зямлі закладзена, як, прыкладам, у камп'ютэры, сем праграм патэнцыяльнай рэалізацыі па прынцыпе ўзыходзячай лесвіцы з сямю прыступкамі. Складанасць гэтых праграм вызначаецца таксама па ўзыходзячай — ад прасцейшых рухаў і ведаў да ўсемагутнасці і спазнання таямніц Сусвету. Уключэнне адбываецца пры дасягненні адпаведнага ўзроўню духоўнага развіцця асобы і стану энергаправоднасці нерваў у целе. І над усім і ва ўсім Бог — як гарант рэалізацыі кожнай асобы, народа, нацыі, дзяржавы, Зямлі,Сусвету. Менавіта гэта з'яўляецца часткай ісціны, якая складае тайну сямі зорак, апісаных у Новым Запавеце. І калі ты скончыў сваё жыццё на Зямлі на ўзроўні трэцяй праграмы — жывёльны стан развіцця, — то пры наступным нараджэнні прыйдзеш на свет менавіта на такім жа ўзроўні; і ад тваёй свабоднай волі будзе залежаць, ці ўдасканаліцца духоўна і ўзняцца на прыступку вышэй, ці застацца зноў-такі на той самай да смерці ў целе і г. д. на вечным Коле нараджэння і смерці, пакуль не ўзыдзеш на сёмую прыступку духоўнай лесвіцы і не ўвасобіш у сабе падобнасць Богу. І тады гэта яшчэ не будзе тваім заканчэннем шляху на Зямлі, бо мэта адной асобы — гэта частка вялікай задачы — узняць на духоўнай лесвіцы ўсё чалавецтва, з'яднаць яго ў энергетычнай еднасці Сусвету і пераадолець канчаткова супраціўленне матэрыі. У адрозненне ад мінулых тысячагоддзяў, эвалюцыя ў наш час адбываецца ў вельмі сціслыя тэрміны, таму шмат чаго дзіўнага сёння нам давядзецца ўспрыняць заўтра як звычайнае і зразумелае. Вышэйсказанае не азначае, што ўсе людзі — робаты і ўключаюцца Богам па аднолькавай схеме... Зусім не! Кожны чалавек — гэта непаўторнае стварэнне і ў целе, і ў Духу, развіццё яго афарбавана глыбокай індывідуальнасцю; шлях узыходжання поўнасцю залежыць ад праяўлення свабоднай волі. Толькі энергетычны рэжым на духоўнай лесвіцы ўзрастае па прынцыпе здольнасці нерваў вытрымліваць максімальную напругу прасторавай энергіі, якая выпраменьваецца з невымоўнага Цэнтра ва ўсе бакі Сусвету і якую мы называем — "БОГ". У Сусвеце дзейнічае прынцып шкалы частот — ад нізкіх матэрыяльных — да высокіх, духоўных. Але для большай нагляднасці мы складзем шкалу вытрымкі нервамі напругі току. Напомнім, што ёсць сем патэнцыяльных праграм рэалізацыі. Шкала адпаведнасці праграм і максімальнай адпаведнай напругі нерваў будзе выглядаць прыблізна так: 1 праграма — 1,5 в; 2 пр. — 5 в; 3 пр. — 9 в; 4 пр. — 12 в; 5 пр. — 120 в; 6 пр. — 220 в; 7 пр. — 380 в. Чалавек не толькі праводзіць прасторавую энергію па нервах, але здольны трансфармаваць яе і выпраменьваць, згодна закону фізікі, што электрычнае поле мае тэндэнцыю электрызаваць аб'екты паблізу яго. Чым больш высокадухоўны чалавек, тым большае і значнае высокаэнергетычнае выпраменьванне і ўздзеянне. У гэтым заключаецца прычына сацыяльных паводзін людзей, прычына сімпатый і антыпатый.

Мы не задумваемся, чаму заўсёды ў гісторыі людзі і паважалі і баяліся прарокаў?.. Прарокі знаходзяцца на шостай прыступцы духоўнай лесвіцы. Уявіце сабе, што на людзей, якія прывыклі праводзіць праз свае нервы не вышэй 12 в, аказваецца пастаяннае энергетычнае ўздзеянне напругаю 220 в. У такім электрамагнітным полі нізкадухоўныя людзі пачуваюцца даволі дыскамфортна. Тыя з іх, хто быў у непасрэдным кантакце, ужо не могуць працаваць у звыклым рэжыме сваіх праграм, яны абуджаюцца, і, выкарыстоўваючы сваю свабодную волю ў дзеянні, узыходзяць па духоўнай лесвіцы вышэй. Але "ўладары", "Кесары", не зацікаўлены ў духоўным узыходжанні людзей, бо духоўнымі трэба і кіраваць духоўна, а большасць уладароў часцей за ўсё прадстаўляюць "нізкую пробу"; яны ўсімі сіламі і сродкамі імкнуцца знішчыць прарока фізічна, каб ліквідаваць пагрозу разбурэння зладжанай сістэмы гвалту і прымусу над кожным і над усімі. Уладары памылкова мяркуюць, што калі чалавека зніштожыць фізічна, то знікнуць і яго ідэі. Але закон дзейнічае наадварот: прымусовая, гвалтоўная смерць толькі памнажае моц і жыццяздольнасць ідэй носьбіта. Самым яскравым прыкладам для ілюстрацыі гэтага закона з'яўляецца Ісус Хрыстос — Сын Бога, які кінуў выклік уладзе кесара на зямлі. Энергетычнае ўздзеянне такіх высокадухоўных асоб, хоць яны і прымусова сыходзяць з матэрыяльнага плана, закладваецца ў падсвядомасці людзей і затым праяўляе сябе на працягу вялікага прамежку часу. Калі гэта ўздзеянне слабне, на Зямлі зноў у розных кутках з'яўляюцца высокадухоўныя асобы і прыносяць сябе ў ахвяру на крыжы матэрыі дзеля абуджэння чалавецтва; і гэты працэс няўхільны да той пары, пакуль чалавецтва не ўздымецца да сёмай прыступкі духоўнай лесвіцы. Акрамя ўздзеяння на ўзроўні падсвядомасці, ад вялікіх Настаўнікаў застаюцца духоўныя вучэнні ў кнігах, якія можна зразумець толькі згодна з законам адпаведнасці — гатова твая свядомасць успрыняць ісціну — успрымеш; калі не гатова — усё прачытанае застанецца містычным туманам. Возьмем для прыкладу вучэнне Ісуса Хрыста і хрысціянскую царкву. Царква, якая амаль заўсёды выступала ў хаўрусе з уладамі на Зямлі, ператварыла святыні і храмы не ў асяродкі спасціжэння духоўных ісцін, а ў "ВПШ" для вывучэння жыццёвага зямнога шляху Ісуса Хрыста...

Чаму ж такая боязь дапамагчы народу спасцігнуць духоўныя ісціны?.. Бог — гэта крыніца боскасцага святла, якое выпраменьваецца з невымоўнага Цэнтра ў выглядзе пульсуючых высокачастотных вібрацый. Усе дзеянні, усе праяўленні свабоднай волі, згодна з гэтай плынню, маюць назву "дабро"; усё, што накіравана супраць духоўнага святла, носіць найменне "зло", "цемра". Узвысіць чалавека духоўна — значыць, адчыніць яму доступ да сапраўдных Ведаў, падключыць да высокадухоўных вібрацый і рытмаў, бо асноўная прычына зла на Зямлі ідзе ад невуцтва. Уважліва прыгледзімся да гісторыі дзяржаў і народаў. Ці была на Зямлі дзяржава, у нашым абсягу памяці, якая прызнавала галоўнымі для чалавека дысцыпліны Прыгажосці, Любові і Ведаў?.. І не толькі прызнавала, але і рэалізоўвала іх на практыцы для ўсіх сацыяльных слаёў? З ростам насельніцтва на Зямлі патрабавалася толькі адна галоўная дысцыпліна — прымус!.. Хаця асноўны прынцып будовы Сусвету — гэта прынцып свабоднай волі!!! Хто атаясамляецца з Прыгажосцю, той не можа тварыць паскудствы, у тым ліку і ў маральным плане. Чалавек, прырода якога — прыгажосць, не можа не быць добрым чалавекам, калі ён атаясаміўся з гэтай Прыгажосцю. Адмаўленне Любові — гэта нянавісць. Хто атаясамляецца з Любоўю, вычэрпвае здольнасць ненавідзець, і, значыць, болей не можа ісці шляхамі нянавісці.

Для большасці ж уладароў на Зямлі выгадна было, і застаецца яшчэ і сёння, каб падуладныя народы ўяўлялі сабою паслухмяную, неадукаваную масу на ўзроўні 3-й, жывёльнай праграмы развіцця. Для гэтага трэба запалохаць усіх разам і кожнага паасобку, давёўшы ўзровень жыцця да галечы; сканцэнтраваць у руках нямногіх матэрыяльныя сродкі для існавання. Ізаляваць, купіць або знішчыць прадстаўнікоў духоўнага ўзроўню: пазтаў, кампазітараў, мастакоў, вучоных і г. д., якія заўсёды з'яўляюцца нявыгаднай для параўнання супрацьлегласцю духоўнаму ўбоству "ўладароў" і "ўладарыкаў". У дзяржавы, з яе сённяшнімі законамі і будовай — антыэвалюцыйная сутнасць, антыбоская; дзяржава толькі прыкрываецца высокімі ідэаламі дабра, але не рэалізоўвае іх на практыцы так, як належыць. Мы жывём у эпоху найбольшай прывязанасці чалавецтва да матэрыі на фоне ўзрастаючага духоўнага абуджэння. Давайце разгледзім нашыя з вамі патэнцыяльныя магчымасці ўдасканалення па схеме: Бог — чалавек — сям'я — нацыя — дзяржава — чалавецтва. У духоўных вучэннях сказана, што БОГ — над намі і ва ўсім. У нас саміх столькі боскасці, колькі свядомасці пэўнага ўзроўню развіцця. І заўсёды ёсць магчымасць "колькасць" гэтай боскасці памножыць, спасцігаючы законы Прыгажосці, Любові і Ведаў. Акружаючая нас рэчаіснасць — гэта праекцыя нашага ўнутранага свету, свету нашай душы, нашага "я". Прыгажосць, Любоў, Веды гэтага ўнутранага свету выпраменьваюцца на людзей і здольны дапамагаць ім станавіцца лепшымі. І нам проста неабходна перш за ўсё акрэсліць і ўзважыць сваю ўнутраную сутнасць па шкале духоўнасці і вырашыць назаўсёды: або тварыць дабро і ўзыходзіць, або смеццем заміначь на шляху эвалюцыі чалавецтва.

Асноўная сіла на шляху ўдасканалення — гэта свабодная воля. У залежнасці ад нашых памкненняў і сутнасці воля дзейнічае як добрая і як злая. Але перш за ўсё трэба яе адчуць у сабе як нейтральную сілу, а гэта няпроста. Усе намаганні дзяржавы з яе шматвекавой практыкай накіраваны менавіта на падаўленне свабоднай волі. І, як гэта ні парадаксальна, царква таксама дапамагае гэтаму, прывіваючы вернікам страх перад Богам, а не вучачы шукаць у сабе боскасць, паважаць яе ў сабе і ў акружаючых. Бо чалавек настолькі можа зразумець і прыняць Бога, наколькі ён сам ім з'яўляецца. Усё астатняе будзе проста ідалапакланеннем. Дапусцім, у нейкі момант мы адчулі сваю свабодную волю. Наступным крокам удасканалення будзе праявіць яе, праверыць на вытрымку і дзеянне. Гукараздзельнае маўленне і сцвярджальны ці адмоўны жэст — гэта першае праяўленне волі. І вось тут для беларуса дзяржава і царква выступаюць як антыбоскія сутнасці. Аказваецца, па дзяржаўных і царкоўных няпісаных законах беларус ад нараджэння пакрыўджаны Богам, яго мова недасканалая, вусная народная традыцыя не адпавядае сучаснасці і застаецца — для выражэння сваёй волі трэба карыстацца чужой мовай. Ну, а паколькі маўленне — гэта акт выражэння свабоднай волі, то, выходзіць, і волю трэба прымаць... чужую. Вось тут і пачатак, і прычына нашай нацыянальнай хваробы — бязбацькаўшчыны, нашай аморфнасці, "памяркоўнасці"; таму што псіхічны надлом асобы і блакада натуральных паводзін пачынаецца з маленства. Да васемнаццаці гадоў гэта пераходзіць у комплекс няпоўнавартасці, які выклікае пры напаміне пра такое духоўнае калецтва або рэзкую агрэсіўнасць, або поўную рахманасць і абыякавасць. Вярнуць такога чалавека да натуральнага волевыяўлення можна толькі глыбокім стрэсам на фоне дадатных ці адмоўных пачуццяў.

Вялікі Францішак Скарына заклікаў нас браць прыклад з пчолаў: "...пчолы бароняць вуллі свае..." Так, нацыя — гэта вялікая сям'я, і ад упарадкаванасці ў нашай хаце — у вялікім нашым вуллі — залежыць жыццяздольнасць нас усіх. Пчала без свайго рою можа пражыць не больш дзвюх гадзін і гіне. Мы ж, беларусы, запусціўшы свой вулей, не маючы "маткі", напладзіўшы трутняў сваіх, і, панапускаўшы чужых, на працягу двух стагоддзяў яшчэ не згінулі?! Ну, — гэта вялікае дзіва! Гэтак умеюць, мусіць, толькі беларусы...

То раз мы такія трывалыя і перажылі два стагоддзі невыносных пакут і прынжэння, то для нечага вартага захаваў нас Бог на Зямлі. Значыць, на нас ускладзена вельмі важная місія — раз мы такія жывучыя і загартаваныя, ды жывём, да таго ж, у самым цэнтры Еўропы. Усяго мы пакаштавалі даволі: і мяча, і бізуна; і, можа, настаў ужо час пакаштаваць хлеба духоўнага, якога мы ў сваім вуллі за шматвяковую гісторыю назбіралі дастаткова, але жывіліся ім толькі нямногія з нас, самыя смелыя і адважныя, якія не баяліся забароны і клікалі нас за сабою; але мы баяліся трутняў, баяліся саміх сябе — іншых, лепшых; і часам па загадзе трутняў бэсцілі ці выганялі нашых смельчакоў; смельчакі, праўда, знаходзіліся новыя.., а мы маўчалі і баяліся, бо мы — гэта не мы, а нехта чужы ў нас... Надышоў час, калі ўжо нельга адкрыта выкарыстоўваць прымус, — свет змяніўся; "уладары і ўладарыкі" пачынаюць гульню ў "свабодныя" выбары новай улады, наперад ведаючы, што мы — баязліўцы і памяркоўныя паслухмянцы, прагаласуем за таго, каго яны нам падсунуць як самага лепшага кандыдата; напалохаюць яшчэ, што калі яго не выберам, то верх возьме нацыяналіст, які ўсіх нас назаўтра кончыць... Прыйшоў час прыгледзецца да людзей нашых духоўна вышэйшых, да тых, каго ненавідзяць і бэсцяць трутні ў нашым вуллі за шчырае сэрца, за любоў да зямлі роднай, за высокі розум; да тых, хто зможа пераўладкаваць нашу дзяржаву, каб была яна ад Бога і за Бога, сапраўды, а не на словах; каб зажылі мы, нарэшце, з вамі па-чалавечы, а не як скаціна, якую гоняць бізуном то на Усход, то на Захад; а зямля наша тут, на месцы, і нам самім яе парадкаваць. У кабіну для галасавання "дабрадзеі" з вамі не зойдуць, хоць і абступяць яе шчыльна, і ўсміхацца наперад будуць ветліва, але ў кабіне мы застанёмся сам-насам са сваёй воляй, хоць і нязначнай паасобку, але магутнай, калі дружна і разам. Успомнім мы тых людзей, якія не кілбасамі заваліць абяцаюцца, а гаспадарамі зрабіць нас на зямлі нашай; каб слова роднае вымавіў — і неназдзекаваліся; каб жыта пасеяў — і не баяўся, што чужынец вытапча; каб хлопца выгадаваў — і не загінуў ён, за азіяцкія "інтарэсы" ваюючы; каб Богу памаліцца, не трэба было перакладчыка!

Вось тады мы зможам даць магчымасць духоўна ўзысці не адзінкам, а большасці; вось тады мы вымавім дружна і магутна на ўвесь свет імя роднае і светлае — БЕЛАРУСЬ!..

ЯК ШМАТ ГАВОРАЦЬ ГЭТЫЯ ІМЁНЫ...

Адзін з чарговых тамоў серыі "Скарбы сусветнай літаратуры", якая выходзіць у выдавецтве "Мастацкая літаратура", калектыўны. Пад адной вокладкай сабраны творы Генры Лангфэла і Уолта Уітмена.

Думаецца, гэтае суседства зусім невыпадковае. Пра гэта згадвае ў прадмове "Час душы" І. М. Тычына: "І паэма Лангфэла, і першае выданне кнігі Уітмена былі апублікаваны ў 1855 годзе... Менавіта ў гэты час у амерыканскім грамадстве абвастрыўся і дасягнуў асаблівага напалу рух за адмену рабства — абаліцыянізм... Амерыканскія пісьменнікі-абаліцыяністы, якія выступалі рашуча супраць усялякага рабства, не толькі выявілі чыста ідэалагічную аснову гэтага руху, але і імкнуліся накіраваць яго ў цывілізаванае рэчышча, надаць справядлівай барацьбе за свабоду і роўнасць людзей з "каляровай скурай" хрысціянскі характар".

Паэма Лангфэла "Спеў аб Гаяваце" падаецца ў перакладзе А. Куляшова, дзякуючы якому і па-беларуску адчуваеш усю непаўторнасць паэтычнага радка, здзіўляючае майстэрства аўтара ў паказе побыту індзейцаў.

Што да творчасці Уітмена, дык у перакладзе Я. Сіпакова прапануюцца вершы, урыўкі і паэмы амаль з усіх нізак, створаных аўтарам за яго доўгае жыццё. "Лісце травы" — гэта таксама пацвярджэнне таго, як шмат можа сказаць творца, калі ён з яўляецца паэтам па прызванні.

Бадай, не лішне нагадаць, што творы Лангфэла і Уітмена прыйшлі да чытача па-беларуску чарговы раз. "Спеў аб Гаяваце" ўпершыню быў выдадзены ў 1969 годзе, а "Лісце травы" пабачыла свет у 1978 годзе.

ЦІ БЫЎ ТАЛСТОЙ У БАРАНАВІЧАХ?

Доўгі час гісторыя маўчала, што ў горадзе чыгуначнікаў быў славуты рускі пісьменнік Леў Талстой. Але наколькі багатая фантазія гараджан Баранавічаў, гаворыць наступная публікацыя ў газеце "Белорусская нива" за 9 красавіка 1993 года. Маўляў, калі Талстой выйшаў на перон у падперазанай палатнянай кашулі, станцыйны жандар прыняў яго за простага селяніна і затрымаў:

"— Куды прэш, барада? — груба прыпыніў яго жандар.

Пісьменнік абурыўся, накіраваўся ў будынак Палескага вакзала Баранавічаў і напісаў там, кажуць, скаргу-пратэст... Сцвярджаецца, што гэтую скаргу чугуначнікі старанна захоўвалі, але ў вайну яна загінула...

Я спецыяльна некалькі разоў прагледзеў усе даты жыцця і дзейнасці Льва Мікалаевіча, шмат літаратуры аб ім. Так, ён быў за межамі Расіі, але ўсё гэта да пабудовы чыгуначных вакзалаў (іх было два. — М. М.) у Баранавічах. Каб быць яшчэ больш упэўненым у сваёй праваце, я напісаў ліст у Маскву свайму сябру, той звярнуўся да спецыялістаў музея імя Льва Талстога, якія адказалі, што аўтар "Анны Карэнінай" ніколі не быў у Баранавічах. Што цікава, і ніводная кніга пра Баранавічы таксама не гаворыць пра знаходжанне ў горадзе Л. Талстога.

На жаль, гэтая недакладнасць трапіла і ў верш А. Л. ікі "На залатым перазвоне", змешчаным летась у "Полымі".

...У Баранавічах Леў Талстой
Персанальна чыгунку шчаслівіў.

Гаварыў аб спагадзе, любві,
Дабрадушны і бараздаты...

Ды ў Баранавічах Талстой усё ж быў, аднак не Леў Мікалаевіч, а Аляксей Талстой. Вось што ён занатаваў, накіроўваючыся ў Італію да Максіма Горкага: "Баранавічы... якімі былі, скажам, гадоў дваццаць таму гэтыя мястэчкі і гарады, з драўлянымі дамкамі, платамі, бруднымі вуліцамі... такімі стаяць і сёння. Прагрымелі вялікія гады, а тут усё стаіць, як стаяла".

Міхась МАЛІНОЎСКІ,
правадзейны член Геаграфічнага таварыства
г. Баранавічы

Спадчына

"БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР"

Пісьменства на Беларусі ўзнікла ў сівой даўніне. За многія стагоддзі нашай нялёгкай гісторыі ў нас стварылася папраўдзе вялікая літаратура, адна з самых багатых і цікавых у свеце, літаратура, якой мы, беларусы, можам па праву ганарыцца.

На вялікі жаль, у сваім поўным аб'ёме яна яшчэ невядомая шырокім колам грамадства. Так, пра яе шмат пісалі нашы літаратуразнаўцы, гісторыкі, многія творы выдаваліся ў нас і перавыдаваліся, асабліва больш блізкіх нам па часе пісьменнікаў. Але гэта ўсё ж былі толькі асобныя перліны, якія мы выцягвалі з вялікага мора нашага пісьменства.

Думаецца, настаў час вярнуць з небыцця гэтую нашу літаратурную спадчыну, без якой мы не можам поўнасцю ўсвядоміць сябе як народ. Акадэмія навук Беларусі ўжо, здаецца, завяршае шматтомнае выданне вуснапаэтычнай творчасці беларускага народа, якое, можна смела сказаць, стала падзеяй сапраўды гістарычнага значэння. Такой падзеяй можа стаць і шматтомнае сістэматызаванае выданне нашай пісьмовай літаратуры.

Думка пра гэтае выданне выспела ў мяне, калі я вывучаў шматмоўную літаратуру Беларусі XVIII і XIX стагоддзяў. Колькі ў ёй цікавага, зусім невядомага нашаму чытачу, важнага для ўсіх нас! Выданне ўсяго лепшага, што было створана на беларускай зямлі ад сівой старажытнасці да нашых дзён, усяго найбольш каштоўнага, таго, што складае залаты фонд пісьменства Беларусі, даўно чакае наш шырокі чытач.

Вельмі прыемна, што ідэю сістэматызаванага выдання лепшых здабыткаў шматмоўнай літаратуры Беларусі падтрымалі прадстаўнікі нашай грамадскасці. У выніку нядаўна ўтварылася прадстаўнічае грамадскае аб'яднанне, што займела назву Міжнародны фонд "Беларускі кнігазбор". Сярод яго заснавальнікаў — дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Серафім Андраюк, генеральны дырэктар Мінскага вытворча-паліграфічнага аб'яднання імя Якуба Коласа Валеры Германаў, старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, дырэктар выдавецкага таварыства "Еўрапейская кніга" Валеры Дубоўскі, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіль Зуёнак, дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН РБ Віктар Каваленка, загадчык аддзела часопіса "Полымя" Анатоль Клышка, дырэктар Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны Адам Мальдзіс, а таксама многія іншыя пісьменнікі, навукоўцы, грамадскія дзеячы, прадпрымальнікі. Прыняты статут аб'яднання, выбрана ўправа фонду, якая будзе непасрэдна ажыццяўляць ідэю.

Управай ужо складзены падрабязны план-праспект "Беларускага кнігазбору" ў дзвюх серыях. Аўтары абедзвюх серый — як ураджэнцы Беларусі, так і іншаземныя пісьменнікі, якія жылі на нашай зямлі ці наведвалі яе, і расказалі пра яе ў сваіх кнігах. Творы, напісаныя на іншаземных мовах (лацінскай, польскай, рускай, яўрэйскай і інш.) ці на стараславянскай і старабеларускай, будуць падавацца ў перакладзе на сучасную беларускую мову. У кожным з тамоў чытач знойдзе грунтоўны ўступны артыкул, неабходныя каментарыі.

У першую серыю ўвойдуць творы мастацкай літаратуры старажытнага перыяду. Чытач сустрэнецца тут з жывым словам Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Сымона Будната, Васіля Цяпінскага, Андрэя Волана, Стафана Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, Лявонція Карповіча, Афанасія Філіповіча, Іасафата Кунцэвіча, Міхалона Літвіна, Андрэя Рымшы, Сімяона Полацкага і многіх іншых. Асобнымі кнігамі выйдуць дзённікі і мемуары даўнейшых пісьменнікаў, творы паэтаў-лаціністаў, нататкі іншаземных падарожнікаў пра Беларусь, нататкі беларусаў пра замежныя краіны, драматургія XVII—XVIII стагоддзяў.

У шматтомнік будуць уключаны ў перакладзе многія творы нашых польскамоўных пісьменнікаў, якія праўдзіва паказвалі жыццё беларуса на скрыжалях гісторыі, раскрывалі асаблівасці сваёй эпохі. Гэта пераважна літаратура XVIII—XIX стагоддзяў. З яе чытач атрымае на роднай мове кнігі Францішка Багамольца, Адама Нарушэвіча, Францішка Князьніна, Юльяна Нямцэвіча, Марціна Матушэвіча, Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Яна Баршчэўскага, Евы Фялінскай, Эдварда Масальскага, Юзафа Крашэўскага, Уладзіслава Сыракомлі, Габрыэлі Пузыны, Ігната і Яна Ходзькаў, Генрыха Ржавускага, Антонія Эдварда Адынца, Адама Плуга, Вінцэся Каратынскага, Ігната Дамейкі, Элізы Ажэшкі, Аляксандра Ельскага, асобныя з якіх, апрача польскай, пісалі і на беларускай мове.

Вядома ж, належным чынам будуць прадстаўлены ў шматтомнай серыі даўно прызнаныя беларускія пісьменнікі XIX стагоддзя Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Лучына, Адам Гурыновіч, аўтары славутых паэм "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе", іншыя нашы пачынальнікі.

З рускамоўных аўтараў, якія так ці інакш былі звязаны з Беларуссю, мяркуецца выдаць асобнымі тамамі творы Паўла Шпілеўскага, Фадзея Булгарына, Юзафа Сянкоўскага, Станіслава Акрэйца, з яўрэйскіх — Мендэлэ Мойхера-Сфорыма і іншых.

Асабліва шырока будзе прадстаўлены ў шматтомніку багатая і разнастайная літаратура нашага стагоддзя — ад Янкі Купалы і Якуба Коласа да сучасных беларускіх пісьменнікаў, чые творы атрымалі ўжо шырокае грамадскае прызнанне.

Вельмі зацікавіць чытачоў і другая серыя "Беларускага кнігазбору" — "Гісторыка-літаратурныя помнікі", кнігі, якія ў дакументальных матэрыялах раскрыюць перад намі тысячагадовую гісторыю Беларусі. У асобных тамах выйдуць беларускія летапісы, трактаты беларускіх філосафаў эпохі Асветніцтва, Статут Вялікага княства Літоўскага, фальклорна-этнаграфічныя працы Саламона Рысінскага і Яна Ласіцкага, этнаграфічныя апісанні Беларусі канца XVIII—першай паловы XIX стагоддзя, працы даўнейшых гісторыкаў, этнографаў, фалькларыстаў, мовазнаўцаў. Чытачы атрымаюць такія, напрыклад, грунтоўныя, ніколі не перавыдаваныя ў нас кнігі, як "Гісторыя літоўскага народа" Тэадора Нарбута, "Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны" Яна Чачота, "Апісанне Барысаўскага павета" Яўстафа Тышкевіча, "Гістарычныя звесткі пра памятныя мясціны ў Беларусі..." Міхаіла Без-Карніловіча, "Гродзенская губерня" Паўла Баброўскага, "Беларускія старажытнасці" Аляксандра Семянтоўскага, "Беларусь — Палессе" Оскара Кольберга, "Віцебская Беларусь" Мікалая Нікіфароўскага, "Беларускі зборнік" Еўдакіма Раманава, "Смаленскі этнаграфічны зборнік" Уладзіміра Дабравольскага", "Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў" Адама Багдановіча, "Беларусы" Яўхіма Карскага, "Віцебская старына" Аляксея Сапунова, "Славянскае жыллё ў паўночна-заходнім краі" Аляксея Харузіна, "Беларускі народ" Міхала Федароўскага, "Беларусы-палешукі" Аляксандра Сержпутоўскага, "Беларусы-сакуны" Ісака Сербава, "Народная культура славян" Казіміра Машынскага, "Рэчыцкае Палессе" Чэслава Пяткевіча, "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" Вацлава Ластоўскага, працы Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, Рамуальда Зянькевіча, Міхала Балінскага, Канстанціна Тышкевіча, Адама Кіркора, Івана Насовіча, Мітрафана Доўнар-Запольскага і іншых. Усё гэта літаратура, якая на працягу не аднаго стагоддзя адкрывала перад светам адзін з самых старажытных і самабытных славянскіх народаў — беларусаў.

Выданне "Беларускага кнігазбору" разлічана не на год і не на два — на дзесяцігоддзі. Распачынаць яго ў наш няпросты час, вядома ж, цяжкавата. На гэта патрэбны немалыя сродкі. Але мы, беларусы, думаецца, ужо дараслі да таго, каб годна паказаць сябе перад светам. Адамкнуць тыя сем замкоў, за якімі схавана наша спадчына, адчыніць тыя сем замшэлых дзвярэй — наш усеагульны абавязак.

Нам, непасрэдным выканаўцам гэтага няпростага пачынання, будзе важна ўсё — і вашыя добрыя парады, дарагія сябры, і канкрэтныя прапановы ў выданні таго ці іншага тома, і фінансавая дапамога. Мы верым, што знойдуцца людзі, цэлыя калектывы, якія захочуць прафінансаваць хоць бы тыя з тамоў, што іх найбольш зацікавяць у плане-праспекце, а, можа, і па-за ім. Выдадзеная на іх сродкі кніга гэтай нацыянальнай бібліятэкі Беларусі будзе іх важкім укладам у нашу культуру, стане іх заўсёдным гонарам і, вядома ж, самай лепшай рэкламай фірмы ці арганізацыі. Імёны ахвярадаўцаў будуць ушанаваны ў кнігах "Беларускага кнігазбору".

Просім звяртацца да нас на адрас: 220034, Мінск, вул. Фрунзе, 5, Дом літаратара, тэл. 36-09-09, 63-99-46. Разліковы рахунак 700911 у філіяле "МінскКомплексбанк" код 734.

Кастусь ЦВІРКА,
прэзідэнт Міжнароднага фонду "Беларускі кнігазбор"

ВЯРТАННЕ ПРАЗ... 140 ГАДОЎ

"Адзін з нешматлікіх даследчыкаў старажытнай гісторыі Беларусі, які ішоў сваім шляхам", — так пісаў пра М. Без-Карніловіча вядомы пісьменнік і даследчык нацыянальнай мінуўшчыны Г. Каханоўскі і пры гэтым дадаваў: "Ён амаль не наследаваў ранейшых вучоных, на многія пытанні гісторыі меў свае погляды, чым цікавы ў гістарыяграфіі, археалогіі і краязнаўстве".

Міхаіл Восіпавіч Без-Карніловіч (10 кастрычніка 1996 года спаўняецца з дня яго нараджэння 200 гадоў) па прафесіі быў ваенным, генерал-маёр рускай арміі. У гісторыю ж увайшоў як аўтар кнігі "Гістарычныя звесткі пра выдатныя мясціны на Беларусі з дадаткам іншых звестак, якія да яе адносяцца", выпушчанай у 1855 годзе ў Пецярбурзе. Гэтае выданне М. Чарнышэўскі лічыў "небескарысным для тых, у каго пад рукамі няма добрага збору кніг па рускай гісторыі".

Правільней было б сказаць — беларускай гісторыі. У гэтым лёгка пераканацца, калі пазнаёміцца з кнігай. Цяпер гэта зрабіць не так і складана. І неабавязкова ісці ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі ці ў якое-небудзь іншае буйное кнігасховішча. Праз 140 гадоў дзякуючы смаленскаму выдавецтву "Алфавіт" кніга М. Без-Карніловіча зноў прыйшла да чытача — ажыццёўлен яе факсімільны выпуск.

Праз мэту, якую ставіў перад сабой аўтар, гаворыцца ў невялікай прадмове, напісанай самім Міхаілам Восіпавічам: "Выдаючы кнігу, я ставіў дваякую мэту: 1) пазнаёміць чытачоў з Беларуссю; 2) даць матэрыял таму, хто возьме на сябе працу зрабіць аб ёй больш падробнае апісанне.

Я прамаўчаў аб некаторых месцах і прадметах, паколькі не меў дастатковых звестак да іх апісання, ці яны нічым не адметныя па гісторыі".

М. Без-Карніловіч, як пісаў той жа Г.Каханоўскі, "з ваенна-пратакольнай пунктуальнасцю апісаў усе больш-менш значныя населеныя пункты Беларусі, пад якой разумеў толькі Віцебскую, Магілёўскую і заходнія паветы Смаленскай губ." Тым самым, з'явілася кніга пра Беларусь і беларусаў. У ёй надаецца вялікае значэнне дзяржаўнасці старажытнага Полацка, прыводзяцца дадзеныя, звязаныя з гісторыяй Магілёва, Віцебска. М. Без-Карніловіч першым прыўзняў заслону таямнічасці над гісторыяй горада Друцка (іншая назва Дручаск). І, вядома ж, у кнізе згадваюцца дзесяткі невялікіх населеных пунктаў.

Прываблівае і тое, што ў "Гістарычных звестак..." ёсць цікавыя згадкі пра побыт народаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі і, у першую чаргу, пра саміх беларусаў. З асаблівай павагай аўтар ставіўся да сялян: "беларускі селянін, калі ён сыты, апрануты і не абцяжараны работай — вясёлы, добры, разгаворлівы, працалюбівы". У "Нарысах беларускіх сялян" прыводзяцца народныя прыкметы, згодна якім можна прадказваць надвор'е.

Т. Т.

Сярод кніг

КНІЖКА ШЧАСЛІВАГА ЧАЛАВЕКА

Калі я ўжо раздумваў, як больш эканомна пачаць гаворку пра кніжку звышэканомных сатырычных мініяцюр Марціна Коўзкага, прыйшоў новы нумар "ЛіМа", дзе была чарговая публікацыя з яго "Доляй праўды". І я зразумеў: такая яго доля, такая наша доля, што хопіць яму пісаць "Долю праўды" (горкай праўды!) да канца дзён сваіх.

Сярод мініяцюр сустрэлася і такая балюча-пякучая, як удар самастрэла пад сэрца:

"Здаемся на літасць Масквы, не дбаючы аб прыстойнасці. У памяць аб самастойнасці пакідаюць нам сімвал адзіны — розніцу ў гадзіну між Мінскам і Масквою. Затое за тую гадзіну стаяць будзем, як за Радзіму".

Здавалася б, пісьменнік належыць да цэха сатырыкаў-гумарыстаў (падкрэсліваю — і гумарыстаў), але чаму ж мне, чытаючы і перачытваючы яго мініяцюры, мала дзе хочацца нават усміхнуцца? Як, напрыклад, з такога каламбуру: "Не кожны Сакрат мае сваю сакратарку". Няма ў яго карацелек-карамелек, ад якіх у роце і ў шлунках адна прыемнасць, і страўнасць паляпшаецца, і гыгыкнуць можна, нібы пяткі паказыталі. (Коўзкі, нібы іранічна пасміхваючыся з мяне, падказвае: "Добры жарт не чапляе, а кранае"). Дык мо ў пісьменніка запанаваў так званы "чорны гумар", а калі і ёсць смех, то вось такі — праз слёзы?

Мабыць, не. І хоць некалі ў яго "Незўклідавай геаметрыі" (калектыўны зборнік гумару "І ў хвост, і ў грыву", 1976) было больш вясёлых усмешак, слоўных перакулек-каламбураў, але і тады, ледзь не дваццаць гадоў назад, былі ўжо творы, што прымушалі ўздрыгваць, як ад току — хоць і не высокага напружання, але дастатковага, каб працяць сэрца, прасвятліць глузды ды прымусіць задумацца — нават таго, хто даўно ўжо адвык ад такой нагрузкі і думае, што "галава ў яго працуе: гумку жуе".

Што ж, сівеем-мудрэем... Мо якраз той выпадак, калі можна ўспомніць Вахтанга Кікабідзе: "Мае гады — маё багацце" (зноў уплішчваецца Коўзкі: "Яе гады — яе багацце", — расхвальвала нявесту свацця"). Ва ўсякім разе якасныя зрухі ў творчасці Марціна Коўзкага відавочныя. Мо сам час, дні сённяшняга жыцця паўплывалі? Бо што ні кажы, а сатырыкам-гумарыстам зрабілася вальней у самавыяўленні, выказванні сваіх думак. (Во, зноў Коўзкі штурхае пад локаць: "— Як вывесці мне формулу свабоды? Як рознасць між калючкамі і дротам? Калючкі ж гэтаксама дрот? — Дык і свабода — сума несвабод"). Даступнымі сталі тэмы, якія раней мо толькі сніліся, але нават і ў сне людзі азіраліся і заглядвалі пад ложак: ці не падслухоўвае хто, не віжуе?

"А хто там ляжыць па ярах, па лагах, з рэвальвернымі кулямі ў галавах? — Беларусы. — А чаго ж, чаго так хацелася ім, акрыялым душой ды сляпым, глухім? — Людзьмі звацца".

Чытаеш такое наследаванне класіку і робіцца вусцішна-жудасна, і ў галаву не прыходзіць вызначаць жанр твора.

Крылатымі ўжо сталі словы Анатоля Вярцінскага пра кожнага чацвёртага, які загінуў у Беларусі ў мінулую вайну. Але ніхто, здаецца, да Міхася Барысавіча Марцінкоўскага (адсюль і псеўданім) не сказаў так выразна пра **іншага** кожнага чацвёр-тага:

"Кожны чацвёрты, кожны чацвёрты... Я пра жывых, не пра мёртвых. Жывых, але страчаных, абруселых, апалячаных, пасеяных на Поўначы і за Уралам. Зеўраць, Беларусь, твае прагалы: кожны чацвёрты, кожны чацвёрты..."

Да гэтай вельмі блізка падступае сваёй скіраванасцю другая мініяцюра:

"Не заваёўваў нас Ярмак, свайго не мелі мы Багдана, узятых гвалтам, не каханых, нас прыядналі проста так. Хоць Бог вучыў: шануйце слова, народ, што выбару не меў, загаварыў чужою мовай, загаманіў і анямеў. І гэтак быў заваяваны без Ермака і без Багдана".

Хто, як і я, сачыў за творчасцю Марціна Коўзкага, можа сказаць, што гэтыя рэчы — чыстая публіцыстыка, прытым "ад сябе" і "ў лоб". Яна не характэрная для яго як майстра мудрых выслоўяў-карацелек, афарызмаў, у якіх такая шматпластавасць падтэксту, такая загушчанасць зместу, нібы ў касмічна-зоркавым звышрэчыве, дзе вага напарстка — сотні і тысячы тон (Коўзкі: "Коратка пра афарызм? Сцісласць не спосаб пісаць, а спосаб мысліць"). У такім выпадку я запярэчу: ды чаму ж не характэрная? У кожным творцы, сапраўдным пісьменніку павінна быць шмат творчых граней. Ён можа і павінен паварочваць сваё сціло так, як патрабуе душа, каб выкласці яе цудоўныя парывы як мага больш дакладна, выразна, яскрава. "Дайце слова скамароху, хай блазнуе, хай пяе, мо праславіць ён эпоху тым, што высмяе яе" — і такі вось яшчэ варыянт творчасці як запасную пазіцыю-акоп прапануе Марцін Коўзкі. Сам, праўда, да гэтага яшчэ не сыходзіў (ці не ўздымаўся?).

Многія мудраслоўі Марціна Коўзкага, здаецца, прараслі на вопыце ўсіх часоў і народаў і ў той жа час на нашай сучаснай глебе, яны вельмі стасуюцца да нашых палітыкаў і палітыканаў самага высокага рангу. Да прыкладу:

"Велічыню пустога месца вызначае акружэнне".

"Адзін гіне за веру, другі нішчыць за веру. Хто, бацюхна, большага варты даверу?"

"Тыя, што абганяюць, заўсёды ў кагонебудзь ззаду".

"Трэба мець талент, каб не паказваць сваю бяздарнасць".

"Хто асуджае дальнабачных? Блізарукія".

"Нёс адказнасць, як курыца яйкі, — з кудахканнем".

І г. д. і да т. п. Цытаваць аўтара можна бясконца.

Чытаеш такія выслоўі — і толькі гмыкаеш, уяўляючы канкрэтных асоб. Па-шляхецку ўсё сказана пісьменнікам, "з рызыкай, з усялякай далікатнасцяй і ўсё такое" (блаславёнай будзь, "Паўлінка"!). І афарыстычна, і мудра, і бачыш, што Марцін Коўзкі такі ж дасціпны, як і раней. Зноў у яго рэчах словам цесна, а думкам прасторна, зноў глыбіня, якая не паддаецца вымярэнню ніякімі лотамі. Зноў важкасць такая, што некаторыя шматтомныя зборы твораў не пераважаць жменькі яго афарызмаў (і баек, сентэнцый, крылатых выразаў, мудрых усмешак і нават... балад, арганізаваных рытмічна і ўзятых на цвікі рыфмаў). І ловіш сябе на думцы, што сам не здолеў бы прыдумаць ніводнай карацелькі — не такі склад розуму. І дарма аўтар-эквілібрыст Марцін Коўзкі падбадзёрвае чытача: "У афарызме, як у цыркавым нумары, усё павінна быць дакладным і простым, каб кожны мог зразумець: на гэткае ён здольны і сам". Ды не, спадар Коўзкі, не кожны здольны на такое!

У беларускай літаратуры, здаецца, і блізка няма такіх, хто змог бы паспаборнічаць з нашым "майстрам злаквенцыі", мо хіба толькі паляк Ежы Лец. Але нашто нам Ежы Лец, калі тутэйшы ёсць жылец, не меншы за таго мудрэц?

І зноў, нібы падслухаўшы мае думкі ці падгледзеўшы напісанае, падсыпае Марцін Коўзкі табакі: "Не крыўдна, калі абганяюць. Крыўдна, калі абыходзяць".

А чаму Марцін Коўзкі дасюль не ў шэрагах Саюза пісьменнікаў? — пытаюся я. "Мала напісаў", — могуць сказаць некаторыя. "Не ўпісваецца ён неяк у рамкі", — заўважаць другія. "Хе-хе-хе, — сказаў бы на камісіі Марцін Коўзкі. — У рамках добра трымаюцца толькі партрэты"...

Павел МІСЬКО

Марцін Коўзкі. Доля праўды. Сатырычныя мініяцюры. Мінск, "Мастацкая літаратура", 1995.

МОЎНЫЯ СКАРБЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

Заслужаны настаўнік Беларусі Апанас Пятровіч Цыхун усё жыццё прысвяціў служэнню сваёй зямлі. Абараняў Бацькаўшчыну ад нашэсця чужынцаў у часы ваеннага ліхалецця, колькі ставала сіл — абараняў беларускае слова ад сваіх чужакоў у мірны час. І сёння, на дзевятым дзесятку, ён увесь у руху. Апанаса Пятровіча часта можна бачыць сярод студэнтаў, настаўнікаў, бібліятэкараў, святароў, з якімі ён дзеліцца жыццёвай мудрасцю, выступае з уласнымі вершамі, заклікае шанаваць пачуццё нацыянальнай годнасці.

Акрамя асветніцтва, патрэбай, унутранай неабходнасцю стала для А. Цыхуна краязнаўства. Дзякуючы яго артыкулам, шырокая грамадскасць даведалася пра многіх выдатных сыноў Гродзеншчыны (М. Пачобута-Адляніцкага, І. Легатовіча, А. Баліцкага, К. Якаўчыка, А. Грыгаровіча, М. Краўцова, Г. Капыцкага і інш.). Энтузіяст і нястомны шукальнік, ён зрабіў вельмі многа ў розных напрамках лінгвістычнага краязнаўства. У вёсцы Лаша Гродзенскага раёна сваімі рукамі стварыў музей Я. Карскага, напісаў і выдаў кнігу "Акадэмік з вёскі Лаша Я. Ф. Карскі" (Гродна, 1992), падрыхтаваў да друку альбом, прысвечаны вучонаму.

Але самай важнай можна назваць кнігу "Скарбы народнай мовы (З лексічнай спадчыны насельнікаў Гродзенскага раёна)", выдадзеную ў 1994 годзе ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Матэрыялы да яе збіраліся яшчэ ў 1939—1940 гадах, але асноўная частка была запісана ў пасляваенны час. Змест кнігі складаюць слоўнік рэгіянальнай лексікі (да 10 тысяч лексем), каля тысячы ўстойлівых народных выслоўяў, назвы населеных пунктаў, тапонімы, гідронімы басейна ракі Свіслач — прытоку Нёмана.

Відаць, няма ў Гродзенскім раёне вёскі, мястэчка, куды б не завітаў за сваё жыццё Апанас Пятровіч. І дзе б ні быў, заўсёды цікавіўся мясцовым бытам, культурай, традыцыямі сваіх землякоў, з прагнасцю ўслухоўваўся ў жывую гаворку і запісваў яе.

Лексічны слоўнік атрымаўся надзвычай цікавы і каштоўны. Мне даводзілася яго чытаць яшчэ ў рукапісе і цяпер, ужо ў кнізе. І кожны раз немагчыма адарвацца ад старонак. Незвычайная прыцягальнасць слоўніка абумоўлена тым, што ў яго ўключаны словы, якія адсутнічаюць у літаратурнай мове або адрозніваюцца ад літаратурных формай ці значэннем. Такі прынцып укладання дазволіў сабраць разам многа арыгінальных, часта малавядомых дыялектызмаў. Сярод іх шмат вобразных, гаваркіх і экспрэсіўна афарбаваных адзінак, напрыклад: *аблахманіцца* — абадрацца, знасіць вопратку; *акрыванка* — вялікая хустка, якой жанчыны акрываліся ў непагадзь; *жалопкаць* — прагна піць; *скудлаваць* — замучыць, затармасіць; *сухавейка* — бяссмертнік; *цветабой* — пара цвіцення раслін.

Большасць лексем, што знайшлі месца ў слоўніку, маюць адпаведнікі ў літаратурнай мове і нярэдка выглядаюць больш прывабнымі, чым літаратурныя: *абойчык* — ключыца, *селька* — мансарда, *зімагор* — бабыль, *слухаўкі* — навушнікі.

Лексіку нацыянальнай мовы ўзбагачаюць словы, для якіх няма літаратурных эквівалентаў. Гэта дэталізаваныя назвы прадметаў, з'яў, а таксама этнаграфічныя дыялектызмы — словы, што называюць мясцовыя прадметы, бытаванне якіх абмежавана пэўнай тэрыторыяй: *боўт* — шост, якім наганяюць рыбу; *вымаклі* — пасевы, якія загінулі ад празмернай вільгаці; *зліпак* — хлеб з клейкім мякішам; *злядаваць* — пакласці на воз бервяно пры дапамозе ляды; *зубаць* — правяраць яйка на моц лёгкім пастукваннем аб зубы; *крышчыны* — астаткі ў дзежцы пасля хлебнага квасу; *ляваш* — далёкія ад сядзібы палеткі ворнай зямлі, на якія не далі гною; *скляпіцца* — пакрыцца тонкім лядком; *цалякі* — цэлае зерне, што трапляецца ў муцэ пасля памолу; *брылік* — посуд, сплецены з саломы і лазы для вымярэння і рассявання збожжа; *гуда* — мянушка беларусаў, якія жывуць у ваколіцах Друскенікі — Парэчча; *запрута* — драўляны шпень (з завостраным канцом) для вязання снапоў; *калач* — круглая палка, падвешаная на шыю карове, якая б'е па нагах і не дае хутка бегаць, і інш.

Шырока пададзена ў слоўніку спецыяльная лексіка, звязаная з народнай гаспадаркай, прафесіямі, рознымі галінамі ведаў, напрыклад, батанікай: *дзевяціранка, жыватабольнік, сухадрэўка;* заалогіяй: *аціца, ведзьма, дзяргаўка, крумкі;* медыцынай: *завалкі, задратаваць;* тэхнікай: *дронг, керат;* астраноміяй: *воз, сіцечка;* кулінарыяй: *лазанкі, квасніК, сампорык;* сталяркай, бандаркай: *закладнік, дупёлка, задзёрыч;* ткацтвам, прадзівам, шыццём: *кабылка, стрыца, стаўбуноўка;* плытагонствам: *згон, гарно, цаль* і інш.

З асаблівай увагай ставіцца А. Цыхун да абрадавай лексікі — назваў свят, гульняў, забаў, забабонаў і да т. п. Пры тлумачэнні яе часам выходзіць за межы чыста лінгвістычных стэрэатыпаў, уносіць у дэфініцыю элементы энцыклапедычнага апісання, што з'яўляецца каштоўнай інфармацыяй для этнографаў:

Адбіяна, ж. Звычай у час танцаў: хлопец падыходзіць да пары танцораў, пляскае ў далоні, кажучы "Адбіяна"; танцор павінен быў затрымацца і аддаць сваю партнёрку, а сам выйсці з кола (быў пашыраны да 1939 года і з'яўляўся прычынай для абразы і боек).

Незвычайнасць слоўніка ў тым, што ён ствараўся на працягу доўгага часу — паўстагоддзя. Шмат якія словы, запісаныя ў мінулым, сёння ў гаворках выкарыстоўваюцца пасіўна, а некаторых ужо і зусім не пачуеш. Лінгвістычная навука павінна быць удзячная А. Цыхуну, што ён не даў згубіцца ім, данёс да нас гэтыя маленькія помнікі лексікі. Некалькі слоў, якія ў слоўніку маюць памету "ўстарэлае": *залёга* — не выплачаны ў тэрмін падатак, *каток* — узятае без дазволу гаспадара збожжа, *квэстар* — жабрак, які хадзіў па людзях з бібліяй, *комшч* — звязак анучаў, якім у курнай хаце затыкалі адтуліны для дыму, *устэрня* — вялікі будынак у панскім маёнтку, у якім жылі парабкі, *цукернік* — прадавец цукерак.

Не абыдзены ўвагай і пазычанні з іншых моў, пераважна з польскай, нямецкай, яўрэйскай, літоўскай: *адвэнт* — вялікі пост у каталікоў перад калядамі, *гнэмбіць* — мучыць, катаваць, здзекавацца, *кольчыкі* — завушніцы, *гельд* (іран.) — грошы, *фах* — спецыяльнасць, прафесія, *хала* — здобная булка, якую пяклі яўрэі на свята.

Асобна хочацца сказаць пра ілюстрацыйную частку слоўніка. Чытаючы прыклады-сказы, якія паказваюць жыццё слова ў кантэксце, акунаешся ў стыхію народнай гаворкі з яе спецыфічна-непаўторным сінтаксісам, фанетычнымі і марфалагічнымі адметнасцямі. Апанас Пятровіч імкнуўся падабраць з ліку запісаных такія сказы, якія не толькі ілюструюць сэнс і ўжыванне слова, але і раскрываюць асаблівасці маралі, быту, матэрыяльнай і духоўнай культуры мясцовых людзей: Калі не дасі сляпому жабраку, та табе самой земкачэ [вочы] выпра; Наш тато заўсёды адходжваўсо да цямна, а вечарам плёў кошыкі альбо вязаў волак. Многія з іх аздоблены прыказкамі, фразеалагізмамі, загадкамі, народнымі прыметамі, урыўкамі песень: Хлеп, як ляпняк, але, як кажуць, хлеп ні нявеста, які ўдоўсо, такі і з'есца; Гэ, гэты чалавек пражыў свой век крэнтам-бэнтам, хіба ш што ён рабіў? Гыля, гыля, шэры гусі, гыля, гыля ў лебяду. Павязалі галованьку — дый да дому ні прыду (з нар. песні).

У раздзеле кнігі "Устойлівыя выслоўі" змешчаны прыказкі і фразеалагізмы. Значная частка іх яшчэ не фіксавалася беларускімі дыялектнымі і літаратурнымі слоўнікамі: А ў Лашы людзі нашы, як ухопяць, так і ўтопяць; Вывучыць праз качаргу скакаць; Дзе далінка, там і хлеба асьмінка; За анучу падняў бучу; З працы не паставіш палацы, а толькі горб нажывеш; Каб не затыкі ды датыкі, та і сарока кросна ткала б; Люлі, люлі, дзіця, спаць, адна матка — бацькоў пяць; Па-шляхоцку — папалам клёцку, а ў мужыцкім шчоце — па тры клёцкі ў роце; Ранак — панак; Свістаў, пакуль дастаў, пасвішчаш, пакуль ззышчаш; Спрытны і да гуляначка, і да рыканачка, а запражы ў саху, та ён возьмя ды ляжа; У Нясвіжы людзі хіжы, салому таўкуць — бліны пякуць, сена смажаць — бліны мажуць; Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а і матку родну прадаў.

У раздзеле "Анамастыка" аўтар дорыць чытачу цудоўнае падарожжа па мясцінах Гродзеншчыны, знаёміць з уласнымі назвамі вадаёмаў, урочышчаў, палеткаў, лясных масіваў, населеных пунктаў і інш. Выказвае меркаванні пра іх паходжанне, прыводзіць цікавыя факты з гісторыі вёсак, мястэчак.

Падводзячы рысу, як спецыяліст-дыялектолаг мушу сказаць, што кніга "Скарбы народнай мовы", створаная не вучоным, а краязнаўцам-аматарам, належыць да лепшых узораў беларускай дыялектнай лексікаграфіі.

Мікола ДАНІЛОВІЧ,
кандыдат філалагічных навук
г. Гродна

АД РЭДАКЦЫІ. 5 мая Апанасу Пятровічу Цыхуну споўнілася 85 год. Віншуем яго з не абы-якой датай і ад усяго сэрца зычым бадзёрасці і добрага здароўя.

АБ'ЯДНАНЫ АСОБНЫМ СШЫТКАМ

у першым нумары "Беларускага гістарычнага часопіса" матэрыялы, што маюць дачыненне да Гомельшчыны. Гэта артыкулы А. Макушнікава"Гомель: праблемы ранняй гісторыі (VI—XIII стст."), А. Кіштымава "Гомельскі маёнтак графа М. П. Румянцава: вопыт гаспадарання", В. Лебедзевай "Год 1918: барацьба за Гомель", А. Вялікага "...по прочтении это письмо сжечь". А. Мацко і І. Мацко па-новаму асэнсоўваюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны — "Па закліку сэрца". Артыкул М. Касцюка, як кажуць, сам гаворыць за сябе — "Сталіншчына і Беларусь". Прадстаўлены рубрыкі "Усеагульная гісторыя" ("Знешняя культурная палітыка Германіі ў 1919—1933 гг." В. Космача), "Канфесіі на Беларусі" ("Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі (1772—1867 гг.)" М. Смяховіча), "З ваеннай гісторыі" ("Аб стане даследавання гісторыі дзейнасці Арміі Краёвай у Заходняй Беларусі" М. Гнатоўскага), "З гісторыі палітычных партый і рухаў" ("Зялёны дуб" Н. Стужынскай), "З гісторыі навукі" ("Беларуская антрапалогія" А. Мікуліча), "Краязнаўца" ("Радашковічы" І. Пімашэнкі) і іншыя.

АБ ЧЫМ БАЛІЦЬ ДУША ПАЭТА

Пад такой назвай прайшла чарговая літаратурна-музычная гасцёўня ў мінскай бібліятэцы N 10. Да яе была прымеркавана прэм'ера кнігі вершаў і песень Алеся Бадака "За ценем самотнага сонца". Госцем мерапрыемства стаў і кампазітар Алег Елісеенкаў, які плённа супрацоўнічае з паэтам. Спецыяльна для гасцёўні былі ім напісаны песні "Не прыходзь", "Паварот", "Твой дзень нараджэння", "Выпадковы раман", што прагучалі ў аўтарскім выкананні.

ЯК І ЗВЫЧАЙНА...

Багаты на імёны тых, хто толькі ўваходзіць у літаратуру, красавіцкі нумар "Першацвета". Проза прадстаўлена творамі Н. Міткевіч, В. Гурыновіч, П. Сямінскага, А. Дуброўскага. Паэтычную дзялянку "засяваюць" А. Кузнечык, А. Нікулін, М. Шушкевіч, І. Хадарэнка, Т. Бурмакова. Ю. Алесьніна пераклала з украінскай мовы паэму У. Цыбулькі "Тэкст N 1" і выступае з развагамі "Тэкст — інварыянт часу". У "Гасцёўні" прадстаўлены: вершамі — В. Жуковіч, урыўкам з дакументальнай аповесці "Чакай мяне, мама..." — В. Сарока. Творы Х. Чэрні і слова пра яго Н. Чэрні "А жыццё, як імгненне, такое харошае..." увайшлі ў раздзел "Спадчына". Н. Дзівіна рэцэнзуе кнігу паэзіі М. Танка "Мой каўчэг" ("Талент — як каўчэг"). І. Сцяцко дзеліцца ўражаннямі ад зборніка прозы М. Гіля "Бралася на дзень" ("Праменьчык святла"). Феномен беларускай аўтарскай кнігі ў цэнтры ўвагі Н. Вусавай у артыкуле "Больш, чым аматарства..." Ёсць у нумары і традыцыйныя раздзелы "Народнае" (урывак з паэмы Н. Ярмак "Вялікдзень") і "Жароўня" (творы С. Шаміёнка і А. Дабрадзея).

"СПАДЧЫНА", N 1

Нумар адкрываецца артыкулам А. Семянчук "Мацей Стрыкоўскі ў Вялікім княстве Літоўскім". З часопіса "Божым Шляхам" (1975, NN 1—2) перадрукаваны артыкул А. Дзе-кі "Юрка Віцьбіч". Прапануецца таксама артыкул Ю. Віцьбіча "Усіх не расстраляеце".

Сумны юбілей — 50-годдзе ліквідацыі Віленскага беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея імя Івана Луцкевіча. Пра гэтую ўстанову можна атрымаць уяўленне з матэрыялаў "З успамінаў Янкі Шутовіча" і запісаў інвентарнай кнігі. Публікуюцца працяг "Дыярыуша" Міхаіла Казіміра Радзівіла, артыкул А. Грыцкевіча "Маргінальныя тэрыторыі Беларусі". Н. Гулак ("Слуга цару...") звяртаецца да "дзейнасці" ганебна вядомага Мураўёва-вешальніка.

В. Скорабагатаў ("Беларускі "Фауст") расказвае пра кампазітара Антонія Генрыка Радзівіла. Друкуецца артыкул К. Шышыгінай-Патоцкай "Нясвіж і Радзівілы XX стагоддзя". К. Тарасаў прапануе "Кароткі спіс войнаў, бітваў, паўстанняў, у якіх удзельнічалі беларусы". Г. Тычка пераклала эсэ М. дэ Унамуна "Шлях да магілы дон Кіхота". Пад рубрыкай "Літаратурныя помнікі" — пачатак "Свяшчэннай гісторыі Старога Завету", што ў апрацоўцы С. Паўловіча выйшла ў 1926 годзе ў Вільні.

Пятрусь МАКАЛЬ

ПРАШУМЛЮ НА ЗАЙЗДРАСЦЬ НЕБУ КОЛАСАМ...

ДА СВЯТЛА

Шлях да шчасця ў пакутах знаходзім.
Як ад страшнай сваёй даўніны,
Мы далей і далей адыходзім
Ад вайны,
Ад вайны,
Ад вайны.
Малітоўна мы дзякуем Богу,
Што радзее былога імгла,
Што пракладваем мужна дарогу
Да святла,
Да святла,
Да святла.
Адкрываем наступнага далі,
Як абсягі нястомных майстроў.
Мы, што ворагаў пільна шукалі,
Сёння верных знаходзім сяброў.
Паўтараем мы покліч свой шчыры:
Люд наш, лепшую долю гадуй,
У лагодзе, любові і міры
Незалежнасць Айчыны будуй!

РОДАМ З БАРАЗНЫ

Родзічы казалі, што мяне
На раллі пад лысаю гарой
Маці нарадзіла ў баразне
Летняю спякотнаю парой.
Можа б, я да скону занямог
(Ні душы паблізу як назло!),
Ды ў мяне, як ласку меў сам Бог,
Сонца павітухаю было!
З гэтае нагоды спеўны гук,
Што анёльскі ўзлёт перадае,
Урачыста ў небе вёў жаўрук,
Славячы народзіны мае...
Я, пачуўшы ў высях зорны хор,
Жытняю сцяблінкай падрастаў,
Хоць залётнай лютасці віхор
І згінаў няўмольна, і хістаў.
А яшчэ запомніўся, як жах,
Чэрвеньскім і ясналікім днём
З чорнымі крыжамі згубны птах
З вышыні хрысціў мяне агнём.
І нагадваў навальнічны час,
Што жыццё на валаску вісіць:
Грозным градам куль мяне не раз
Чужакі наважвалі скасіць...
Мне за бегам часу паспяваць,
Але і з сівою галавой
Я не перастану апяваць
Баразну, як дом радзільны свой.
Не ў маёнтку, а на ўсю зямлю,
Спраўдзіўшы вясёлкавыя сны,
Я на зайздрасць небу прашумлю
Коласам, што родам з баразны!

•

Не страшна, што маршчын разорыны
Ужо каля вачэй відны,
Калі нябёсамі азораны
Яшчэ адзін твой дзень зямны.
Ужо не просячы вялікага,
Устань ад дотыку зары
І промень сонца ясналікага,
Як ніць ратоўную, бяры...
Удзячны парыванню дзейнаму,
Усё яшчэ з натхненнем ты
Размотваеш па-чарадзейнаму
Святла клубочак залаты...
Сумёт за шыбай—белай вішняю
Дрыготна мроіцца ўваччу.
За ласку, за лагоду вышнюю
Як адплачу, як адплачу?
Ці звонкім спеўным срэбрам голаса —
Нябесным дарам салаўя,
Ці залатой вагою коласа,
Што на зямлі ўзгадую я?
Ці ваяўнічаю цыгаркаю,
Што дымам мне нутро грызе,
Ці неадчэпнай злоснай сваркаю
З маім суседам па чарзе?..
Пчалою пралячу, натруджаны,
Ці прашумлю, як авадзень?
Мой богадайны лёс, мой суджаны,
Чым адплачу за гэты дзень?

КВАТАРАНТЫ

Кватаранты, кватаранты,
Усяленне — як садом.
Іх жабрачых скарбаў транты
Захлынулі цэлы дом.
Гаварылі, што часова,
Не баяўшыся хлусіць,
Зараз толькі прымусова
Можна прэч іх папрасіць.
Прагнуць, каб над нашым дахам
У бязвоблачны прасцяг
Узлятаў драпежным птахам
Ад крыві чырвоны сцяг...
І сягоння, як ні горка,
Пачалі ва ўсю трубіць:
Кватаранцкую гаворку
Гаспадарскаю зрабіць!
Распяразваюцца гэтак,
Што ні крок, то іх пячаць:
Як нам зваць уласных дзетак,
Як нам продкаў велічаць?..
Намі, бач, ужо кіруюць,
Незалежныя суздром,
Кватаруюць — як царуюць
Над сваім гаспадаром!
Асмялелі рызыканты,
Паспрабуй ды разбяры,
Хто тут зараз — кватаранты,
Ну, а хто — гаспадары?
Ім мы ўдзячны быць павінны —
Біць паклоны да зямлі,
Што яны ў жыцці краіны
Лад злачынны навялі...
Як жа вузел свой кватэрны
Нам, урэшце, развязаць?
— Чуеце, прабіў ваш тэрмін! —
Мусім прыхадням сказаць.

РУКУ СУСЕДУ ПРАЦЯГНІ

Ці ж дзеля нас не робіць захадаў
Наш самы мудры ў свеце ўрад,
Руку працягваючы з Захаду
На Ўсход:
— Падай, старэйшы брат!
Паклонішся суседу-волату,
І сорам шчок не апячэ,
І ў наш кашэль дзяржаўны золата,
Як з рога цудаў, пацячэ!
Дык не марудзь, чаго вагаешся?
Адчуеш за чужой спіной,
Што долі лепшай дамагаешся
І ты са мной,
І ты са мной...
Скажы, няўжо не здатны вырасці
Да сатанінскай вышыні —
Да незалежнасці ад шчырасці,
Ад каранёў сваёй радні?
Да незалежнасці ад спадчыны,
Што продкі нам перадалі,
Дзе кроў бацькоў, і слёзы матчыны,
І мова спеўная зямлі?..
Ці ж не да гэткай незалежнасці
Прыходзіш ты, мой крэўны брат,
Не баючыся непазбежнасці
Ахвярных ран, крыжовых страт?
Не думаць, што з табою станецца,
Што лепей у жыцці яшчэ?
Ну, а калі не ўмееш кланяцца,
Удача зайцам уцячэ!
А хіба ж ад сябе адступяцца
Мужы з дзяржаўнай вышыні:
Нашто пра ўздым самому рупіцца?
Руку суседу працягні!

КНЯСТВА ПЕСНІ ВЯЛІКІ ЎЛАДАР

Уладзіміру МУЛЯВІНУ

Той, хто песенным чарам адданы,
Тройчы з намі ізноў паўтары
Як прызнанне любві і пашаны:
Песняры,
Песняры,
Песняры!
Калі верны кірунак абраны,
Не зацягнуць любыя віры.
Як эстрадных вышынь ветэраны,
Не старэюць душой песняры.
Пад напаленым прасам абставін
Гартаваў і свой нораў і дар
Непаўторны Ўладзімір Мулявін —
Княства песні вялікі ўладар!
Ледзь, здаецца, душа паспявае
За палётам мастацтва майстроў, —
Думны дух свой народ апявае
Галасамі сваіх песняроў.
І кіруецца за небасхілы
Вольны спеў хараства і святла
Над зямлёй Беларусі, што крылы
Чарадзейнаму птаху дала.
Песням зоркі і далечы ўтораць
Разам з намі, як рэха ў бары,
Зноўку чуйнае людства паўторыць:
Песняры,
Песняры,
Песняры!

Уладзімір ПАПКОВІЧ

З БІБЛЕЙСКІХ МАТЫВАЎ

АЧЫШЧЭННЕ ХРАМА

Хрыстос прыйшоў сказаць
хоць колькі слоў
Няшчасным людзям
у свяшчэнным храме,
І ўбачыў там авечак і валоў,
І гандляроў за доўгімі сталамі.

Там вуркталі ў клетках галубы,
Мянялы таргаваліся, кляліся.
Гасподзь падумаў: "Вось яны, рабы,
Што золату душою прадаліся".

Разгневана на ўсё гэта зірнуў,
Відовішча здалося дзікім Богу,
І ён тады сталы перавярнуў
І грошы іх рассыпаў на падлогу.

І ўзяўшы ў рукі доўгі біч стары,
Пагнаў за дзверы,
гневу даўшы волю.
"Каб я вас тут не бачыў, гандляры!
Паганіць Божы храм
я не дазволю!"

ЦАР НАВУХАДАНОСАР І ТРЫ ІУДЗЕІ

Была ўрачыстасць: цар усіх сабраў
На адкрыццё статуя залатога.
Мужы чакалі,
каб аркестр зайграў —
Каб ідала вітаць, нібы святога.

Бо цар сказаў:
"Пад першы гук трубы
Паклоніцеся гэтаму статую.
А хто адмовіцца — мае рабы
У печы сваляць, неба не ўратуе".

Раздаўся спеў і дудак і цаўніц,
І трубы, і жалейкі запяялі.
І палі ўсе перад балванам ніц,
І толькі ўпарта тры хлапцы стаялі.

Цару данеслі. Ён паклікаў іх.
"Упартыя...
Ці ў вас спіна не гнецца?
У печы спалім вас усіх траіх,
І попелу ад вас не застанецца".

Ды й смерці не збаяліся яны.
"У нас ёсць Бог.
О, не пакінь нас, Божа!
Балван жа ваш —
сляпы, глухі, дурны,
І золата яму не дапаможа".

Проза

Цяжкі час, нялёгка на душы, але тым не менш напісаў вось першую кнігу рамана "Кліч роднага звона". Пра далёкія 1245—1246 гады, пра цяжкі і радасны заадно для нашага Навагародка перыяд, калі ён Навагародак...

Прашу "ЛіМ" дазволіць падзякаваць Міколу Ермаловічу, Уладзіміру Арлову і Міхасю Чарняўскаму за кансультацыі і літаратуру, а чытача пазнаёміць з фрагментамі майго новага твора.

Аўтар

КЛІЧ РОДНАГА ЗВОНА

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Пабудзілі Усяслава рана, той часінай, калі яшчэ цягнулася доўгая асенняя ноч і зусім паволі набірала моц раніца, калі, бывае, яшчэ сама соладка спіш, а гэта значыць і добра адпачываеш. Любкі побач ужо не было, яна, мабыць, прахапіўшыся ноччу, ціхенька вышмыгнула, каб пакарміць дзіця, а потым засталася на сваёй палове. Яму ж, Усяславу, як ні хацелася падымацца, трэба было ісці ў княжацкі хорам: "Князь кліча". Дык мігам падхапіўся, хуценька апрануўся і борздка пашыбаваў туды, асвяжаючыся ад начной стыні, калючага ветру і вадзяніста-снежнай хлюпаты — зямля была мяккая, ні разу яшчэ глыбока не прамярзалася, не пакрывалася трывалым лёдам, а вось снег падаў ужо. Мусіць, ненадоўга: той Зюзя, што наганяе зіму, толькі яшчэ раз-другі дыхнуў-дзьмухнуў сюды сцюжаю, страсянуў над гэтым краем рукавом, з якога паляцелі белыя матылі, перасцерагаючы, што ён, хоць не затрымліваецца тут, усё ж хутка сюды вернецца і заўладарыць ледзь не на паўгода.

У княжацкім хораме скупа мігцелі свечкі, уся чэлядзь была на нагах, але было вельмі ціха, і па тым, як усе не толькі пашанотна, але і з трывогай, нават са страхам пазіралі на яго, давалі дарогу, ён зразумеў усё непазбежнае, але жалобнае і пагрознае...

У княжацкай спальні было толькі трое: высокі і худы біскуп Кірыла ў чорнай апратцы, пажылыя, абодва мажныя лекар і пакаёвы.

— Княжа, Усяслаў прыйшоў, — нагнуўся над хворым пакаёвы, а потым адступіў, даў яму месца.

Князь Ізяслаў — а ён ляжаў на спіне заплюшчыўшы глыбока запалыя вочы, пад якімі былі цёмна-рудыя кругі, быў высахлы, жаўтлявы, а рэшткі валасоў, вусы і барада зусім збялелі — не варухаўся, толькі марудна і вельмі цяжка прыўзняў павекі, зірнуў ужо не выцвілымі, а бясколернымі вачыма, з вялікім намаганнем варухнуў вуснамі і языком:

— Пакідаю вас, Усяславе...

Усяслаў душой адчуў: князь хоча, каб ён сеў побач, каб можна было цішэй гаварыць, але ўсё яму было чуваць.

Апусціўся на край ложка, запытаў з болем і спачуваннем:

— Вельмі ўсё баліць, князь?

— Не, — той варушыў толькі вуснамі. — Мне цяпер лёгка, не чую ніякага болю, але... Смерць мая ўжо тут, каля мяне... Я яе бачыў ужо...

— Прымроілася табе гэта, князь.

— Не. І яе не баюся, няхай ужо забірае да маіх бацькоў і дзядоў. Час...

— Яшчэ не час, князь.

— Час, слаўны ваявода і мілы мне чалавек. Нялёгка табе будзе без мяне, але толькі табе ўручаю лёс нашага Вялікага княства Навагародскага. Ужо з сённяшняга дня гэты цяжар, што мы валаклі разам, ляжа найперш на твае плечы.

Усяслаў узяў лёгкую, худую і халодную князеву руку і, пацалаваўшы яе, паўтарыў сваю ранейшую клятву:

— Што ні будзе пагражаць мне, князь, але я ніколі і ні перад нікім не адступлюся ад таго, што ты наказваеш нам...

— Ведаю, таму і паміраць мне не страшна. Такой бяды, што мяне хутка забудуць.

— Не забудуць, княжа.

— Забудуць. Помняць доўга таго, хто пачаў, выйграў ці праіграў вайну, праліў мора чалавечай крыві. Хто не толькі адбіваўся ад ворагаў, але і нападаў на суседзяў, дадаваў да сваіх зямель чужыя. Такія ціхія, памяркоўныя, як я, у людской памяці доўга не застаюцца.

— Не гавары так пра сябе, князь, — папрасіў Усяслаў. — Ты развагай, мірам, дбайнай гаспадарлівасцю ды мудрай палітыкай з дружнымі і хіжымі суседзямі зрабіў тое, чаго не ўдалося б дабіцца мячом. Ты спрытна спажыў зацішны шанц, што выпаў нам адзін раз за стагоддзі.

— Я не пра сябе думаю, Усяслаў. Пра іншую памяць...

Ён аж здзівіўся і ад цяперашняй свядомасці і розуму князя Ізяслава.

— Спажыць шанц — яшчэ не ўсё. Гэты шанц яшчэ трэба спраўдзіць, адстояць. І ўжо, непазбежна, мячом. Хутка, можа, нават і вельмі хутка пасля маёй смерці наш зацішак, мір сярод войнаў, што палыхаюць вакол, закончыцца і сюды таксама прыйдзе вайна. Каб забіць наш шанц...

— Што ж, прыйдуць на нас з мячом — возьмем у рукі мячы і мы.

— Дык вось калі будзе памяць пра слаўнае былое і прага лепшага новага, то ворагу будзе нялёгка скарыць вас. Устоіце, будзеце гаспадарамі на нашай зямлі, дзяржаваю сярод дзяржаў — усцешыце нас там, на тым свеце. Мы не будзем плакаць, адракацца ад нашчадкаў, што не занядбалі нас, наш запавет, сябе, будзем спрыяць адтуль. Калі ж, не дай Бог, нашчадкі змаладушнічаюць, забудуць нас, зганьбуюць сябе, то іхні род пачне вымірацьі... І заўладараць чужыя. І завядуць свой лад, дзе ўсё будзе няправеднае, хіжае, нявечнае, абы ўхапіць сваё ды дзень гэты пражыць... Толькі той край благаславенны ў Бога, дзе шануюцца продкі і іхняе далей доўжаць нашчадкі. Калі ж гэтая повязь абарваная, дык нашчадкі няшчасцяць свой край, сябе, сваіх дзяцей і ўнукаў, а ўрэшце выраджаюцца і на гэтай зямлі прарастае наноснае семя... А там не толькі калоссе, але і пустазелле... Не табе, Усяслаў, гэта гавару. Баярам нашым, дружынам, чэлядзі, смердам — усяму нашаму люду. А ты скажаш гэтыя мае словы на Радзе і на вечы...

— Скажу, светлы княжа. Усё, што і як ты наказваеш.

— Абапірайся на сілу, на дружыны. Яны памогуць.

— Добра, княжа.

— Я ж... — князь пачаў задыхацца. — Смерць... Хадзем... Хавайце не ў даспехах... Я не баявы, мірны князь... Я не ліў кроў.

Князь Ізяслаў і яшчэ штосьці гаварыў ці, лепш сказаць, спрабаваў вымавіць, але ягонага голасу не было чутно, угадвалася толькі мармытанне, а за ім пайшлі хрыпы. Нечакана ён напружыўся, аж уздрыгнула яго рука ва Усяслававай далоні, шырэй, але неяк зусім не па-зямному адплюшчыў вочы, абвёў імі сваю спальню, а пасля запыніў позірк на куце, дзе вісеў вялікі абраз. Уставіўся, нібы анямеў, а потым увесь торгнуўся, нібы апошні раз выдыхнуў усё цяжкое з сябе і з палёгкай адкінуў убок галаву...

Усе яны перавялі вочы на старога лекара — той узяў ад Усяслава князеву руку, прыклаў вялікі палец да запясця, паслухаў, а затым вымавіў са скрухаю:

— Преставился наш князь.

— Добры быў чалавек, дык лёгкая смерць, — перажагнаўся верны княжацкі лёкай.

Услед за ім перажагналіся і астатнія. Ніхто з іх, мужчын, не закрычаў, не заплакаў наўзрыд, толькі па-мужчынску ўсе зацяліся. Усяслаў ведаў, што князь памрэ калі не сёння, дык заўтра, добра ўсвядомліваў, што гэта не проста смерць князя і чалавека, але агромністае выпрабаванне для Навагародка і ўсяго Вялікага княства Навагародскага і не толькі на сёння ці заўтра, але, можа, і на стагоддзі, але цяпер, убачыўшы, што гэта адбылося, адчуў, што нібы ад яго адвалілася сцяна ці нейкая агромністая падпора, што ён нібы адзін з тым, што паслала ім воля неба і зямлі і што цяпер ужо ўвасабляецца ў в ы п р а б а в а н н е!.. Яно пачалося! Хутка набярэ разгон, і адзін Творца і Усявышні ведае, ці будзе ў гэтым выпрабаванні выйсце ці яно завядзе ў тупік!.. Вось такое жыццё: учора жыў і рабіў тое, што трэба, спакойна, радаваўся, зноў пазнаваў таемства і ўцехі кахання, а то, мабыць, даў пачатак яшчэ аднаму новаму жыццю, а сёння...

— Падымайся на ногі, сын мой, — паклаў яму руку на плячук біскуп Кірыла ды прамовіў шматзначна. — Спаўняй ужо князеву волю, загадвай, каму што і як рабіць...

Ужо на світанні, калі ажыў Навагародак, бадай, усе ведалі сённяшнюю жалобную навіну.

Смерць нават простага смерда, лёкая, дружынніка, не кажучы ўжо пра знатнага воя альбо баярына — гэта свежая, уражлівая падзея, што змушае неяк іначай, разважлівей і глыбей падумаць пра нябожчыка, пра жыццё, пра сябе, пазбавіцца ад усякай нечысці, паспачуваць, памагчы іншаму, згуртавацца ў бядзе і горы, каб пасля гэтага камусьці, праўда, толькі нямногім, жыць болей праведней, а камусьці лепш сказаць, усім астатнім, існаваць па-свойму далей, да іншай нечыяй ці сваёй смерці. Жыццё, што не намі заведзена, мае свае законы, і не нам пры ўсіх нашых намаганнях, а на самай справе, можа, толькі маленечкіх спробах у ім разабрацца ды яго змяніць...

Але тут — смерць князя! Старога! Апошняга са свайго роду! Ні дзядзька, ні сын альбо сынавец — ніхто са сваіх, аднакрэўных, яго не заменіць! Значыць, тут ранапозна сядзе чужы князь, які, канечне ж, завядзе свой лад, а потым і свой род! Хто ж будзе гэты новы князь? Якія яго характар, звычкі? Яе ён будзе паводзіцца і са знатнымі, і з простымі? З суседзямі? Чаго чакаць далей? Міру? Звадаў і вайны? Такія думкі затурбавалі, выбілі са спакою і баяраў, і чэлядзь, што злучылі свае спогляды на Усяславе, ведаючы і прадчуваючы, што цяпер ён тут галава. Ды Усяслаў нібы знік з Навагародка.

Радцы, пачуўшы жалобную вестку, наведалі ўжо абмытага і ўбранага ў велічна-святочна-тужлівую княжацкую апратку нябожчыка, а пасля разам сабраліся ў радніцы, паселі на сваіх месцах і пачалі пацыху перамаўляцца. Толькі адзін таўсцюк Расціслаў — у цёплых ботах, у расхінутым сабаліным футры, з узлахмачанай шапкай у руцэ — нервова выкрочваў туды-сюды па пакоі, а потым запыніўся і незадаволена запытаў ва ўсіх:

— Раніца, трэба нешта рабіць, а дзе Усяслаў? Дзе малодшы ваявода Бялян? Дзе Усяславаў зяць, Васілёк?

— Не спяць жа... — нібы сказаў тое, што ёсць, а на самай справе падбухторыў Расціслава стары Звеніслаў. — Дзеюць...

— Што?

— Тое, што ім трэба...

— І біскупа Кірылы няма! — не супыняўся і не супакойваўся Расціслаў. — Абодва, Усяслаў і Кірыла, не спяшаюцца аб'явіць нам ранейшы і сённяшні наказ князя Ізяслава.

Канечне, усе хацелі ведаць: ш т о ў грамаце князя Ізяслава, якую ён перадаў біскупу Кірылу. Але Расціслаў хацеў ведаць пра ўсё найбольш. І, канечне ж, не толькі таму, што быў навагародскі дворскі.

— Усяслаў, можа, ужо спаўняе князеву волю... — зноў ні за, ні супраць Усяславававоды сказаў Звеніслаў, але ў агонь Расціслававага гневу падкінуў паленца.

— Як гэта спаўняе? Адзін? Без рады з намі? — выпаліў Расціслаў, запыніўся, абстраляў усіх незадаволеным позіркам. — Дык хто мы? Радцы ці не? Давайце вось раіцца, з чаго і як нам пачынаць пахаванне?

— Без Усяслава? — хітра ўхмыльнуўся, зноў ціснучы Расціславу на болькі мазоль Звеніслаў. Добра ведаў характар, намеры Расціслава і ягонай Раксаны. Часта піў, шушукаўся з тымі, ставіў петлі для Усяслава, нацкоўваў на таго князя, хоць, трэба сказаць, не шмат яны дабіліся: князь верыў свайму ваяводу і нават любіў яго, як малодшага брата. — Ты не баішся, што верныя Усяславу воі палічаць нас за крамольнікаў? Ды ў такі час, калі нам усім трэба быць заадно!

— Не разумею! — ускіпеў Расціслаў. — Ці ты, канцлер, пакепліваеш з мяне, ці асцерагаешся сам ступіць лішні крок?

— Я думаю, — ухіліста адказаў той.

— Цяпер мала думаць, цяпер трэба штосьці і штосьці рабіць! І не штосьці, а т о е, што т р э б а!

— Прыйдуць біскуп Кірыла і Усяслаў — дык, канечне ж, адразу скажуць нам князеў наказ, а тады ўжо разам параімся п р а ў с ё. Найперш пра тое, каму ў нас сесці на пасад... — пры ўсіх намекам на намёк адказаў захавальнік навагародскай пячаткі.

— Што тут надта мудрагеліць? — не мог саўладаць з тым, што яго турбавала, Расціслаў. — Трэба спешна слаць ганца ў Холм, да князя Данілы. Няхай ці сам зробіць ласку прыехаць у Навагародак, ці прышле свайго дворскага Андрэя. Вось з імі нам трэба як след параіцца... — А пасля, спахапіўшыся, не дагаварыў запаветнага, толькі дадаў: — П р а ў с ё...

Усе добра зразумелі ягоны празрысты намёк, усё, пра што ён затаіўся: Расціслава не проста захвалявала тое, хто і калі сядзе ў Навагародку на княжацкі пасад. Яму не цярпелася, ажно гарэла, каб яму і яго сям'і жылося лепей пры новым князі, чым пры старым. Праўда, ён нікому, нават каму верыў, не прызнаўся, што ён своечасова пачуў ад Усяслававага дружынніка, Любаміра, пра ранні выклік Усяслава ў княжацкі хорам, пра князеву смерць. Як і не прызнаўся, што ўпотай паслаў ужо ганца ў Холм, каб там ведалі пра ўсё і каб не спалі ў шапку, а панамагаліся яшчэ не выпусціць Навагародка з-пад сваёй волі, каб ён, Усяслаў, быў тут у моцы і ў дастатку. Тады, калі выйдзе ўсё так, як хоча князь Даніла Галіцкі, як жадае ён, прыйдзе яго час і ён будзе зусім іначай гаварыць, паводзіцца з усімі, а то і прыбярэ некаторых з дарогі. І, канечне ж, найпершы ўдар будзе па Усяславу... Абы толькі Холм не праваронію, мігам умяшаўся ў навагародскія мітрэнгі, павёў усё далей па-свойму, як было да таго, пакуль не аслабілі, а то і спустошылі Галіцка-Валынскую зямлю манголы і міжволі не набралі тут моц, сілу князь Ізяслаў з Усяславам... Канечне, ні князь Даніла, як ні журбоціцца па жонцы-нябожчыцы, ні дворскі Андрэй, якога тут называюць "холмскім сваячком", маючы на ўвазе, што той Раксаніна радня, не павінны ўпусціць тут тое, што мелі раней...

Расціслаў верыў, што цяпер ажыве яго мара, узыдзе і будзе яркай ягоная зорка, але глыбока ў душы і трывожыўся, што з таго часу, калі князь Даніла змушаў Навагародак слухацца, спаўняць яго волю, сплыло ўжо нямала вады, што ўжо ёсць, дужэе, пра што непакоіцца ў Холме, Вялікае княства Навагародскае і што ўрэшце ёсць тайная грамата князя Ізяслава. Усяслаў — не з тых, хто разгубіцца ў цяжкую хвіліну альбо кагосьці збаіцца. Наадварот, пры напасцях Усяслаў надзіва разважлівы і мужны, мае добрае знаёмства, падмогу на Літве — і не толькі ў Міндоўгавай, — здаецца, паразумеўся і з непрымірымым сапернікам раней Кіева, а цяпер Холма, Полацкам. Навагародскія дружыны за Усяслава гарой. Ён — іхні любімец і пястун, бацька альбо старэйшы брат. А іхнія дружыны — сіла, з ёй лічацца ўсе суседнія землі, князь Даніла таксама. Летась, калі той адбіваў наступ раці караля Бэлы і сынаўца Расціслава, проста мусіў праглынуць як бобку перцу тое, што на гэты раз Усяслаў не кінуўся яму на падмогу з палкамі, а прывёў маладую дружыну пад канец бою не столькі памагчы, колькі даць дзецюкам прагуляцца, пабыць у баявым паходзе... Ясна, што і цяпер Усяслаў з дружынамі, найперш ім расказвае пра княжацкі наказ, падмацоўвае сабе падпірышча. А без яго біскуп Кірыла наўмысна сюды не ідзе. Таму хоць і не заміналі князь Даніла, мітрапаліт Кірыла стаць тут біскупам, хоць канстанцінопальскі патрыярх яшчэ не пацвердзіў гэтага біскупства, але ён памагаў князю Ізяславу і ваяводзе Усяславу весці навагародскую палітыку. Пакуль што няма тут сілы супрацьстаяць ім. Нават яго, Расціславаў, зяць-соцкі, калі быў жывы і марыў стаць тысяцкім, шчыра служыў не яму, а Усяславу.

...Усяслаў заявіўся ў горадзе, а пасля ў радніцы пад полудзень. Па тым, як быў апырсканы мокрай зямлёю на ботах і на полах плашча, было відаць: быў у дарозе, сам аб'ехаў прыстанкі бліжэйшых баявых дружын. Але і ўслед за ім біскуп Кірыла не прыйшоў.

— Трэба паслаць па біскупа, — адразу ж задзірыста сказаў Усяславу Расціслаў.

— Чаго? — нібы не зразумеў, пахмурна запытаў той. Сеў на сваім, вярхоўным, месцы, што займаў пасля таго, як злёг князь Ізяслаў, стомлена абцёр далонню высокі лоб, роўны важкі нос, густыя, трошкі ўжо сівыя вусы і бараду.

— Няхай аб'явіць нам князеў наказ, каб мы ведалі, што і як рабіць далей, — прамовіў Расціслаў. Раней, нават да нядаўняй паездкі ў Холм, дзе пабачыўся з князем Данілам, які вярнуўся з Іціля, ад Батыя, Расціслаў так смела і фанабэрыста не разважаў са сваім сапернікам, але, адчуўшы новую падмогу ў Галіцка-Валынскай зямлі, дазваляў сабе дзёрзкасць.

(Працяг на стар. 14-15)

ЛІМ ЧАСАПІС

НАПІСАНА СЭРЦАМ



У кожнага мастака ёсць улюбёныя тэмы, за якія ён бярэцца ў часы асаблівага натхнення. У. Уладзіміра Сулкоўскага гэта беларускае Палессе.

Яшчэ будучы студэнтам тэатральна-мастацкага інстытута Уладзімір штогод на некалькі месяцаў ехаў на Брэстчыну або Гомельшчыну, каб сабраць матэрыял для сваіх будучых работ. Вёску за вёскай абышоў ён усё Палессе, робячы замалёўкі палешукоў, іх побыту, традыцый і абрадаў.

Дыпломная работа Уладзіміра "На родным Палессі" стала заяўкай на творчую сталасць маладога мастака і зыходным пунктам у яго плённай працы жывапісца.

Паралельна з тэмай Палесся спела і другая, не менш захапляльная і цікавая. Крыніцай яе была ўлюбёнасць у паэзію Якуба Коласа. Так нарадзіўся цыкл, прысвечаны паэме "Новая зямля". На яго стварэнне пайшлі многія гады.

Сёння Уладзімір Сулкоўскі поўнасцю аддадзены працы над увасабленнем сукупнага вобраза Палесся. Ідзе пераасэнсаванне найбагатага матэрыялу, сабранага ў студэнцкія гады. Цяперашняе ж успрыманне лёсу краю праходзіць праз прызму чарнобыльскай катастрофы. Тут мастак знаходзіць свае сродкі для перадачы трагедыйнасці сітуацыі.

Пройдзе час, і мы сустрэнемся з новымі работамі Уладзіміра Сулкоўскага на чарговай выстаўцы. І, думаю, не застанёмся абыякавымі. Бо ўсё ім напісанае прайшло праз сэрца, якое жыве родным краем.

Яўген КАЗЮЛЯ, БЕЛІНФАРМ

На здымках: мастак Уладзімір Сулкоўскі; яго праца "Верасень".

Фота аўтара

У ГАСЦЯХ — ІЗРАІЛЬСКІ МАСТАЦТВАЗНАЎЦА

"Еўрапейскі Гуманітарны Універсітэт мае гонар запрасіць Вас для прачытання курса лекцый..." — такое запрашэнне атрымала нядаўна Зіва Амішай-Майзельс, вядучы мастацтвазнаўца Ізраіля. У красавіку ў памяшканні Ізраільскага культурна-інфармацыйнага цэнтра ўпершыню на Беларусі быў прачытаны курс лекцый "Сучаснае яўрэйскае мастацтва ў кантэксце сусветнай культуры" ў праграме акадэмічнага курса "Уводзіны ў гісторыю мастацтваў".

Дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва Іерусалімскага універсітэта прафесар З. Амішай-Майзельс — адна з вядучых сучасных тэарэтыкаў і гісторыкаў мастацтва, аўтар фундаментальных работ пра Пікасо, Гагена, мастацтва Францыі XIX—XX стагоддзяў, даследавання па абстрактным мастацтве... Цэнтральная тэма яе навуковай творчасці — яўрэйскае мастацтва XIX—XX стагоддзяў, Упершыню яна раскрыла глыбінныя і сімвалічныя вытокі работ М. Шагала, Э. Лісіцкага і іншых выдатных мастакоў, звязаных з яўрэйскай традыцыяй. Манаграфіі З. Амішай-Майзельс апублікаваны ў ЗША і Ізраілі і перавыдадзены ў многіх краінах свету.

Візіт сп. Амішай-Майзельс арганізаваны пры садзеянні пасольства Ізраіля ў Мінску.

ДЗЕ КРЫЛЫ НАШАГА МАСТАЦТВА?

Дайце веры, але абставіны складваюцца так, што будучым даследчыкам мастацтва 90-ых гадоў не будзе што рабіць, бо некаторыя яго віды і жанры літаральна знікаюць на вачах. Дзе агітплакат Саюза мастакоў, які заўсёды меў грамадскі заказ на выкрыццё злодзеяў і хапуг? Прыгожыя, друкаваныя ў колеры культурна-асветніцкія афішы сёння таксама такія рэдкія, што ўгледзець іх можа альбо блізкі да самой падзеі чалавек, альбо яе арганізатар, а зусім не звычайны шараговы глядач на звычайнай вулічнай дошцы аб'яў. Ксераксы, відэа, аўдыя парушылі нашы ўяўленні аб традыцыйных мастацтвах. Тое ж датычыць і графічнага афармлення кніг, часопісаў — заставак, сімвалаў, "шапак". Чаму яны, абавязковыя для друку ў 20-30-я гады, зніклі з "новых рэвалюцыйных" выданняў? Агітплакат, карыкатура, афіша, графічны малюнак, як найбольш папулярныя і хуткія, заўжды характарызавалі змены грамадства, яе "перабудовы".

Пагадзіцеся, што дваццатыя гады для нашай гісторыі былі не менш складаныя ні ў палітычных, ні ў матэрыяльных, ні ў культурных адносінах. Але яны пакінулі нам цікавейшыя прыклады і знаходкі новых сімвалаў часу, каб выказаць нацыянальную незалежнасць, патрыятызм, узаемадапамогу ("Дапамажы братам Паволжа!", "Вучыцеся грамаце!" і г. д.). Застаўкі і канцоўкі газет і часопісаў "Малады араты", "Маладняк", "Піянер Беларусі" здзіўлялі фантазіяй і складаным афармленнем. Тое ж можна сказаць пра маркі "Чырвонага крыжа". Няўжо сучасная сітуацыя ў Беларусі не дае палёту фантазіі, праяўленню пачуццяў, не змушае мастакоў, асабліва графікаў, знайсці новае адлюстраванне і сімволіку незалежнай дзяржавы? Няўжо не вырастуць у нашага мастацтва крылы, якімі ў дваццатыя гады Язэп Драздовіч абкружыў беларускую "Пагоню", хоць і стала гэта не апошнім прымусам пакінуць прафесійнае мастацтва і знікнуць у вясковых "падарожжах"...

Людміла НАЛІВАЙКА

Вокладкі часопісаў.

Часопісная графіка Язэпа Драздовіча.

"ПУБЛІКА НАС ДАЎНО РАССМАКАВАЛА..."

Рассмакавала менавіта ў Альтэрнатыўным тэатры, хоць "яны" — клуб Сяргея ФЯНЕНКІ "Постэлітарнае кіно", — гнездзіліся ў розных месцах і розных залах. Па сутнасці ягонай кінасправы колькі пытанняў прапануе яму Алена ШЫФМУНД.

— Сяргей, "Альтэрнатыўны тэатр" пачынаецца з вешалкі, а ваш клуб "Постэлітарнае кіно" — з чароўных адміністратараў. Скажыце, гэта вынік доўгіх пошукаў ці шчаслівая выпадковасць?

— Мне ўвогуле падабаюцца прыгожыя жанчыны, таму, прыдумваючы клуб, я шукаў людзей вельмі сімпатычных не толькі ўнутрана, а і вонкава. На шчасце, яны апынуліся зусім побач. Так што і з Вольгай, і з Алёнкай мне пашанцавала. Пагадзіцеся, што атмасферу свята можа стварыць толькі вельмі мілы і ветлівы персанал.

— А ваш мілы і ветлівы персанал глядзіць тыя фільмы, якія вы паказваеце?

— Усе вытворчыя канфлікты адбываюцца ў нас выключна з-за спрэчак, каму глядзець кіно, а каму паныла чакаць заканчэння сеанса і ахоўваць спакой гледачоў.

— А што за людзі да вас ходзяць? Ці існуе які-небудзь "узроставы цэнз", ці належаць яны да нейкай "сацыяльнай праслойкі", "касты" або "клана"?

— У першую чаргу людзі жывыя і цікаўныя, таму што нам надта падабаецца новае аўтарскае кіно. Якраз яго паказамі мы і ганарымся. А для таго, каб хоць крыху захацець зірнуць, што ж там утварылі Пітэр Грынаўэй, Джым Джармуш, Чжан Імоў і Эмір Кустурыца, трэба быць хваравіта цікаўным чалавекам. Таму што ў нашу інфармацыйную яму весткі пра ўсходы новага кінамастацтва прасочваюцца з вялікай цяжкасцю. Зразумела, кругагляд у нашых гледачоў самы шырокі, людзі яны, несумненна, вельмі разумныя і, у пераважнай большасці, надзвычай прыемныя. За што мы іх і любім. За тое, уласна, іх рэгулярна і радуем. Узрост (ад 15 да 60) і іншыя асаблівыя прыкметы ніякага значэння не маюць.

— Вы закранулі тэму вам, як кінакрытыку, блізкую і прыемную. Якое кіно і якіх рэжысёраў вы любіце, якімі паказамі асабліва ганарыцеся?

— На самай справе, я ні ў якім выпадку не кінакрытык. Я — кінаўсхвалявальнік. Хоць крытыкаваць бывае вельмі прыемна. Але зачапіць якога-небудзь рэжысёра публічна ў той час, калі кінематограф пачуваецца вельмі нудна, язык неяк не паварочваецца. Затое пра любімае гаварыць заўсёды асабліва прыемна. "Запальваючы чырвоны ліхтар" Чжана Імоў, "Дзіўней, чым рай" Джыма Джармуша, "Час цыганоў" Эміра Кустурыцы, "Дурная кроў" Леа Каракса, "Еўропа" Ларса фон Трыера, "Мой уласны штат Айдаха" Гаса ван Сента, "Эдвард П" Дэрэка Джармена. Вельмі няпоўны спіс таго, чым мог бы заганарыцца кожны заходні кінатэатр. Усе гэтыя фільмы — авангард новага кінамастацтва. Кожны з іх выбітны і зусім ні на што не падобны. Многія рэжысёры, чыё кіно стала адкрыццём для нашых гледачоў, даўным-даўно ўзвялі сабе нерукатворныя помнікі на Захадзе. І мы бязмежна шчаслівыя, што пратапталі да іх новыя, раней нетаптаныя сцяжыны. Асабліва нам дарагія лістападаўскія праграмы "Новы свет Джыма Джармуша" і "Кінасвет", студзеньская "Англійскія постмадэрністы", сакавіцкая "Незалежныя кінаамерыканцы". У маі будзе "Новае французскае кіно", у чэрвені — "The best of "Посткіно", у верасні-кастрычніку — "Вялікія кінаэксперыменты". Нягледзячы на бязмежную любоў да кіно новага, мы вельмі стараемся дагадзіць усім разумным гледачам і чаргуем нябачанае новае з недагледжаным старым ("Апошняе кіно", цыкл "Кінонятленка"). Між іншым, публіка з задавальненнем ходзіць на тыя фільмы, якія "бліжэй да цела". Так што аўдыторыя ад праграмы да праграмы можа прыкметна мяняцца.

— Я заўважыла, што перад пачаткам сеанса вы абавязкова штосьці наладжваеце: то конкурс кіназнаўцаў з розыгрышам самых неверагодных прызоў (бананы з вашымі аўтографамі, вобла з бляшанкавым півам, памідоры з зелянінай), то паказ кароткаметражных фільмаў, то канцэрт, то нейкія дзіўныя візуальныя эксперыменты...

— Так, у гэтым і ёсць прыцягальнасць нашага клуба. Мы вельмі адрозніваемся ад звычайнага кінатэатра. Часам (і гэта для мяне вялізарная ўхвала) я чуў: "Тое, што вы прыдумваеце, бывае цікавей за тое, што паказваеце". Як выцягнуць гледачоў з іхніх нор і прымусіць паглядзець тое, што называецца новым мастацтвам? Патрэбна прынада, пастка (даруйце за звярыную тэрміналогію) у выглядзе вядомай кінастужкі. Вось і паказваем мы новае мастацтва нібы ў нагрузку да фільма.

Мы жывём у той час, калі лепшыя кадры ўжо зняты, карціны намаляваны, радкі напісаны. Любая новая ідэя, фармалістычны эксперымент, постамадэрнісцкі "сцёб" для мяне — на вагу золата. Таму і іграў у нас вядомы віяланчэліст Алег Алоўнікаў пад абстракцыянісцкія фільмы Оскара Вышынгера, а "R. A. F. Gold Club" — пад эксперыменты з "Анталогіі відэатанца" (сумесь відэаарта з сучасным танцам). Таму і выкарыстоўваем мы наш цудвідэапраектар не толькі наўпрост — для праекцыі фільма на вялікі экран, але і робім з яго дапамогай новае мастацтва: сумесны перформенс з "Барабанным экстазам", прадстаўленне "Перспектыўны відэатанец", відэаінсталяцыя "Сетка". Вельмі спадзяюся і пастараюся, каб гэты спіс быў прадоўжаны.

Мы гнездзіліся ў розных месцах, у розных залах, але ў "Альтэрнатыўным тэатры", які даўно ўжо ператварыўся ў культурны (ва ўсіх сэнсах гэтага слова) цэнтр, — самая спрыяльная аўра, самая творчая атмасфера.

Спадзяюся, што вы, як і кожны іншы наш глядач, заўважылі, што мы стараемся працаваць пад дэвізам, бессаромна ўкрадзеным у савецкага гандлю: "Глядач заўсёды мае рацыю". Таму і ўсміхаемся ўсім шырокай усмешкай, увесь час што-небудзь прыдумваем і рады ўсім, хто прыходзіць да нас за глытком свежага мастацтва.

Тэатр

„СЫГРАЙЦЕ АДНОЙЧЫ Ў П'ЕСЕ ІБСЕНА..."

Калі Людміле Волкавай, актрысе Гродзенскага драматычнага тэатра, у сёлетнім сакавіку ўручалі "Крышталёвую кветку", адзін з самых высокіх тэатральных прызоў-узнагарод на Беларусі, кранула ўсіх вызначэнне-фармулёўка: за яркі акцёрскі дэбют.

Між тым дэбютавала актрыса ў... 1971 годзе роляю Ілзэ ў Блаўманісавым "Блудным сыне" і за гэты дэбют, яркі, як падкрэслівалася, атрымала прэмію БТА. Дэбютавала якраз пасля заканчэння курса Уладзіміра Маланкіна. Яе аднакурснікамі былі Ала Ельяшэвіч, Сяргей Краўчанка, Аляксандр Уладамірскі. Ёй прапанавалі выбіраць між Рускім і Купалаўскім тэатрамі; яна, больш за ўсё жадаючы заставацца разам з аднакурснікамі ды педагогамі (Маланкіну дапамагалі Валерый Раеўскі і Барыс Луцэнка), ужо была схілялася на карысць апошняга, але перамагла... жылплошча. Куточак, які актрысе з маленькай дачкою даў Гродзенскі драматычны...

Пасля яркага акцёрскага дэбюту ды тузіна роляў шашалем пачала тачыцца думка: а раптам, акрамя Гародні, я нідзе.. нікому... ніяк... Урэшце спакусілася на прапанову Валерыя Раеўскага здымацца ў тэлефільме паводле "Брамы неўміручасці". Пакінула ўсё. Пакінула, хоць Уладзімір Караткевіч з Уладзімірам Мішчанчуком, тагачасныя кіраўнікі Гродзенскай драмы, гаротныя адгаворвалі: не трэба, табе не пашанцуе, будзь там, дзе складаецца, дзе атрымліваецца... Так, гаротныя. Людміла да такой ступені шчыльна была занятая ў рэпертуары, што проста замяніць яе не выпадала... І ёй... не пашэнціла. Не пашэнціла, хоць у фільме знялася паспяхова, хоць выйшла на сцэну Купалаўскай акадэміі ў спектаклі "Ажаніцца — не журыцца". Выхадаў, як потым высветлілася, выпала толькі два. На здачы ды на прэм'еры. Людміла не ў стане была здабываць, адваёўваць сабе права выходзіць ды выходзіць, — нягледзячы на тое, што і рэжысура, як той казаў, бачыла, і прапановамі не абмінала... Яна пайшла. У Львоўскі тэатр рускай драмы, потым — у Кіеў, дзе чакалі ў тэатры імя Лесі Украінкі...

— Людміла, акцёры зазвычай не надта задаволены сваім творчым лёсам. У вас ёсць важкія прычыны наракаць на яго пасля Кіева, Львова, Мінска?

— Я веру ў лёс. Калі ўручалі "Крышталёвую кветку", падышоў Барыс Луцэнка, кажучы, што, маўляў, ён шкадуе — не ўсё склалася так, каб менавіта я працавала на першых сцэнах Беларусі. А мяне задавальняе мая — гродзенская. Я пакідала яе пяць (!) разоў, і ўсё-такі лёс, беручы сваё, вяртаў мяне сюды. Калі нешта не склалася, сама вінаватая; не хачу, не маю права скардзіцца...

— Паводле ўсіх уяўленняў пра тэатральныя персанажы, вы — гераіня. Але ж ці магчыма іграць гераіню ў сучасных трактоўках хоць сабе і класічных п'ес?

— Не тэатр вінаваты ў тым, што гераіню цяпер часцяком ўяўляюць бесхарактарнаю, бляклаю. Дарэчы, мне самой вельмі цікава іграць характарныя ролі, выпрабоўваць сябе імі. Я заспела часіну (часінку, мовім так), калі вызначэнне "герой", "гераіня" патыхала чымсьці адмоўным. Адметнасць, прыўзнятасць, захопленасць, шчырасць і да іх падобнае стараліся схаваць. Але цяпер, здаецца, мы набліжаемся да новага героя, нібыта па-новаму разумеючы, што ж такое чыстая душа. Мне хацелася б пановаму сыграць гераіню, хоць шмат з таго, назапашанага ў маладосці, вяртаецца. Вяртаецца знаходкаю, адкрыццём. Мне здаецца, што дабро і зло пачалі неяк пэўна аддзяляцца адно ад аднаго, ясна выяўляецца зерне ўчынкаў або жаданняў. Гледачы сталі іншыя! Паверце, я ў тэатры з 1971 года, і цяпер, у 1995, людзі прыходзяць, адзеўшыся, апрануўшыся ў лепшае, у гуморы, у чаканні! Ужо каторы месяц я бачу поўную залу. Мы, акцёры, згадалі, што такое аншлаг: мо людзям няма куды падзецца? Але ў нас, у Гародні, паверце, дзецца заўжды ёсць куды, дый польскае тэлебачанне сумаваць не дае. Значыць, ёсць нешта ў нас, у акцёрах (бо аднолькава ідуць і на вядомыя п'есы, і на зусім свежыя для горада), — ідуць да нас, каб штосьці атрымаць... Што? Вось адно назіранне: напрыканцы спектакля "Цыганка мне сказала..." у мяне ёсць адно невялічкае распрананне (проста трэба скінуць спадніцу і прадэманстраваць карункавы гарнітурчык), — дык вось, часам нават няёмка, не хочацца гэта рабіць. Зала не чакае гэтага.Не, я не ханжа, але... Залы саромлюся. Дзівосная зала ці не кожны раз бывае на спектаклі "Нора": ён ідзе ў малой зале, часцяком з расійскімі (заезджымі) гледачамі. На першых беларускіх рэпліках ("Нора" паводле "Лялечнага дома" Г. Ібсена — адна з новых пастановак тэатра па-беларуску. — Рэд.) — шэпт па зале, шамаценне, нейкі агульны выдых... Але толькі аднойчы я заўважыла, як чацвёра маладых хлопцаў падняліся ды выйшлі. Ціхусенька... Мне прыемна нарэшце іграць па-беларуску. Я не ўмею думаць па-беларуску, я магу толькі вывучыць ролю і старацца, каб словы не разыходзіліся з дзеяннямі, каб гучалі натуральна, арганічна, зразумела, але размовы, плёткі (іх чуваць па Гародні) пра няразвітасць, абмежаванасць мовы беларусаў, мяркую, трэба ўжо спыніць. Сыграйце аднойчы ў п'есе Ібсена па-беларуску, і вы самі пераканаецеся, як мяняецца свет, і вы самі засведчыце недарэчнасць "моўнага пытання"... Я іграю. Іграю і часам думаю, што мае каменьчыкі-цаглінкі ўжо кладуцца ў падмурак тэатра будучыні (нават нацыянальнага, бо ён жа не аднаму Мінску належыць, праўда?). Мо гэта мой абавязак зямлі, чый хлеб ем? Не ведаю, што трэба рабіць, як, але тэатр можа зрабіць, каб слова не знікала...

— Людміла, штосьці вартае ролі Норы — паводле маштабу, важкасці, — вам ужо прапанавалі?

— Не. Ды Нора асобна стаіць. Перад кожным выхадам проста малюся, каб Бог даў мне сыграць душою, каб не адною тэхнікаю ды досведам залу браць, каб іграць на дыбачках, на цырлах, на адным подыху...

— Ці ходзяць на спектаклі з вашым удзелам дзеці? Ці хочацца вам працаваць для дзяцей? Гадаваць ды ўплываць на свядомага будучага гледача?

— Я з радасцю працую ў дзіцячых спектаклях, ніколі ад іх не адмаўляюся. Мая дарослая дачка багата іх паглядзела (цяпер, мяркую, будзе глядзець са сваім дзіцем разам). Аднак хто-хто, а акцёрскія дзеці не надта даюць веры казкам ды цудоўным гісторыям: яны бачаць закулісную частку кожнай з іх... Бачаць, часам пазбаўленыя звычайных дзіцячых радасцей. Ну, калі мама ў строі з казкі магла імчаць на таксоўцы дахаты, бо дзіця не адказвае на тэлефонныя званкі... Усё было. Прынамсі, дачцэ маёй у голаў не прыходзіла звязаць жыццё з тэатрам.

— А як... вам зайшло?

— Я з сям'і вайскоўца. Ішла неяк... зусім у іншае месца, а трапіла ў тэатральны інстытут. Да Маланкіна. Узялі мяне вучыцца адразу, хоць, мяркую, шмат чаму я не адлавядала. Маланкін так і казаў: "Вось наша Людачка, што паходжаннем ад паравога ацяплення". Шмат жартаваў, але ставіўся да нас строга. І любіў, любіў сваіх студэнтаў. Я цяпер маю нахабства думаць, што была адной з улюбёных ягоных студэнтак...

— Жыццё ў Гародні падтрымлівае існаванне актрысы (пра заахвочванне актрысы-зоркі, шкада, казаць не выпадае)?

— Калісьці я іграла Ніну Зарэчную ў "Чайцы", — цяпер дайшла чарга да Машы... Мне дастаткова тэатра. Я не прагну, каб мяне пазнавалі ў тралейбусе. Напэўна, я чалавек самадастатковы. Уладзімір Андрэевіч Маланкін заўжды казаў, што "наша Людачка зможа працаваць толькі ў добрым тэатры": я ж пяць разоў намагалася шукаць лепшага. Ды застаюся ў Гародні...

Гутарыла
Жана ЛАШКЕВІЧ

Гродна—Мінск



На здымках: Людміла Волкава — на сцэне.

Фота А. КАСАРСКАГА

Кіно

КРАЙ, ДЗЕ КОЛЕРЫ ЗНІКЛІ...

Не так даўно ў Доме літаратара адбыўся паказ дакументальнага фільма студыі "Летапіс" — "Край перакуленых нябёсаў" рэжысёра Сяргея Пятроўскага.

Колеры зніклі. Іх і так небагата было ў нас апошнім часам — яркіх ды сакавітых. Палітра чорна-белага фільма як мага лепей адпавядае сёлетняй шэрай вясне, ад якой не выпадае чакаць нічога добрага.

Васіль Быкаў пазбягае глядзець у аб'ектыў. А калі зрэдку скіроўвае туды погляд, а праз яго на нас, гледачоў у зале, то вытрымаць выраз ягоных вачэй няпроста. Асноўныя дзеючыя асобы стужкі — невялічкае лясное возера, вогнішча, старая пакінутая сялянская хата і вочы пісьменніка. А яшчэ — яго голас. Глухаваты, някідкі.

— Кожны народ плаціць сваю цану. Беларусы, відаць, яшчэ не даплацілі. Яны яшчэ мала набілі гузакоў.

Быкаў нібыта ні да каго не звяртаецца, разважае сам з сабою. Але рэжысёр не спяшаецца змяніць кадр, трымае паўзу пасля сказаных слоў — на вачах пісьменніка. Бо тыя гавораць больш за словы.

— Калі Маісей сорак год вадзіў свой народ па пустыні, дык у іх была мэта. У беларускага народа такой мэты няма...

Неба — яшчэ адзін значны акцэнт фільма. Гледача прымушаюць разглядаць неба праз ваду лясного возера. Перакуленае ў возера неба куды больш спакайнейшае за тое, што наверсе. Там шпарка бягуць ці то аблокі, ці то густы дым. Непрыемнае, трывожнае пачуццё. Прырода ў фільме мае не меншую сэнсавую нагрузку, чым словы і вочы Быкава. Чаму раней не заўважалі мы такую прыроду? Доўга і ўважліва ўглядаемся мы ва ўзоры парэпанага бервяна пакінутай хаты. Замок на дзвярах. Іх даўно не адчынялі. Тут вырас хлопчык Васіль?

— Бог вернецца на Беларусь тады, калі яго папросяць. Відаць, яго яшчэ не папрасілі...

Памятаеце, "На Беларусі Бог жыве?.." Быкаў абвяргае гэта: Бог пакінуў Беларусь.

Дзесьці я ўжо бачыў гэтую хату, гэтае возера, вогнішча. Відэашэраг у стылі Таркоўскага прымушае думаць, згадваць: дзе, калі? У дзяцінстве.

— У кожнага ў дзяцінстве павінна быць сваё азярко...

А калі не было?

Недзе гады чатыры таму пацягнула мяне туды, дзе маё азярко дзяцінства, пра якое гаварыў Быкаў. Доўга не мог прыгадаць, круціўся, шукаў. Няма азярка, сцерла меліярацыя. Няма і Барысінага Моха з усімі ягонымі сажалкамі. Адно суцэльнае бясконцае саўгаснае поле з недабраным, пакінутым на зіму парыжэлым ільном. І хата. Напаўразбураная, аточаная пустазеллем у рост чалавека. Такая ж, як у фільме...

І зноў — вочы Быкава. Ён маўчыць. Пад бліскавіцы маланак і грукат навальніцы дождж залівае вогнішча. Ад галавешак ідзе не то дым, не то пара. Але ці захавалася там хоць ясачка цяпла, якое некалі было агнём? Не разгледзець; колеры зніклі.

Што адбываецца з народам, які не чуе, не хоча чуць?..

Ю. КОПЦІК

ЛІМ
ЧАСАПІС

ЛІСТ АД ЯЎТУХОВІЧА

ЗБОРНІК ПЕСЬНЯЎ
КАМПАЗЫТАРА
ЗЬМІЦЕРА ЯЎТУХОВІЧА

НЮ ЁРК 1994 САЎТ РЫВЭР

Выданьне часопіса "Беларуская Думка"

Таямнічы пакет, які трапіў да мяне "з аказіяй", аказаўся пісьмом ад Зміцера Яўтуховіча. Года паўтара мінула, як атабарыўся ён у Амерыцы, у тым самым Саўт-Рыверы, дзе некалі гасцяваў. Жонка ягоная ўладкавалася на працу рэгентам у Беларускую царкву св. Еўфрасінні: за гэта мае заробак ды бясплатную кватэру для сям'і. Дачка ходзіць у школу. Сам Змітрок мае, так сказаць, некваліфікаваную, цяжкую, але пастаянную працу. Пра перспектывы яго кампазітарскай кар'еры меркаваць не магу: для гэтага трэ было б пагутарыць з ім. Дый увогуле — проста хацелася б пабачыцца ды пагаварыць з ім, таварыскім, "лёгкім", добрым хлопцам, адораным на рэдкасць багатымі музыканцкімі вартасцямі.

Хто ведае: мабыць, наш таленавіты "ўцякач" верне сябе музыцы, вернецца й на радзіму... Пакуль жа, дзякуй Богу, мы не адгароджаныя "жалезнай заслонай" ды вядомымі ідэалагічнымі прымхамі. Песні Зміцера Яўтуховіча па-ранейшаму ці не штодня ў эфіры: "Пяшчота", "А ў гасцях", "Даставай, Язэп, гармонік", хрэстаматыйная ўжо "Калыханка" ды інш. А ў сваім лісце Змітрок паведаміў пра выданне зборніка ягоных песень, падрыхтаванае дзякуючы прэзідэнту Беларуска-амерыканскага цэнтра ў Саўт-Рыверы Жоржу Навумчыку. У зборнік уключана 40 песень, з іх 18 — для дзяцей. Выданне аздоблена малюнкамі, фотаздымкамі. Апроч папулярных у нас твораў ёсць тут і новыя песні на вершы Л. Пранчака, М. Кавыля, лімаўца Ю. Свіркі, А. Бярозкі, С. Панізніка. З часам Зміцер мяркуе перадаць мне гэты зборнік, а пакуль жа даслаў ксеракопіі асобных яго старонак. Прынамсі, той, дзе паведамляецца, што можна заказаць нават касеты з песнямі Яўтуховіча, дзве розныя: для дзяцей і для дарослых. Раптам хтосьці такую магчымасць мае — тады звярніце ўвагу на адрас: ЗША, "Bielaruskaya Dumka" P. O. Box 26, South River, N. J. 08882.

С. БЕРАСЦЕНЬ

ПРЫГАЖОСЦЬ, ПАДКАЗАНАЯ ПРЫРОДАЙ

У Лідскай карціннай галерэі адкрыта другая за гэты год выстава віцебскіх мастакоў. На гэты раз — "Віцебская акварэль. Традыцыі і сучаснасць". Менавіта акварэль — адна з яркіх і цікавых з'яў, якая паспяхова развіваецца ў агульным рэчышчы віцебскай мастацкай школы.

Усе ўдзельнікі выставы — прафесійныя мастакі і да таго ж мастакі-акварэлісты. У экспазіцыі — работы васемнаццаці аўтараў. Сярод іх І. Сталяроў, Ф. Гумен, Г. Шутаў, В. Ральцэвіч, В. Ляховіч, А. Шыёнак, М. Ляўковіч, В. Шапо, А. Карпан і іншыя.

Пры ўсёй своеасаблівасці кожнага з аўтараў іх аб'ядноўвае выяўленчасць мыслення, якая ідзе ад прыродных форм. Яны тонка адчуваюць і дасканала перадаюць настрой, шматвобразныя станы пейзажаў беларускай зямлі.

Выстава карыстаецца нязменнай цікавасцю ў наведвальнікаў. Бо прырода, па словах Канта, акрамя карыснага, шчодра пасылае нам прыгажосць, і за гэта мы любім яе, і адчуваем, што ў гэтым сузіранні робімся больш высакароднымі...

Ларыса ДРАКО
г.Ліда

А.Шыёнак, "Зіма ля возера Дашкава".
Фота А. СЕРАБРАКОВА

Віншуем!

Івану КІРЭЙЧЫКУ — 60



Нарадзіўся Іван Кірэйчык у вёсцы Гута Ганцавіцкага раёна, скончыў у 1965 годзе тагачаснае аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў газетчыкам, на тэлебачанні, можна сказаць, сваім чалавекам быў і на радыё... Выступаў з нарысамі, рэпартажамі, замалёўкамі, у якіх расказваў пра лепшых людзей, у тым ліку і тых, хто жыве на Палессі. А ў душы жыло жаданне выйсці за межы прывязанасці да пэўных фактаў, асобных біяграфій. Так пачалі з'яўляцца апавяданні І. Кірэйчыка, а да ўсяго, улюбёны ў паэзію, і сам пачаў пісаць вершы.

Цяпер І. Кірэйчык жыве ў Гомелі і, зразумела, у яго творчасці знайшла належнае адлюстраванне і чарнобыльская тэма. Дарэчы, кранулася яна і вершаў, у чым пераконвае і кніга "З маіх крыніц", што стала і свайго роду аўтарскай справаздачай перад 60-годдзем. На мастакоўскім жа рахунку пісьменніка і іншыя выданні — "Багацце душы — людзям", "Пялёсткавы бераг", "Каласам хіліцца долу", "Калінавая замець"...

Віншуем Івана Аляксандравіча з юбілеем! Зычым яму новых поспехаў, новых твораў!

Навуму ЦЫПІСУ — 60

Як пісьменнік, якому ўдаецца стварыць яркія, запамінальныя характары, Н. Цыпіс заявіў аб сабе ў кнізе апавяданняў "Недзе ёсць горад", якая выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў 1979 годзе. Праўда, на той час аўтара нельга было ўжо назваць у літаратуры навічком. Прынамсі, у 1976 годзе ў гэтым жа выдавецтве пабачыла свет яго кніга "Прыгавор", напісаная Н. Цыпісам разам з Г. Кругловым. Яе склалі аповесці — "Прыгавор" і "Ціхія кіламетры", у аснову якіх былі пакладзены сапраўдныя факты, расказвалася пра дзейнасць праваахоўных органаў (дарэчы, гэтая тэма будзе Навуму Фраімавічу не чужой і ў далейшым).

І ўсё ж якраз з'яўленне апавяданняў засведчыла, што ў літаратуру прыйшоў менавіта пісьменнік, а не проста літаратар ці публіцыст. Гэта адчуў і на гэта звярнуў увагу строгі і патрабавальны У. Караткевіч. Незабыўны Уладзімір Сямёнавіч, даючы Н. Цыпісу рэкамендацыю для ўступлення ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, пісаў: "Канчаткова пераканала (і чытачоў) у тым, што маем перад сабою дужа здольнага і арыгінальнага аўтара, кніга Н. Цыпіса "Недзе ёсць горад". Я сам рос у невялікім гарадку і таму поўнасцю здолеў ацаніць і шматкаляровае (хаця і далёка не вясёлкавае) апісанне побыту і людзей горада, трагізм і камізм у яго нялёгкім жыцці, іскрысты гумар, багатую моўную стыхію".

Навум Цыпіс нарадзіўся ў горадзе Казацін Вінніцкай вобласці, у 1960 годзе закончыў Курскі педагагічны інстытут. Сталася так, што лёс звязаў яго з беларускай зямлёй. З першымі творамі выступіў у друку ў 1966 годзе. І апавяданні, і аповесці, і нарысы Навума Фраімавіча — гэта, як правіла, уменне не проста знайсці сваю тэму, а і раскрыць яе так, каб чытач сам як бы ўжыўся ў асяроддзе, пра якое гаворыць аўтар. У гэтым сэнсе асабліва вылучаюцца тыя нарысы Н. Цыпіса, праблемныя артыкулы, у якіх ён задумваецца над пытаннямі выхавання падрастаючага пакалення. Зноў жа — герояў ён не шукае. Пэўны час Навум Фраімавіч сам працаваў у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі рэспублікі, ведае праблемы, якія ўзнімае ў творах праўдзіва, публіцыстычна завострана.

Арыгінальным атрымаўся ў яго і раман "Балканская рама", які з'явіўся ўслед за кнігай аповесцяў і апавяданняў "Старыя дарогі". Гэтым разам пісьменнік перанёс чытача ў адну з палат навукова-даследчага інстытута траўматалогіі. Сам вобраз балканскай рамы — спецыяльнага прыстасавання, што размяшчаецца над ложкам хворага, — набыў сімвалічнае гучанне. Ратуе людскія душы не толькі гэтая "рама". Ратуе іх моцная сіла волі, таварыскасць.

Сёлета ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" выходзіць новая кніга Н. Цыпіса "Іду і вяртаюся". Аповесці, што склалі яе, на новым матэрыяле і адначасова на больш высокім псіхалагічным узроўні працягваюць праблематыку папярэдніх твораў аўтара. Тут і вяртанне ў ваеннае маленства — галоднае, халоднае, а таму бязрадаснае, і жорсткая праўда аб жыцці навучэнцаў прафтэхвучылішчаў, само жыццё, падгледжанае пільным вокам пісьменніка, якому ёсць што сказаць і які ўмее гэта рабіць па-свойму прывабна і пераканаўча.

З днём нараджэння, Навум Фраімавіч! Поспехаў Вам на нялёгкіх жыццёвых і творчых дарогах!

ЗАБІТЫ Ў МІНСКУ

Наш зямляк Саламон Міхайлавіч Міхоэлс (ён нарадзіўся 16 сакавіка 1890 года ў г. Дзвінску былой Віцебскай губерні) калі і мае патрэбу ў прадстаўленні і рэкамендацыях, дык, бадай, толькі для маладога чытача, бо для людзей сталага ўзросту ён чалавек амаль што легендарны. Яшчэ да Айчыннай вайны — народны артыст СССР, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага яўрэйскага тэатра, у гады ваеннага ліхалецця — старшыня Антыфашысцкага яўрэйскага камітэта. Жыццё яго трагічна завяршылася ў ноч з дванаццатага на трынаццатае студзеня 1948 года ў Мінску, куды ён прыехаў як член дзяржкамітэта па Сталінскіх прэміях для прагляду спектакляў "Канстанцін Заслонаў" у Беларускім акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы і оперы "Алеся" ў Беларускім дзяржаўным оперным тэатры.

У дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь адшукаліся шэсць рукапісных старонак на рускай мове пад загалоўкам "Мудрая поговорка", якія вайшлі з-пад пяра беларускага літаратара Іларыёна Барашкі. У іх расказваецца пра сустрэчы з народным артыстам СССР Саламонам Міхоэлсам падчас працы аўтара рэдактарам кінастудыі "Савецкая Беларусь" у Ленінградзе і ў Галоўным упраўленні па кантролі за відовішчамі і рэпертуарам Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў СССР.

"Михоэлс направлялся в Минск по делам Комитета по присуждению Сталинских премий, — пісаў І. Барашка. — Я ехал в Минск для участия в проведении смотра художественной самодеятельности трудовых резервов Белорусской ССР. С нами в мягком вагоне курьерского поезда возвращался домой Заир Исаакович Азгур, народный художник БССР, известный советский скульптор. В купе разговорились. О творческом подвиге, о мастерстве, о везении в жизни, о заслуженной и незаслуженной славе. И тут в разговор вступил Соломон Михайлович: "Моя мать, знавшая десятки еврейских и белорусских песен, сотни сказок, тысячи еврейских и белорусских пословиц и поговорок, часто мне повторяла: "Не той Саламон, якому шанцуе, а той Саламон, які працуе!". И я тружусь, тружусь безустанно, изо дня в день, памятуя мудрый наказ моей матери..."

Афіцыйнае тлумачэнне смерці С. Міхоэлса — аўтамабільная катастрофа. Але ці не з першых дзён пасля трагедыі папаўзлі чуткі аб далучанасці да яе органаў КДБ.

Заслона над тайнай гібелі С. Міхоэлса была прыўзнята толькі пасля смерці тырана, ды і то падрабязнасці гэтай чорнай справы ад шырокай грамадскасці былі схаваныя.

Нядаўна ў "Аргументах и фактах", а потым і ў часопісе "Новый мир" апублікаваны архіўны дакумент, які ўяўляў сабой ліст члена Палітбюро ЦК КПСС Л. Берыі, адрасаваны тагачаснаму старшыні Саўміна Г. Малянкову ад 2 красавіка 1953 года. У тым лісце, які тычыўся абставін гібелі С. Міхоэлса, галоўны кат краіны крывадушна пісаў, што "убийство Михоэлса и Голубова (тэатральны крытык, які прыехаў з Міхоэлсам. — **І. Р.**) является вопиющим нарушением прав советского гражданина, охраняемых Конституцией СССР". У лісце прыводзілася тлумачэнне міністра дзяржаўнай бяспекі БССР Л. Цанавы: "...зимой 1948 года в бытность мою Министром госбезопасности Белорусской ССР, по ВЧ позвонил мне Абакумов (міністр дзяржбяспекі СССР. — **І. Р.**) и спросил, имеется ли у нас возможность для выполнения одного важного задания И. В. Сталина? Я ответил ему, что будет сделано... Убийство Михоэлса было осуществлено в точном соответствии с этим планом... примерно в десять часов вечера Михоэлса и Голубова завезли во двор дачи. Они немедленно с машины были сняты и раздавлены грузовой автомашиной. Примерно в 12 часов ночи, когда по городу Минску движение публики сокращается, трупы Михоэлса и Голубова были погружены на грузовую машину, отвезены и брошены на одной из глухих улиц города. Утром они были обнаружены рабочими, которые об этом сообщили в милицию".

А неўзабаве ў Маскве пачаўся працэс над членамі Антыфашысцкага яўрэйскага камітэта, працэс, што ўвабраў у сваю арбіту самых вядомых дзеячаў яўрэйскай інтэлігенцыі — вучоных, пісьменнікаў, артыстаў, якіх абвінавачвалі ў яўрэйскім нацыяналізме. Саламон Міхоэлс з-за свайго вялізнага міжнароднага аўтарытэту ў гэтую групу "зланчынцаў" не "ўпісваўся" і таму быў знішчаны загадзя. Што тычыцца тых, хто праходзіў па нагаданым вышэй працэсе, дык пераважная большасць з іх была расстраляна.

І. РЭЗНІК

Здымак І. Ароцкера, які мы прапануем увазе чытача, уваскрашае апошні прыезд С. Міхоэлса ў Мінск. У першым радзе, злева направа: І. Барашка, С. Міхоэлс, Г. Глебаў. Другі рад: дырэктар Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР Я. Гольдшвары, акцёр гэтага тэатра М. Рывін, галоўны адміністратар тэатра імя Я. Купалы А. Гайдарын і У. Голубаў.

ШЭСЦЬ ІМГНЕННЯЎ "ВЯСНЫ"

9 МАЯ Ў МІНСКУ ЗАВЯРШЫЎСЯ ТРАДЫЦЫЙНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Праўда, насуперак традыцыі, сёлетняя "Мінская вясна" зацягнулася. Пачатак яе прыпаў на першыя красавіцкія дні, фінальны акорд прагучаў разам са святочнымі залпамі салюту ў гонар 50-годдзя Перамогі. Гэта, вядома ж, невыпадковае супадзенне: неабсяжная і стракатая афіша фестывалю прысвячалася менавіта вялікаму святу перамогі над фашызмам у той страшнай вайне...

Праз нейкі час, калі аціхне хваля эфемерных эмоцый, калі адступяць неабавязковыя, сумятлівыя думкі, а застануцца толькі самыя ўражлівыя назіранні, самыя кранальныя пачуцці, мы яшчэ пагаворым пра "Мінскую вясну-95". Сённяшні ж "ЛіМ" прысвяціў сваю старонку менавіта першым уражанням — тым "спыненым імгненням", з якіх і ткалася адмысловае стракатае музычнае палатно вясны. На гэтым няўгледным сімвалічным палатне пракрэсліваліся рысы чалавечых страсцей і трагедый, матывы Веры і Вечнасці, узоры зямных каштоўнасцей і старых, як свет, спакус... Гэтае няўгледнае і абагульненае гукавое палатно, здаецца, працінала магутная тэма Радасці Жыцця, цуду стварэння Чалавека, імкнення да гармоніі ў душы, да міру — наўкол... Згадайма аўтарскія вечары беларускіх кампазітараў, якія звярнуліся да сваіх слухачоў на самым высокім, духоўным, узроўні: літургічныя харавыя творы С. Бельцюкова, А. Залётнева, новая сімфонія для хору, аркестра і салістаў "Паўночныя кветкі" — А. Мдзівані. Згадайма філарманічныя канцэрты з удзелам будучых прафесійных музыкантаў — студэнтаў Беларускай акадэміі музыкі, навучэнцаў Рэспубліканскага ліцэя пры акадэміі. Згадайма гасцей, якія завіталі на фестываль з Германіі, Расіі, Францыі, Швейцарыі, каб праз таямніцу музычнай творчасці зведаць рэдкасныя хвіліны духоўнага людскога яднання — са сваімі беларускімі калегамі, з чулымі нашымі слухачамі...

Вось некалькі фотаздымкаў, якія, вядома ж, не адлюстроўваюць і сотай часткі размаітых фестывальных імгненняў. Аднак угледзьцеся ў іх пільна, і, магчыма, вам адкрыецца просты і мудры сэнс "Мінскай вясны", праведзенай у такі неспрыяльны для Культуры час, прысвечанай Перамозе над кашмарам вайны, над пачварнасцю духу, над цемрашальствам, праведзенай годна — і з вераю ў тое, што "сон розуму" не будзе доўгім.

С. БЕРАСЦЕНЬ

На здымках вы, безумоўна, пазнаеце артыстаў Акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча, яго салістаў — баяністку Святлану Лясун ды "майстра на ўсе рукі" Аляксандра Крамко, у гонар якіх быў зладжаны бенефіс, пазнаеце і дырыжора — маэстра Міхала Казінца. Цікавае імгненне — размова настаўніка з вучнем, размова двух прафесароў-кампазітараў, Анатоля Багатырова ды Андрэя Мдзівані. Трубач Петэр Шэрэр, наш госць з Германіі, выступаў у дуэце са сваім суайчыннікам арганістам Яганэсам Гефертам, поруч з якім і сфатаграфаваў яго наш карэспандэнт.

Фота Віт. АМІНАВА



ХВАЛЯ ДАКАЦІЛАСЯ І ДА НАС

Жаночае цела — галоўны натхняльнік усяго сусветнага мастацтва. Ды і не толькі мастацтва. Па Фрэйду, дык цывілізацыі ўвогуле. Быў час, калі эротыка была ў нашым грамадстве па-за законам. А калі мастак без гэтага ў творчасці не мог, дык ён быў вымушаны гвалціць сваю псіхіку, спрабуючы ўплішчыць эратычныя матывы ў рэвалюцыйную альбо вытворчую тэматыку.

Цяпер у гэтым сэнсе свабода. І ўсё, праз што ўжо прайшлі нашы суседзі (хто раней, хто пазней), становіцца здабыткам культурніцкага працэсу і на Беларусі. Мастацкая акцыя "Пранікненне", што праходзіла ў лютым у памяшканні мінскага Дома афіцэраў, магчыма, стане пачаткам новага для нашага мастацтва напрамку — "бодзі-арт". Праўда, гэта толькі ў пэўным сэнсе можна лічыць мастацтвам выяўленчым. Гэта нешта на мяжы са сцэнічнай дзеяй. Здзейсненае Алесем Эроцічам і Андрэем Вераб'ёвым было цікавым па рэжысёрскай задуме, але ў выкананні адчуваўся дылетантызм.

Цікава, аднак, што ўсё часцей мастакі, якіх вучылі традыцыйнай трыядзе "прыгожых мастацтваў" — жывапісу, графіцы, скульптуры, усё часцей звяртаюцца да мастацтва дзеяння, дзе выяўленчы элемент толькі адзін з кампанентаў (прычым, неабавязкова галоўны). Ці то гэта своеасаблівая рэакцыя на абыякавасць публікі, разбэшчанай "сацыялістычным рэалізмам", ці то — праява новага мыслення, пошук свайго месца ў посткамуністычным свеце...

П. В.

З НАМІ ГАВОРЫЦЬ... КАЗІМІР МАЛЕВІЧ

Такую магчымасць прадаставіў у трэцім нумары часопіс "Мастацтва". Л. Налівайка адшукала ў Маскве тэкст брашуры слыннага мастака "Супрэматызм", пісаны рукой самога аўтара, і пераклала яго на беларускую мову. Пра віцебскі перыяд К. Малевіча разважае ў артыкуле "Унікальны шанц сусветнай культуры" А. Малей. Гэтыя матэрыялы, а таксама артыкул М. Баразны "Праз паслядоўнасць да рэальнага выбару" прадстаўлены ў раздзеле "Эстэтыка".

Багаты на публікацыі і раздзел "Выяўленчае мастацтва": "Ці стане пленэр міжнародным?" М. Пагграноўскага, "Апошні аргумент" Т. Копшы, "Уітменаўскі эпізод у творчасці Джэксана Полака і ў амерыканскім жывапісе".

Шырока прадстаўлены раздзел "Музыка". В. Дадзіёмава ("На мяжы стагоддзяў і эпох") знаёміць з сусветна вядомым кампазітарам В. Казлоўскім, які паходзіў з Беларусі. А. Саладухін выступае з артыкулам "Францыск Скарына як выразнік музычна-эстэтычных поглядаў свайго часу". Д. Падбярэзскі прапануе чарговыя раздзелы з нявыдадзенай кнігі па гісторыі музычнага шоу-бізнесу ("Хто ўкраў парасё, альбо Як напісаць чужую песню"). Ён жа дзеліцца ўражаннямі ад фестывалю джазавай музыкі ("Тры дні "хатняга" джаза").

У раздзеле "Тэатр" — рэцэнзія Б. Бур'яна на спектакль "Лес" А. Астроўскага ў тэатры імя Я. Купалы ("І радуе, і дзівіць"), артыкул А. Савіцкай "Увага: дзеці", гутарка Л. Грамыкі з народнай артысткай Беларусі В. Клебановіч ("На сцэне пошлае тое, што неталенавітае...").

Ёсць у нумары традыцыйныя раздзелы "Мастацкае фота", "Народнае мастацтва", "Рэцэнзіі", "Падзеі, факты, інфармацыя".

Версіі

БЕЛЫ, ЧЫРВОНЫ, ЧОРНЫ...

СІМВОЛІКА КОЛЕРАЎ ГЕРБА "ПАГОНЯ" І БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТА: ЧЫТАЮЧЫ "УПАНІШАДЫ"

Узяцца за паглыбленае вывучэнне сімволікі колераў цяперашняга беларускага герба і беларускага арнамента мяне, па сутнасці, прымусіла родная дачка Вольга, вучаніца 10 класа. Да заняткаў факультатыва "Практычная журналістыка", які вядзецца ў нашай школе, яна падрыхтавала рэферат, змест якога мяне надзвычай зацікавіў. Вось яго прыкладны змест.

... На Беларусі існуе вельмі шмат навуковых даследаванняў пра паходжанне і сімволіку герба "Пагоня". Яшчэ больш напісана кніг пра нацыянальны беларускі арнамент. Але мала хто з даследчыкаў звяртаў увагу на колеры нацыянальнай сімволікі. Ды ў старажытнасці нічога адвольна не рабілася. Кожны колер меў сваё сімвалічнае значэнне.

Як мы памятаем, на беларускім гербе і арнаменце спалучаюцца два колеры: белы і чырвоны, а на вышыўцы — тры: белы, чырвоны і чорны.

Паўстае пытанне: "Чым выклікана такая розніца?"

Растлумачыць жа сімволіку колераў і істотную розніцу іх спалучэння на гербе "Пагоня" і нацыянальнай вышыўцы, як ні дзіўна, можа толькі помнік старажытнаіндыйскай літаратуры "Упанішады".

Чаму менавіта "Упанішады"?

Цяпер дакладна вядома, што нашы далёкія продкі былі выхадцамі з Індыі. Беларусы, як і ўсе славяне, а таксама немцы, шведы, англічане, французы і іншыя еўрапейскія народы, адносяцца да індаеўрапейскай моўнай сям'і.

Назва кнігі "Упанішады" даслоўна абазначае "Каля пана седзячы" (У-пана-сяду). У старажытнай Індыі забаранялася запісваць легенды аб паходжанні багоў, і таму вучні, седзячы перад жрацом на каленках, слухалі і запаміналі яго павучанні. І толькі намнога пазней усе гэтыя паданні былі запісаны.

Пазнаёміўшыся з "Упанішадамі", я са здзіўленнем заўважыла ў іх тлумачэнне колераў нашай нацыянальнай сімволікі. Так, у "Чхандог'я упанішадзе" гаворыцца, што чырвоны колер — гэта вобраз агню, жару, Сонца, Месяца, маланкі і мовы. Беламу колеру адпавядаюць вобразы вады і дыхання, а чорнаму — ежы і зямлі.

"Ваджрасучыка упанішада" сцвярджае, што "брахман (уяўляецца істотай) белага колеру, кшатрый — чырвонага колеру, вайш'я — жоўтага колеру, шудра — чорнага колеру".

Брахманы (жрацы) лічыліся ў старажытных арыяў вышэйшай кастай грамадства, звязанай з усім боскім, духоўным. Белае адзенне і сімвалізавала іх духоўную чысціню.

Кшатрый (коннік, вершнік) лічыўся членам саслоўя (варны) правіцеляў і воінаў. Чырвонае адзенне князя і цара сімвалізавала актыўнасць валадара, сувязь яго з богам вайны і маланкі, а таксама сувязь з багамі Сонца, Месяца і Агню.

Вайш'і — прадстаўнікі саслоўяў вольных сялян і гандляроў, а шудры (рабы) не мелі ў арыйскім грамадстве ніякіх правоў.

Напэўна, менавіта таму на гербе "Пагоня", які ў старажытнасці мелі толькі князі і іх дружына, суседнічаюць толькі два колеры: белы і чырвоны, бо сімвалізуюць адзінства ўлады князёў і жрацоў. Жоўтаму і чорнаму колерам там не было месца: гэтыя саслоўі былі ў поўным падпарадкаванні двум вышэйшым.

Чорны ж колер прысутнічае на вышыўцы простых людзей — сялян, якія лічыліся ў той час самым ніжэйшым саслоўем.

Магчыма, што і паходжанне назвы "Белая Русь" звязана з сімволікай колераў старажытных арыяў...

Яшчэ раз уважліва прачытаўшы рэферат і добра праштудзіраваўшы трохтомнае выданне "Упанішад", я зразумеў, што гіпотэза, выказаная дачкой, мае поўнае права на існаванне. Мала гэтага. Я поўнасцю ўпэўніўся, што толькі адсутнасць спецыяльных ведаў у галіне старажытнаіндыйскай філасофіі не дазволіла ёй яшчэ болей наблізіцца да ісціны, перавесці гіпотэзу на ўзровень адкрыцця. Справа ў тым, што ў старажытных арыяў, нашчадкамі якіх з'яўляюцца амаль усе народы Еўропы, сімволіка колераў была больш глыбокай, чым аб гэтым было сказана ў рэфераце, і дасягала філасофскіх абагульненняў.

У "Швенташватара упанішадзе" я знайшоў яшчэ адну вытрымку, дзе сцвярджалася, што "існуе ненароджаная, адзіная, чырвоная, белая і чорная, якая нараджае шматлікае патомства, падобнае на сябе.

І адзін ненароджаны, які любіць, ляжыць побач, другі ненароджаны пакідае яе, адчуўшы асалоду" (т. 2, с. 123).

У расшыфроўцы сэнсу гэтай цытаты дапамог каментарый да упанішады і тая літаратура па старажытнаіндыйскай філасофіі, якая сабралася ў маёй асабістай бібліятэцы за доўгія гады работы настаўнікам і захаплення краязнаўствам.

Ключавым для разумення сэнсу гэтай цытаты стаў тэрмін "ненароджаная". Аказалася, што старажытныя арыі пад паняццем "ненароджаная" мелі на ўвазе першапачатковую субстанцыю, матэрыяльную прычыну, першапрычыну ўсіх аб'ектаў матэрыяльнага свету, якую яны называлі яшчэ і ПРАКРЫЦІ. Чырвоны, белы і чорны колеры гэтай першапачатковай субстанцыі сімвалізавалі ў ярыяў не толькі агонь, ваду і зямлю (а таксама мову, дыханне і розум; воінаў, жрацоў і рабоў) адпаведна, але і тры якасці пракрыці: раджас ("актыўнасць") — чырвоны колер, саттву ("яснасць, свет") — белы колер, тамас ("цяжкасць, інертнасць") — чорны колер. Гэтыя тры часткі першапачатковай субстанцыі, як лічылі арыйскія жрацы (брахманы), злучыўшыся з духоўным пачаткам, свядомасцю (пурушам), парушылі раўнавагі нежывой існасцю і выклікалі эвалюцыю Сусвету. У міфалогіі **пракрыці** атаясамлівалася з Майяй (ілюзіяй) і **шакці** (сілай) — боскай жаночай энергіяй і нярэдка супрацьпастаўлялася **пурушу** — свядомасці, духу.

Між іншым, такіх уяўленняў пра пачатак развіцця Сусвету і жыцця на зямлі да гэтага часу прытрымліваецца адна з філасофскіх школ Індыі — санкх'я.

А вось як адпавядае пра ўтварэнне нашай Галактыкі і зараджэнне жыцця на Зямлі старажытнаіндыйская легенда.

"Спачатку існавалі толькі свядомасць і матэрыя. Свядомасць (пуруша) нарадзіў Вірадж — жаночы творчы пачатак, жаночы палавы орган. Пасля спалучэння Пурушы і пракрыці ў першапачатковых касмічных водах з'явілася залатое яйка (бог

КЛІЧ РОДНАГА ЗВОНА

(Пачатак на стар. 9)

— Біскупу, святарам мы не павінны замінаць шчыра маліцца за душу нашага дарагога князя, — непарушна адказаў Усяслаў. — Наказ Гаспадара зямлі нашай пачуем на днях.

— Калі, па-твойму, трэба аб'явіць нябожчыкаву волю нават нам? — напаў Расціслаў. — Можа, толькі пасля пахавання?

— Можа.

— Але ж на пахаванне прыедуць князі, баяры з усіх бліжэйшых зямель. Першае, што яны запытаюць у нас, будзе пра тое, як мы самі бачым далейшы лёс сваёй зямлі? Чыйго, якога князя хочам мець на пасадзе ў Навагародку? Але што мы ім адкажам, калі не будзем ведаць нават князевай граматы?

Усяслаў не проста зірнуў, а абпаліў яго варам жывых, іскрыстых вачэй: ён жа ведае князеў наказ, тое-сёе ўжо робіць у тым духу, але не хоча нават намёкам прачыніць уваход да таямніцы, злуе, што хтосьці рвецца туды.

— Не глядзі як воўк на брахлівага сабаку! — пахрабрыўся Расціслаў. — Не ты адзін павінен ведаць і рашаць усё па-свойму. Ты такі ж радца, як і я! Роўныя мы! І род наш баярскі гэтак жа даўні!

— Князева цела яшчэ не астыла, а ты ўчыніў ужо валтузню! — зморшчыўся Усяслаў.

— Князя мы не падымем ужо. А мы, жывыя, дзяржаўныя мужы, павінны думаць і дбаць пра жывое, дзяржаўнае...

Усе астатнія да гэтай спрэчкі даўніх сапернікаў, адзін з якіх трымаўся за князя Данілу Галіцкага, а другі за князя Ізяслава, не далучаліся, слухалі і назіралі за ўсім.

— Думалі, дбалі і будзем думаць ды дбаць пра дзяржаўнае, — Усяслаў упарта не падпускаў нікога да сваіх сакрэтаў. — А пачнём з таго, што зараз жа пашлём ганцоў у Полацк, Ноўгарад, Пскоў, Смаленск, Чарнігаў, Жамойць, Булевічы, Дзяволту, Рушкавічы, Дайнову, Нальшаны, Яцвязію, Куявію, Мазовію, у нашы Ваўкавыеск, Слонім, Гарадзен ды ў Пінеск, Бярэсце, у Літву да Міндоўга...

— А ў Холм, да князя Данілы? — скрывіўся Расціслаў, што Усяслаў так і не назваў сталіцы таго, каго ён назваў бы першым.

— І туды пашлём.

— Зрабіў нарэшце ласку князю Данілу! Уважыў!

Усяслаў на гэты раз змоўчаў, адвярнуўся. Як ад надакучлівай мухі.

— Мне ўсё стала ясна! Ты не хочаш запрашаць сюды князя Данілу! Не хочаш весці з ім ніякіх перамоў!

— Не пахмяліўся, дык пілуе, грызе душу зло? — ухмыльнуўся Усяслаў. — Ці нейкая пошасць і на мазгі перакінулася?

— Мае мазгі як мазгі, а вось у твае пошасць закралася! — не здаўся Расціслаў. — Калі мы жадаем дабра Навагародскай зямлі ці, як вы з гонарам вялікім кажаце, Вялікаму княству Навагародскаму, дык мы павінны нічога не таіць адзін ад аднаго! Верыць, памагаць адзін адному! А вось ты штосьці замышляеш тое, што тоіш ад нас! Чаму? Для чаго? Дзеля сваёй карысці?

— Я сказаў князю Ізяславу сваё слова, прыйдзе час — скажу яго і вам усім, — прамовіў той. — А рашаць у с ё будзем разам. На Радзе і на вечы.

— Не разумею гэтых тваіх таемнасцей! — Расціслаў падаўся з радніцы, а потым услед за сабой так бухнуў дзвярыма, што ажно затрэсліся сцены.

Усяслаў добра ведаў Расціслава, як аблупленага, дык разумеў, чаго той гэтак мітусіцца і шалее, хоча як мага раней уведаць таямніцу граматы князя Ізяслава. Расціслаў, хочучы дабіцца свайго, ужо спрабаваў паслаць у далёкі Холм ганца з весткай пра князеву смерць (ганца за горадам перахапіла яго засада, і той, калі добра ўвалілі па рэбрах і задніцы, прызнаўся, хто яго накіраваў і з чым), а цяпер, канечне ж, хоча паслаць упагон і яшчэ аднаго чалавека, каб той пераказаў Андрэю-дворскаму запавет князя Ізяслава і тое, што збіраюцца рабіць у Навагародку.

Як ён і прадчуваў, Расціслаў не толькі хутка вярнуўся са слотнага двара, а проста ўварваўся ў радніцу. Палахлівец у душы, раней не раз біты Усяславам за розныя правіны, ён, аднак, цяпер быў раз'юшаны, з перакошаным ад гневу і дакукі тварам.

— Цяпер я рузумею! Усё!.. — ажно пырснуў слінай, пазіраючы з нянавісцю заплытымі ад тлушчу і частых выпівак вочкамі. Круглы мясісты твар чырвоны, як бурак.

— Што нарэшце да цябе дайшло? — нібы ў хлапчука спакойна і ў той жа час з насмешкай запытаў ён. Заадно прыкінуўся прастаком.

— Ты абкружыў Навагародак дружынамі, увёў іх у горад! — задыхаўся Расціслаў. — Самадумам! Без нашай згоды!

— Дык што цябе гэтак напалохала? Мой, ваяводскі, клопат пра лад?

— Які лад? Ты паланіў нас, хочаш змусіць

Праджапаці). У залатым яйку нарадзіўся Брахма (бог-стваральнік). Правёўшы ў зачатым яйку год, ён сілаю сваёй думкі падзяліў яго на дзве палавінкі. З адной палавінкі яйка ўтварылася неба, а з другой — зямля. Паміж небам і зямлёю ўзнікла паветраная прастора, а пасля і пяць элементаў, з якіх і складаецца Сусвет (вада, агонь, зямля, паветра, эфір), думка, а яшчэ пазней — багі, ахвярапрынашэнні і г. д. Сам жа бог-стваральнік Брахма далей дзеліцца на дзве часткі — мужчынскую і жаночую" (гл. "Мифологический словарь", с. 99-100).

Аб існаванні ў міфалогіі беларусаў ідэнтычнай легенды сведчыць усім вядомая з дзяцінства казка.

Жылі Дзед і Баба.
Была ў іх Курачка раба.
Знесла Курачка яечка,
Не прастое *яечка,*
А *залатое.*

Дзед біў-біў — не разбіў.
Баба біла-біла — не разбіла.
Бегла *Мышка,*
Хвосцікам махнула —
Яечка звалілася
І разбілася.

Плача Дзед, плача Баба.
А Курачка кудахча:
— Не плач Дзед!
Не плач Баба!
Знясу вам яечка,
Ды не залатое,
А прастое.

На першы погляд здаецца, што існуе вельмі мала агульнага паміж старажытнаіндыйскай легендай аб стварэнні Сусвету і прыведзенай мною казкай. Але падстаўце замест слова "Дзед" — Пуруша, замест "Баба" — пракрыці, Курачка Раба — Вірадж, Залатое Яечка — праджсапаці, Мышка — Думка ("мысль" Брахмы), і вы заўважыце ідэнтычнасць "дзіцячай" казкі і падання старажытных арыяў... Пры гэтым трэба памятаць, што ў старажытных славян, як і ў многіх другіх народаў, сапраўдныя імёны багоў былі табуіраванымі і таму іх нельга было называць марна. Менавіта па гэтай прычыне ў паўсядзённым жыцці і ўжывалі нашы далёкія продкі іншаказанне.

Такім жа іншаказаннем з'яўляецца і абяцанне Курачкі замест залатога яйка знесці простае: за ім крыецца прадказанне з'яўлення жыцця на зямлі.

З вышэйсказанага можна зрабіць толькі адзін вывад: беларускі арнамент сімвалізаваў, акрамя еднасці трох ці чатырох асноўных саслоўяў старажытнага грамадства, таксама і пракрыці, першапачатковую прыродную субстанцыю як крыніцу ўсялякіх выяўленых і нявыяўленых аб'ектаў, тры яе станы, якасці, сілы. Старажытныя арыі, як і нашы продкі, лічылі, што **ўздзеянне гэтых трох якасцей пракрыці вызначалі, наканоўвалі дабрачыннасць, заганы і пасмяротны лёс чалавека.**

Пасля гэтага апошняга сцвярджэння становіцца зразумелай і тая магічная сіла, той магічны сэнс, якім надзялялі нашы далёкія продкі прадметы, упрыгожаныя вышыўкай. Калі пракрыці — прыродная субстанцыя як носьбіт усялякіх праяўленых і непраяўленых аб'ектаў, то і чалавек, што апранаў адзенне з вышыўкай, як бы надзяляўся сілай пракрыці — уласцівасцю даць штуршок развіццю свайго роду.

Як вядома, вельмі вялікую ролю адыгрывалі арнаментаваны ручнік у беларускім вясельным абрадзе.

Дарэнне нявестай ручнікоў на пачатку вяселля дружыне маладога сімвалізавала не толькі ўступленне ў сваяцкія адносіны розных родаў, як сцвярджаюць беларускія даследчыкі, але і пачатак зараджэння новага жыцця, спалучэнне пракрыці з пурушам, жаночага (матэрыяльнага) і мужчынскага (духоўнага) пачаткаў. Гэтую думку пацвярджае і той факт, што ручнікам, акрамя маладой і мужчын, ніхто не перавязваўся. Такі ж магічны сэнс — спрыяць зараджэнню новага жыцця — мелі і іншыя вясельныя звычаі: апаясванне ручнікам жаніха, навязванне ручніка на правую руку нявесты пры дарэнні (правай рукой яна надзяляла ўдзельнікаў вяселля караваем), звязванне нявесты і жаніха ручніком пры вянчанні, засціланне ручніком лавы, на якой сядзелі маладыя на вяселлі, вывешванне маладымі ручніка пасля вяселля ў хлеве на бэльцы (каб жывёла пачала размнажацца ў новай сям'і) і г. д.

Калі выкарыстанне ручніка ў вясельным абрадзе звязвалася з уяўленнямі беларусаў аб спрыянні арнамента падаўжэнню роду чалавечага, то ў пахавальным абрадзе ручнік сваёй магічнай сілай павінен быў "паказаць" дарогу памерламу ў краіне продкаў, а таксама садзейнічаць уваскрашэнню яго да новага жыцця (успомніце звычаі вывешвання ручніка на вуліцы каля акна, дзе стаяла труна з памерлым, апусканне труны на ручніках у магілу, абіванне ўнутранай часткі дамавіны ручнікамі або ўпрыгожванні імі крыжа на магіле памерлага і г. д.).

Арнаментаваным ручніком заўсёды ўпрыгожваўся і кут у хаце, дзе вісела ікона. У гэтым выпадку ён як бы выконваў функцыю цудадзейнай сцяжынкі Бога да людзей, што жывуць у той ці іншай хаце і, магчыма, наадварот — людзей да Бога.

Вернемся да цытаты, прыведзенай мною напачатку, да таго месца, дзе гаворыцца аб двух "ненароджаных".

"І адзін ненароджаны, які любіць, ляжыць побач, другі ненароджаны пакідае яе (пракрыці), адчуўшы асалоду".

Як сцвярджае каментарый да упанішады, пад першым "ненароджаным" маецца на ўвазе неадукаваны, недасведчаны ў пытаннях рэлігіі чалавек, які не можа з-за імкнення да матэрыяльнага вызваліцца з-пад улады пракрыці (першапачатковай субстанцыі). Яго лёс, лёс яго душы — гэта бясконцая колькасць перараджэнняў. Другі ненароджаны — гэта адукаваны чалавек, веды і падзвіжніцкі склад жыцця якога даюць магчымасць пазбавіцца яму ад пакут перараджэнняў і пайсці на сёмае неба да бога (т. 3, с. 280-281), гэта шлях жрацабрахмана — "белага" чалавека.

Як мы бачым, нават воіну, асабліва простаму, рэлігія арыяў спачатку адмаўляла ў праве "размаўляць" з богам. Менавіта таму і не мог з'явіцца чорны колер на сцягу не толькі рабаўладальніцкай, але і феадальнай дзяржавы. Не мог чорны колер на сцягу з'явіцца і па другой прычыне: ён абазначаў яшчэ і адну з якасцей пракрыці — цяжкасць і інертнасць, а таксама зямлю. Дзве другія якасці — актыўнасць (чырвоны колер) і яснасць, свет (белы колер) — пракрыці добра дапасаваліся да функцыянальнай сімволікі сцяга, і, акрамя таго, сімвалізавалі, як было сказана вышэй, саюз воінаў-вершнікаў і жрацоў-брахманаў.

Якія ж высновы можна зрабіць з вышэйсказанага?

1. Сімволіка колераў нацыянальнага сцяга і герба Рэспублікі Беларусь з'яўляецца чыста беларускай і адлюстроўвае гісторыю народа.

2. Веданне значэння колераў сімволікі дасць магчымасць навукоўцам Беларусі вярнуць з нябыту міфалогію продкаў беларусаў часоў язычніцтва.

3. Назва колераў беларускага арнамента мае надзіва цікавае супадзенне з назвамі частак зямель, на тэрыторыі якой у старажытнасці жылі беларусы і ўкраінцы: Белая Русь, Чырвоная Русь, Чорная Русь. Магчыма, што Белая Русь — гэта зямля водапаклоннікаў, Русь жрацоў, боская, любімая вярхоўным славянскім богам Русь; Чырвоная Русь — зямля славян-вогнепаклоннікаў, Русь вершнікаў, а Чорная Русь — зямля славян-землепаклоннікаў, зямля, падпарадкаваная другім плямёнам. Але гэтая гіпотэза патрабуе дадатковага даследавання.

М. БАРАВУЛЯ

м. Старая Слабада,
Крупскі раён

У АДРАДЖЭННЯ СВАЯ ФІЛАСОФІЯ...

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце адбылася навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Філасофія нацыянальнага адраджэння і нацыянальны і агульначалавечы змест". У ёй прынялі ўдзел вядучыя навукоўцы Беларусі. На пленарным пасяджэнні выступілі: А. Лойка, М. Крукоўскі, У. Конан, У. Лукашэвіч, А. Рагуля, А. Грымаць.

Затым адбыліся пасяджэнні ў секцыях "Культуралогія" і "Культура. Асоба. Адукацыя". Першай кіраваў А. Рагуля. Шмат навукоўцаў выступіла з адказамі на розныя пытанні.

На другі дзень секцыйныя пасяджэнні працягнуліся, пасля чаго ўдзельнікі канферэнцыі наведалі Музей старажытнай беларускай культуры АН Беларусі.

Пасля таго, як канферэнцыя завяршыла сваю работу, я сустрэлася з А. Рагуляй і задала яму некалькі пытанняў:

— Чаго чакалі ад гэтай канферэнцыі? Якія задачы ставіліся перад ёю?

— Канферэнцыя была задумана яшчэ паўтара года назад. Нарэшце ў нас з'явілася магчымасць ажыццявіць задуму. Яе задачай было вызначыць шляхі Адраджэння; канферэнцыя пацвердзіла, што абраныя намі напрамкі справядлівыя і нам належыць працягваць ажыццяўляць намечанае. Трэба, каб выхаванне нацыянальнай самасвядомасці пачыналася яшчэ ў дзіцячым садку, там дзеці павінны пачынаць вывучаць беларускую культуру і, пазней, уносіць свой уклад у нацыянальную культуру, у Адраджэнне.

— Ці спраўдзіліся спадзяванні? Што, на ваш погляд, не атрымалася?

— Ніколі нельга сказаць, што ўсё атрымалася, але ў цэлым я задаволены, канферэнцыя прайшла на высокім узроўні, выступалі вядомыя навукоўцы-культуролагі, якія сур'ёзна аднесліся да сваіх прац, былі заслуханы надзвычай цікавыя даклады на востраактуальныя тэмы. На жаль, не прынялі ўдзел літаратуразнаўцы і мовазнаўцы. А ў цэлым канферэнцыя апраўдала сябе.

— Якія ў вас далейшыя планы? Ці чакаюцца яшчэ канферэнцыі?

— У далейшым мы плануем зрабіць канферэнцыі добрай звычкай. Пакуль што нельга вызначыць тэму наступнай, але мяркуецца, што яна будзе прысвечана праблемам ажыццяўлення вынесеных рашэнняў.

Л. ВАСІЛЕНЯ,
студэнтка факультэта беларускай філалогіі і культуры

усіх скакаць пад тваю дудку! Ты спажываеш даверaную табе сілу ў сваю карысць!

— Астудзіся і адсапіся. Сядзь і больш падумай, чым плявузгаць абы-што.

— Ты перахапіў майго ганца ў Холм і без літасці дапытаў яго!

— А хто табе, дабрадзей ты наш, дазволіў такое рабіць без згоды ці волі Рады? — нахмурыў бровы Усяслаў. — Дзеіш такое дабрачынна, без карысці для сябе?

— Я проста хацеў перадаць у Холм жалобную вестку, — пацішэў, але не супакоіўся Расціслаў.

— Не толькі.

— Толькі! — Расціслаў не садзіўся. Паклаўшы руку на стол, тупаў на адным месцы.

— Кінь, — Усяслаў, ведаючы, што нішто яму не пагражае, ад Расціслава ён і сам лёгка абароніцца, без ценю сполаху паставіў локаць на стол, падпёр далонню падбародак. — Кажы такія казкі дзецям, а не мне. Як і пра тое, чаму гэтак прагнеш чым раней уведаць князеў наказ. Для цябе гэта не проста цікавасць, а твая жыццёвая патрэба. Ты хацеў бы бачыць тут не нашы, а Данілавыя дружыны!

— Хацеў бы! — Расціслаў перастаў ужо таіцца, нават зазухарыўся. — І яны рана-позна будуць тут, прывядуць і пасадзяць у нас таго маладога князя, якога прышле Даніла!

— А ты будзеш яму наюджваць на вуха! Рабіць усё, што загадае твая подлая душа!

— Буду! І ўсе вы, ты таксама будзеш у мяне пад кіпцем!

— Не спакушай сам сябе, бо не будзе патвойму!

— Будзе! — Расціслаў, стоячы, пастукаў тоўстым сагнутым сярэднім пальцам па стале. — Ты, нават усе вы можаце цешыцца абы-чым, але князем у Навагародку будзе нейкі Данілаў сын! Мсціслаў, Раман ці Шварн — не важна хто, але з Данілавага роду і дому! Так мне сказаў сам Даніла. А ён ад свайго слова не адрачэцца! Калі наша Рада і веча пойдуць за табою, не згодзяцца на гэта самаахвотна, дык ён узвядзе сына тут на пасад сілаю!

— Ты лічыш, што яе ў твайго апекуна і заступніка хопіць на гэта?

— Калі не хопіць сваёй, дык яе дададуць яму манголы-саюзнікі!

— І ты гаворыш спакойна, нават радасна? — не толькі здзівіўся, але і жахнуўся Усяслаў. — За тое, што Даніла, як некалі Кіеў на Полацк, можа навесці на нас чужынцаў, дзікіх язычнікаў?

— А мне наплываць на гэта! — махнуў рукой той. — Каб тут меў волю Даніла, сядзеў на пасадзе яго сын і мне было ўежна і ўлежна, я гатоў на жываце паўзці ў Холм! Няхай будзе ў нас адзіная дзяржава, няхай усе кланяюцца чужынцам, абы мне было добра!

— Які ж ты мярзотнік! Вырадак!

— А вось я такі навагародзец!

— Чым ты хвалішся?! Лепш бы цябе, сабачае халуйскае адроддзе, маці яшчэ семем на крапіву выкінула!

— Я нарадзіўся на мяжы з Данілавай зямлёю, змалку ўвабраў яе дух, дык я не маю таго гонару, што маеце вы, народжаныя ў цэнтры Навагародскага княства!

— Ты, сволач, мог нарадзіцца і ў любой нары, бярлозе (Хрыстос вунь нарадзіўся ў стойле, у яслях, але даў свету сваё вучэнне), але не маеш права з-за шкурных інтарэсаў здраджваць роднай зямлі, прадзедам і нашчадкам! Нельга ж прадаваць усё гэта святое з-за свайго трыбуха!

— А ты... А ты...

— Ну, што я? Гэтакі ж прадажнік, лёкай, раб у душы, як і ты?

— Ды ведай ты: Даніла ніколі, чуеш, ніколі не адпусціць нас на волю! — ужо нібы павучаў Расціслаў. — Навагародская вольніца — гэта толькі выпадак, невялікі адрэзак часу!

— Ведаю і без цябе, чаго хоча Даніла. Найперш — мець, як і задумалі яго князі-продкі, Навагародак за вароты на Полацак, на Літву. Але, можа, хопіць нам быць дробным грошам у яго хіжых помыслах?!

— Ага! — аскаліўся Расціслаў. — Не хочаш, не хочаш нават паслаць яму вестку пра князеву смерць!

— Ды не спяшаюся.

— І тым больш супраць, супраць, каб тут закняжыў Данілаў сын!

— Супраць!

— І каго ж ты бачыш на нашым пасадзе? Якога літоўскага князя? Войшаля? Таўцівіла? Эдзівіда? Ці яшчэ каго, з палацескай, рагвалодавічавай крывёю?

— Таго, хто будзе служыць найперш навагародскім інтарэсам, хто яшчэ болей пашырыць, амацуе Вялікае княства Навагародскае, будзе абараняць яго ад няпрошаных вызваліцеляў! Хто паспрыяе нам адзяржавіцца як след!

— Дык хто ж, па-твойму, наш месія?

— Ацалелі б сыны князя Ізяслава, дык не шукалі б мы сабе князя на баку, рабілі б сваё далей самі, — сказаў Усяслаў. — Але перасекся Ізяславаў род, дык мусім браць чужынца. Але такога чужынца, які палічыў бы сябе навагародцам, а то і быў яшчэ лепшым навагародцам, чым некаторыя нашы хітруны, прыстасаванцы альбо плюгавыя, нікчэмныя чалавечыкі!

— Дык не варта ўжо таіцца, назаві: хто ж ваш абраннік? Хто ж будзе служыць нам лепш за нас, нягоднікаў?

— Уведаеш усё на Радзе.

— На Радзе і на вечы я дам таб[illegible] бой! — пастрашыў Расціслаў. — І яшчэ н[illegible]адома, пойдуць нашы баяры, дружыны, [illegible]остыя смерды за табой ці не?! Калі будзе [illegible]т воля Данілы, мы будзем жыць у міры, дастатку, за яго плячыма. Калі мы "станем гаспадарамі ў сваёй хаце", адвернемся ад Данілы і злучымся так ці гэтак з Літвою, то сюды прыйдзе вайна, і мы зведаем вялікі Данілаў гнеў, дужую і бязлітасную ягоную руку!..

— Што ж, можа, і не абысціся без гэтага, — пахітаў галавой Усяслаў. — Але выбар мы, веру, зробім не такі, на які [illegible]ркаеш ты, а іншы — годны, пачэсны, хоць і нялёгкі... Каб мы смела і сумленна пазіралі ў вочы сваім дзецям і ўнукам, не чулі ад іх праклёну, пагарды і абразы...

— Разумны ты, ды не вельмі! — заўшчуваў і нават ужо нібы даверліва, шчыра Расціслаў. — Пакланіся Данілу — усё будзеш мець: уладу, сілу, багацце, будучыню! Не схіліш гордай галавы, запрагнеш марнага і недарэчнага, чаго не варты нашы смерды, — усё страціш! Апынешся ў порубе альбо і без галавы!

— Дзякуй, — хітнуў галавой Усяслаў. — Хоць раз, ды пабыў ты шчыры. А за шчырасць можна паважаць нават і непрыяцеля.

— Ты мяне не паважаў і паважаць ніколі не будзеш, — адвёў вочы Расціслаў. — Я часамі нават здзіўляюся, чаму ты столькі церпіш мяне, не звядзеш са свету. Можа, толькі таму, што асцерагаешся Данілы.

— Не толькі.

— Дык яшчэ чаму?

— Каб бачыць усе хады адкрытага галіцка-валынскага віжа, які за-за псовай службы гатоў прадаць і маці родную.

— І табе дзякуй за шчырасць, — схіліў галаву Расціслаў. — Але ведай: цяпер гэты віж-здраднік можа памагчы табе. Канечне, за паслугу: цяпер я павінен быць першым тут пасля Данілавага сына. Ды ты не крыўляйся, не пахмыляйся, болей падумай не толькі пра нябеснае, але і пра зямное. Пра маладую жонку і малое дзіця. Клопат пра сям'ю — не малая турбота. Дзеля яе, бывае, трэба ісці і на тое, на што душа і не згаджаецца...

— Асабліва, калі ў цябе такая жонка, як Раксана!

— Не заракайся! І тваё цялятка ранапозна будзе з рагамі!

— Кепская тая дамова, дзе вала бадзе карова!

— А не бывае, каб цябе што-небудзь ды не баданула. А цяпер ты і сам можаш сябе бадануць...

"Што ж, — нявесела падумаў Усяслаў, — бадай, нікчэмец кажа горкую праўду..."

Ліст тыдня

ШТО НА ШАЛЯХ АХВЯРНАСЦІ?

Кожны чалавек на зямлі ў пэўнай ступені ахвяра. Ахвяра і ўласнай недасканаласці, і прыроднай непрадказальнасці, і дзяржаўнай палітыкі, і жыццёвых абставін сярод грамадскіх, сямейных жарсцей, і шматлікіх грахоў. Істота, якая найбольш за ўсё свабодная перад Богам (менавіта такі адказ на пытанне "Чаму Усемагутны Бог не можа зрабіць так, каб усе былі і сумленнымі, і добрымі?") — ахвяра перш-наперш гэтай свабоды, крыніцы стваральнага лёсу. На жаль, не кожны яшчэ ўсведамляе, што лёс чалавека не што іншае, як вынік паводзін і чалавека самога, і яго продкаў, ці то цалкам праведных, ці то шмат насваволіўшых. Міна-расплата за грахі чалавечыя заўсёды знаходзіцца побач: то раптоўна спрацоўвае, то замаруджана, часам праз дзесяцігоддзі балюча джгане не толькі самога грэшніка, але і ягоных нашчадкаў, аж да калена чацвёртага. Так засведчана ў Біблії (Выхад, 20,5). Ёсць над чым задумацца кожнаму, хто зычыць дабра сваім аднакроўным, і дзецям, і ўнукам, і праўнукам. Не без падставы, мабыць, можна лічыць, што рэвалюцыя, Гітлер, Чарнобыль і іншае ліха ў нашым жыцці — з'явы невыпадковыя. Аднаму толькі Богу вядома, за якія грахі мы пакутуем, але ж і самім грэшнікам часам не лішне ўзважыць прычыны падзення свайго перад Богам, каб хутчэй выйсці з сутоння шматаспектнага богаадступніцтва, у якім не апошняе месца займаюць і парушэнні пастоў, і язычніцтва з прымхамі. Чаго толькі не ўтварае дзікунскі разбэшчаны розум дзеля шкурнай карысці? Па цікавым меркаванні А. Вейніка (газ. "Культура", 1993, 15 сак., 21 чэрв.), многа ліха прыдбала сабе Беларусь праз трывалае да гэтага часу язычніцтва. Шмат прыкладаў кожны можа заўважыць і на бытавым узроўні.

Вялебны Серафім Саровскі ў свой час (не такі ўжо і аддалены) прадказваў, што на Русь ідзе ліхалецце, бо народ парушае пасты ў сераду і пятніцу. Па змесце падобных звычак і беларускі народ апынуўся, як альпіністы ў адзінай звязцы над безданню, разам з атэістычнай Расіяй. Наш час ускладняе праблему: цяпер не толькі кожную сераду і пятніцу, а наогул, усе чатыры пасты вытрымліваюць вельмі нямногія. Ужо і перадсвяточныя дні, што для продкаў былі ахвярнымі, чыстымі, ва ўстрыманні, цяпер — зачэпка для п'янства, службовых гульбішчаў. Не кожны адмовіцца ўдзельнічаць, нават калі ў душы ўжо нешта і кранулася, бо — як успрымуць, што скажуць калегі? Вышэй Бога ім грамадскі прэстыж, мітуслівая бессэнсоўнасць, зрушэнне паняцяў, нават у смерці. Здавалася б, што можа быць больш даступна для ўспрымання, чым натуральны жыццёвы працэс? Бог дае нам жыццё, як за дзецьмі цярпліва ўвесь час назірае, накіроўвае ды навучае, то карай, то ўзнагародай, ён яго і забірае, вылучаючы душы альбо для сябе, альбо, як не прыдатныя рэчы, кідаючы ў вогнішча. Здавалася б, так проста пранікнуцца страхам перад Тварцом за гвалтаванне жыцця, зразумець непазбежнасць гібення ў пекле, немінучасць расплаты лёсам нашчадкаў. Аб неўспрыманні і народам асуджанай Богам ненатуральнасці смерці сведчыць той факт, што з даўніх часоў самагубцаў не дазвалялі хаваць разам з прыстойна памерлымі на хрысціянскіх могілках. Ды і былі то адзінкі. Не тое, што зараз: у цьмяным тунелі няўцямнасці моцных усё больш паднімаецца кволасць, бездапаможнасць, вынішчаецца, гіне без святла крыжа Хрыстова. У кнізе, адзначанай Нобелеўскай прэміяй, "Хрысціна, дачка Лаўрэнса", Унсет Сігрыд прыводзіць цікавы прыклад выратавання ахвяры сатанінскай спакусы самазабойства: перахрысціўшыся, яна быццам здымае заслону з вачэй — вада, што чароўна прыцягвала зіхаценнем і цёплаю прыгажосцю, падалася адразу халоднай, змрочнай, няўтульнай. Шмат зрушэнняў паняццяў адбываецца і падчас памінак. Памінанне памерлых — векавая традыцыя. Толькі што цяпер яна адлюстроўвае? Клопат пра душу нябожчыка, замову на вечную памяць аб ім? Гэта больш выключэнне, чым правіла. Правіла ў наш час — баль для жывых, балазе што без танцаў. Льюцца рэкі гарэлкі. Для гэтае мэты збіраюцца грошы не толькі з суседзяў, калег, дзе-нідзе рассылаюць ганцоў ужо і на суседнія вуліцы, бянтэжачы бедных, чуллівых людзей. Праблема сапраўдная для існых вернікаў — памінкі ў пост. Усе сардэчныя хрысціянскія довады, што нельга рушыць адвечныя правілы, што не трэба гарэлкі, скаромніны, бязбожнікам не рэзон перад рабскай грахоўнай залежнасцю ад грамады. "Скажуць людзі, што паскупіліся, сорамна перад людзьмі". Сцягам лунае грэх асуджэння. Бог, малітва, царкоўны устаў, дапамога душы — штосьці пабочнае, быццам наогул іх не існуе. "Дзе двое ці трое сабраліся ў імя маё, там і я сярод іх", — гаварыў Збаўца (Мцв., 18, 20). Дзе Збаўца, там верагодней збаўленне. "Прасіце і атрымаеце, шукайце і знойдзеце, стукайце і адчыняць Вам" (Лукі, 11, 9). "І ўсё, чаго ні папросіце ў малітве і з вераю, атрымаеце" (Мцв, 21, 22). Толькі што можа прасіць азмрочаны атэізмам, заганнымі звычкамі розум, які ва ўладзе пыхлівасці і гонару, які не ў стане вызначыць ісціну, тым больш, калі мозг яшчэ зацярушаны грашоваю ліхаманкай? Ці многа ў нас тых, хто пакліча да сябе ў кватэру ці хоць на дзядзінцы пакорміць чым-небудзь галодных, заадно папрасіўшы іх памаліцца за адышоўшыя душы? "Ці ж я ўсім надаюся, там столькі нахабнікаў, п'яніц, мне сваіх дзяцей глядзець трэба, такі цяжкі час цяпер", — запярэчыла мне аднойчы заможная сваячка, у якой заўчасна памерла маці. У чымсьці яна мае рацыю, з ёю нельга не пагадзіцца, як і з тымі сцвярджэннямі, што жабруюць часам бабулі, якія і маліцца не прызвычаены, для сваіх марнатраўных нашчадкаў. Але ж не будзем судзіць, апярэджваць сан Ісуса Хрыста. Дай Божа людзям сумленным праведныя прыбыткі, каб было і самім усяго ўдосталь і на ахвяраванні не паскупіліся: па Словах Госпада Ісуса Хрыста ў Нагорнай пропаведзі, "Кожнаму, хто просіць у цябе — дай" (Мцв, 5, 42).

Жабрацтва — спадарожнік гістарычна трывалы. У кожнай краіне ёсць жабракі. У нашай жа, пры дзяржаўных маштабах яго развіцця, жабрацтва стала нацыянальнай трагедыяй. Нацыянальная трагедыя... Словаспалучэнне, выкарыстанне якога ўсё болей шырыцца. Трагедыя нацыі — неўтаймаванае п'янства, учэпісты наступ наркотыкаў, дэградацыя асобы. Трагедыя нацыі — прыгнечаная родная мова, што ўшанавана законам, але, як куранятка ў бесклапотных гаспадароў, у прыкарэлай шкарлупцы да млосці заціснута. І (які жах для ўсяго жывога такое пытанне) ці выжыве? Трагедыя нацыі — зняважаны герб, што створаны мудра разумнымі продкамі. Герб перасцярога чужынцам: "Ціхмяныя мы, але якія мужныя абаронцы Айчыны!" Быццам і ў адрас нашчадкаў гнеўна даносіцца голас далёкіх продкаў: "Што ж вы ўздумалі бэсціць? Без шанавання гісторыі, адраджэння духоўнага не чакайце спрыяння ў справах". Трагедыя нацыі — разбураныя святыні, пагарда да інтэлігенцыі, маласвядомасць простага люду... Усе палітычныя звадкі, банкруцтвы, прыкрая падлаватасць асобных палітыкаў, эканамічныя разбалансоўкі адступаюць перад самай жудаснай нацыянальнай трагедыяй — чарнобыльскімі хваробамі дзяцей. Няма патрэбы паўтараць жорсткасць статыстыкі, што час ад часу мільгае трывожнымі святлафорамі на скіроўванне сродкаў.

У царкве святой Марыі Магдалены ў Мінску прыемна ўражвае ахвяравальная скрыначка на лячэнне хворых дзяцей. Думаецца, што чым больш вакол нас будзе такіх вось скрыначак, чым актыўней будзем мы іх напаўняць, тым хутчэй ачуняе душой наша нацыя, асабліва калі ўзносамі стануць яшчэ і хаўрусныя сродкі на панадны паўсюдны пралой. Каб на любай Радзіме, распраўляючы крыльцы, радаснымі птушняткамі шчабяталі здаровыя дзеці. Каб не гублялі надзеі на спачуванне людское тыя, каго не пачулі ("Звязда", 1993, 22 кастр. І той жа здымак з дзецьмі і просьбай-плакатам аб дапамозе ў газеце "Царкоўнае слова", N 7, 1994). Каб яшчэ доўга выстуквала сваё захапленне прыродай сэрца песняра роднага краю Яраслава Сільвестравіча Пархуты ("ЛіМ", 1995, 3 сакавіка), каб намаганнямі незнаёмых людзей саграваліся сэрцы адзінокіх і састарэлых... — хай гэта "каб" знойдзе свой адмысловы працяг у кожным асобным сэрцы.

У 1881 г. Л. М. Талстой пісаў пра чалавека, пад уплывам якога менавіта з гэтага 1881 г. ён адмовіўся ад ганарараў. "Яму 60. Ён жабрак. Усё аддае, заўсёды вясёлы і лагодны". Чалавекам гэтым быў бібліятэкар Румянцаўскага музея (будучай Ленінкі). М. Ф. Фёдараў (1828—1903), надзвычай набожны прагрэсіўны мысліцель са своеасаблівай філасофскай канцэпцыяй, аўтар шэрагу перадавых бібліяграфічных ідэй, які лічыў, што плён чалавечай думкі — набытак грамадства. "У продажы разумовай працы ёсць нешта прыкрае. Калі прадаецца мудрасць, то яна, мабыць, не мудрасць", — пісаў, развіваючы думку Фёдарава, Л. М. Талстой. Безумоўна, граф, якога абцяжарвала ўласнае багацце, мог так разважаць. У наш час падобная жыццёвая формула прагучыць для некаторых не толькі наіўна, але і смешна, ці наогул псіхічна не адпаведнай. І ўсё ж — "блажэнныя літасцівыя..." Будзем жа літасцівымі. Да сваёй гісторыі, мовы — падмуркаў нацыянальнага росквіту, да нашчадкаў.

Сястра ЛАРЫСА

(Ганарар за артыкул прашу пералічыць на адпаведны рахунак на лячэнне хворых чарнобыльскіх дзяцей)

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	*(1932-35)*
І.Гурскі	*(1935-41)*
А.Куляшоў	*(1945-46)*
М.Горцаў	*(1947-49)*
П.Кавалёў	*(1949-50)*
В.Вітка	*(1951-57)*
М.Ткачоў	*(1957-59)*
Я.Шарахоўскі	*(1959-61)*
Н.Пашкевіч	*(1961-69)*
Л.Прокша	*(1969-72)*
Х.Жычка	*(1972-76)*
А.Асіпенка	*(1976-80)*
А.Жук	*(1980-86)*
А.Вярцінскі	*(1986-90)*

Галоўны рэдактар
Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Міхась ЗАМСКІ
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ
Жана ЛАШКЕВІЧ
Алесь МАРЦІНОВІЧ
Барыс ПЯТРОВІЧ, *першы намеснік галоўнага рэдактара*
Юрась СВІРКА
Віктар ШНІП, *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі -- *332-461*
намеснікі галоўнага рэдактара -- *332-525, 331-985*
аддзелы:
публіцыстыкі -- *332-525*
пісьмаў і грамадскай думкі -- *331-985*
літаратурнага жыцця -- *332-462*
крытыкі і бібліяграфіі -- *332-204*
паэзіі і прозы -- *332-204*
музыкі -- *332-153*
тэатра, кіно і тэлебачання -- *332-153*
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў -- *332-462*
навін -- *332-462*
мастацкага афармлення -- *332-204*
фотакарэспандэнт -- *332-462*
бухгалтэрыя -- *268-640*

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра «ЛіМа»
Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма «Дайнова»

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня "Беларускі Дом друку". (г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 77)
Індэкс 63856. Наклад 10979
Нумар падпісаны 11. 5.1995 г.
ЗАКАЗ 1429
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Марцін КОЎЗКІ

ДОЛЯ ПРАЎДЫ

Кепска забудоўвалі сталіцу, шэрыя зацверджаны праекты. Ну а хто рашаў, на чым спыніцца, дзе ён той нябачны архітэктар? Безгустоўшчыне праклаўшы след, знік з зямлі Цэнтральны Камітэт. Што цяпер мастацтвазнаўцаў звягі, вось яны — "Экспо" і "саркафагі".

●

— Што чытаеце з класікаў? — спыталі народнага. — Мушу грэх узяць на душу: ведаю многіх, а не чытаю ніводнага, нават сябе не чытаю — пішу!

●

Наваліліся бядоты на сяло, а не трацяць веры людзі, бо ніколі не было, каб нічога не было, а як нешта ёсць, дык і неяк будзе — не ў цуды ж вераць людзі.

●

Мазаляногія сабраліся ў дарогу.

— Не варта адрываць чэрава ад зямлі, — буркатнулі бруханогія.

— Добра пашнарыўшы, можна пракарміцца і тут, — прарыпелі вусаногія.

— Асабліва калі закапаешся ў зямлю, — прабубнелі лапатаногія.

— Ці плюхнешся ў ваду, — булькатнулі ластаногія.

— Можна проста садзіцца і ўзлятаць, садзіцца і ўзлятаць, — пралепяталі крыланогія.

— Хай едуць, — сказалі галаваногія, — ім трэба новыя мазалі на іншай зямлі, каб потым тужыць аб пакінутай.

●

Як звяліся кентаўры? Спачатку аб'ядналіся, тады размежаваліся, і выявілася, што нават з двух кентаўраў нельга скласці аднаго каня ці аднаго чалавека.

●

У нашай вёсцы клуб закрыўся, кіно не будзе, хоць крычы. У чым прычына — кіншчык спіўся? Ды каб — спіліся гледачы.

●

Многа змен прынёс з сабою рынак, іншую цяпер шануюць чыннасць, баязлівасць — гэта ці не мудрасць, а сумленнасць — рыцарскі ўчынак.

●

Сабака брэша, а няма таго смаку, з якім на сабаку брэша сабака. Толькі на цені далёкіх продкаў сабака брэша ва ўсю сваю глотку. Зрэшты, гэта доля сабачая — гаўкаць на спадчыну.

●

Целаахоўнікі, ахоўнікі цела, тыя, што крумкачамі выглядаюць з-за начальніцкіх рамёнаў, і тыя, што пільным вокам абшарваюць мікрараёны, і тыя, што расстаўлены па перыметру жылых раёнаў, падазрона прыглядаюцца да пасажыраў на вакзалах і ў аэрапортах, уладарным жэстам спыняюць аўтамашыны, абязлюджваюць вуліцы і плошчы... Якое ж яно вялікае, начальніцкае цела! І ці ганарыцца нам, што па колькасці ахоўнікаў на адзінку начальства родная дзяржава — з першых?

●

Адолеў гравітацыі цяжар, узнёсся і лунаў, знясілены. І тут ужо ці не з-пад самых хмар нехта капнуў на патыліцу.